WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУССКАЯ ГАЗЕТА

1 КАСТРЫЧНІКА 2009 г.
ЧАЦВЕР
№ 185
(26543)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Аляксандр Лукашэнка і Франка Фраціні абмеркавалі пытанні эканамічнага і палітычнага супрацоўніцтва Беларусі і Італіі

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і міністр замежных спраў Італіі Франка Фраціні 30 верасня абмеркавалі актуальныя пытанні беларуска-італьянскіх адносінаў.

Як пацвердзіў на перагаворах кіраўнік італьянскага знешнепалітычнага ведамства, прэм'ер-міністр Італіі Сільвіо Берлусконі ў хуткім часе наведае Беларусь.

«Мы павінны быць гатовы да візіту і максімальна зняць тыя праблемныя пытанні, якія, магчыма, у нас існуюць», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў італьянскаму госцю за тое, што ён прыехаў у Беларусь. «Мне вельмі важна, каб вы на свае вочы ўбачылі нашу краіну, паразмаўлялі з нашымі людзьмі, з прадстаўніком Італіі ў Беларусі і зрабілі для сябе адпаведныя вывады, — сказаў Прэзідэнт. — Я вельмі добра помню нашу сустрэчу ў Італіі. Мы доўга тады размаўлялі і абмеркавалі многія пытанні. Я зразумеў, што ў італьянскага кіраўніцтва і ў вас асабіста ёсць пэўны інтарэс да нашай краіны».

«Тады мы вызначылі шэраг пытанняў у сферы эканомікі і палітыкі, якія могуць выклікаць узаемную цікавасць, — дадаў кіраўнік дзяржавы. — Мінуў час, і добра, што вы тут, мы зможам пракантраляваць тыя пытанні, па якіх дамаўляліся».

Кіраўнік італьянскага знешнепалітычнага ведамства падкрэсліў, што ў Італіі высока ацанілі візіт Прэзідэнта Беларусі ў Рым.

«Сапраўды, мы вызначылі пытанні, якія выклікаюць узаемную цікавасць і збліжаюць Італію і Беларусь», — сказаў міністр. Ён прапанаваў у час сённяшняй сустрэчы спыніцца на пытаннях эканамічнай і палітычнай тэматыкі, работа па якіх будзе весціся ў найбліжэйшым будучым.

Франка Фраціні запэўніў, што Італія ў еўрапейскіх структурах і ў далейшым будзе «носьбітам тэзіса аб неабходнасці збліжэння і пабудовы атмасферы даверу ў адносінах з Беларуссю».

Міністр сказаў, што ў апошнія гады паміж сотнямі і тысячамі сем'яў беларусаў і італьянцаў склаліся «вельмі дружалюбныя кантакты», якія маюць для італьянцаў вялікае значэнне.

Міністр замежных спраў Італіі выказаўся за актывізацыю культурных сувязяў з Беларуссю.

Размова на сустрэчы ішла таксама аб гуманітарным супрацоўніцтве. На працягу больш як 20 гадоў пасля аварыі на ЧАЭС Італія з'яўляецца асноўным партнёрам Беларусі ў сферы аздараўлення беларускіх дзяцей за мяжой. У 1991—2009 гадах па запрашэнні італьянскіх няўрадавых арганізацый у Італіі прайшлі аздараўленне 383,2 тыс. беларускіх дзяцей, у тым ліку за 9 месяцаў гэтага года — 13 тыс. дзяцей.

Асаблівая ўвага была нададзена гандлёва-эканамічнаму супрацоўніцтву дзвюх краін. У 2008 годзе Італія замацавалася ў дзясятцы асноўных гандлёвых партнёраў Беларусі, заняўшы восьмае месца сярод краін па-за СНД па аб'ёме тавараабароту і дзясятае — па аб'ёме экспарту.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Беларусь будзе надзейным і абавязковым партнёрам усіх міжнародных арганізацый

Сумесная граніца Беларусі з краінамі Еўрасаюза павінна садзейнічаць наладжванню добрых адносінаў паміж народамі і дзяржавамі, а не раздзяляць іх. Упэўненасць у гэтым выказаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 30 верасня на сустрэчы з кіраўнікамі дэлегацый — удзельніц Міжнароднай пагранічнай канферэнцыі.

У гэтым годзе Беларусь прымала ўдзельнікаў шэрагу важных міжнародных мерапрыемстваў, прысвечаных пытанням дзейнасці пагранічных службаў, у тым ліку пасяджэнне рабочай групы кіраўнікоў пагранічных ведамстваў Міжнароднай пагранічнай канферэнцыі, якое праходзіла ў Мінску з 29 па 30 верасня. Удзел у гэтым форуме прынялі таксама і прадстаўнікі шэрагу міжнародных арганізацый, што працуюць у Беларусі.

Як падкрэсліў Прэзідэнт, правядзенне ў Мінску такой прадстаўнічай канферэнцыі і прысутнасць аўтарытэтных міжнародных арганізацый сведчыць аб актыўнай ролі Беларусі ва ўмацаванні сусветнай і агульнаеўрапейскай бяспекі.

З моманту атрымання незалежнасці Беларусь сутыкнулася з незаконнай міграцыяй і іншымі спадарожнымі ёй крымінальнымі праявамі. Практыка паказала, што ступень негатыўных наступстваў гэтых з'яў для Беларусі значна ніжэйшая, чым для краін Еўрасаюза, паколькі не Беларусь з'яўляецца канчатковым пунктам памкненняў тых, хто едзе праз Беларусь у ЕС, сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён прывёў прыклад, што, пачынаючы з сярэдзіны 90-х гадоў мінулага стагоддзя да гэтага часу, беларускія пагранічнікі затрымалі на дзяржграніцы больш як 20 тыс. незаконных мігрантаў. «Мы назіраем моцны ўсплёск незаконнай міграцыі на Захад. Толькі ў гэтым годзе праваахоўныя органы Беларусі выявілі каля 8 тыс. патэнцыяльных мігрантаў», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Як адзначыў Прэзідэнт, стала добрай традыцыяй правядзенне сумесных спецыяльных пагранічных аперацый і мерапрыемстваў з калегамі з Расіі, Украіны, Літвы і Латвіі. Толькі ў гэтым годзе сумеснымі намаганнямі было выяўлена чатыры каналы незаконнай міграцыі. «Вядома, такія спецыяльныя мерапрыемствы трэба заахвочваць, і мы гатовы ў іх удзельнічаць. Хачу падкрэсліць, гэта будзе ўкладанне Беларусі ў бяспеку ўсяго еўрапейскага кантынента», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт выказаў удзячнасць за тое, што апошнім часам краіны Еўрапейскага саюза станоўча ацэньваюць работу Беларусі па спыненні незаконнай міграцыі. У найбліжэйшы час пагранічнае ведамства Беларусі павінна заключыць пагадненне з агенцтвам Еўрапейскага саюза па ахове знешніх граніц «Франтэкс». «Для нас гэта пагадненне мае асаблівую значнасць, паколькі Беларусь знаходзіцца ў геаграфічным цэнтры Еўропы, а працягласць граніц нашай краіны з Еўрасаюзам складае больш як 1200 км», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Пачынаючы з 1996 года на беларускай граніцы ў рамках праектаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі асвоена амаль $30 млн. Тым самым Беларусь актыўна займаецца асучасненнем сваёй пагранічнай службы для таго, каб засцерагчы аб небяспекі ўвесь еўрапейскі кантынент. Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, Беларусь будзе ўдзяляць самую пільную ўвагу развіццю тэхнічнага складальніка аховы дзяржграніцы і гатова ўдзельнічаць у сумесных праектах па тэхнічным аснашчэнні. Штогод з дзяржаўнага бюджэту на розныя мерапрыемствы па забеспячэнні бяспекі граніц Беларусь траціць больш за $100 млн.

«Скажу шчыра: мы віталі б не толькі вашу падтрымку, але і дапамогу ў гэтым плане. Хачу, каб вы ведалі, што кожны цэнт, долар або еўра, якія выдзяляюцца Беларусі для таго, каб мы ўтрымлівалі ў нармальным стане ўсходні рубеж ЕС, — ідуць на справу, і ні адзін цэнт мы не трацім на нямэтавым прызначэнні», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнт выказаў упэўненасць, што сумесная граніца павінна ў першую чаргу не раздзяляць народы, а садзейнічаць наладжванню добрых адносінаў паміж імі.

Удзельнікі сустрэчы высока ацанілі намаганні Беларусі па процідзеянні незаконнай міграцыі, гандлю людзьмі, распаўсюджванні наркотыкаў і іншых крымінальных праявах. Старшыня Міжнародай пагранічнай канферэнцыі, кіраўнік пагранічнага ведамства Венгерскай Рэспублікі Іштван Шаму падкрэсліў, што самай важнай мэтай канферэнцыі з'яўляецца стварэнне даверу паміж пагран-службамі. Ён таксама дадаў, што беларуская пагранічная служба хутка заслужыла давер іншых дзяржаў.

СТАР. 2

*Жыццё манастырскае праходзіць у малітвах і працы. Працы ў Пустынскім Свята-Успенскім праваслаўным манастыры і сезоннай, і аднаўленчай вельмі шмат. Бо манастыр толькі адраджаецца, паўстае з руін. Некалькі насельнікаў манастыра моляцца за наш з вамі дабрабыт, за веру, за хутчэйшае вяртанне святыні ранейшага аблічча. Штодзень па кроплі, па цаглінцы, па кроку і метры яны аднаўляюць Пустынкі, нібы тыя пчолы, што збіраюць у соты свой нектар. Па бласлаўленні выканаўцы абавязкаў ігумена іераманаха Іларыёна карэспандэнту «Звязды» было дазволена наведаць самы крайні пункт на Мсціслаўскай зямлі, намолены, авеяны легендамі і славай, і нават пабыць на манастырскім пчальніку. Манах-пчалавод Цярэнцій мае на фотаздымкі бласлаўленне епіскапа Магілёўскага і Мсціслаўскага Сафронія. У гэтыя дні іерадыякан **Цярэнцій** (на фота) шмат часу праводзіў якраз на падрыхтоўцы пчаліных сем'яў да зімовага перыяду, вызначаў, па яго словах, моц пчол і запас мёду. Сёлета ў Пустынках быў нядрэнны медазбор.*

СТАР. 6

ДА ВЕДАМА ДЭПУТАТАЎ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Трэцяя сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання пачне работу 2 кастрычніка 2009 года ў 10 гадзін у зале пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў (Дом урада, Авальная зала).

Рэгістрацыя дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў будзе праводзіцца 2 кастрычніка 2009 года з 9.00 да 9.50 у фае залы пасяджэнняў.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

«ЗМІНУСАВАЛІ» Ў ГАНДЛІ З КРАІНАМІ СНД

Паводле апошніх звестак Нацыянальнага статыстычнага камітэта, за студзень—жнівень гэтага года сальда знешняга гандлю таварамі склалася адмоўным у памеры 4,707 мільярда долараў ЗША.

Наогул, сёлета за восем месяцаў аб'ём знешняга гандлю краіны таварамі склаў 30 мільярдаў 785,2 мільёна долараў ЗША, ці 60,8 працэнта да адпаведнага леташняга перыяду. Экспарт тавараў скараціўся на 44,5 працэнта да 13 мільярдаў 039,1 мільёна долараў ЗША, імпарт знізіўся на 34,7 працэнта і склаў 17 мільярдаў 746,1 мільёна долараў. Разам з тым, у гандлі з краінамі па-за СНД у Беларусі склалася станоўчае сальда — 964 мільёны долараў ЗША. А вось з краінамі Садружнасці мы маем гандаль са знакам мінус: адмоўнае сальда рэспублікі па выніках васьмі месяцаў склала 5 мільярдаў 671 мільён долараў ЗША.

Ігар ГРЫШЫН.

У АВАРЫІ ЗАГІНУЛІ ВАДЗІЦЕЛЬ «БМВ» І 11-ГАДОВЫ ПАСАЖЫР

Страшнае сутыкненне адбылося 27 верасня каля 6 гадзін раніцы на аўтадарозе «Магілёў—Чавусы» паблізу вёскі Гародня Магілёўскага раёна.

«Таёта-Селіка» выехала на сустрэчную паласу і ў лоб сутыкнулася з «БМВ». Аўтамабілі распляскаліся ў блін. У выніку 29-гадовы магіляўчанін, які кіраваў «БМВ», загінуў на месцы. Яго пасажыры, 29, 19 і 11 гадоў, са складанымі траўмамі былі дастаўлены ў бальніцу. Аднак хлопчык, нягледзячы на высілкі медыкаў, праз дзве гадзіны памёр. Ён даводзіўся вадзіцелю пасынкам: паводле некаторых звестак, кампанія ехала нядзельнай раніцай на рыбалку. Быў шпіталізаваны і вадзіцель «Таёты», 26-гадовы магіляўчанін. Гіпатэтычны вінаўнік дарожна-транспартнага здарэння пацярпеў меней за іншых.

Алена КАЗЛОВА.

Фотаздымкі ДАІ УУС Магілёўскага аблвыканкама.

КУРЭННЕ Ў ЛОЖКУ ЗАБІВАЕ. ЛІТАРАЛЬНА ТАК

29 верасня ўвечары ў вёсцы Сіманавічы Глускага раёна згарэла нежылая хата. У агні загінулі 37-гадовыя мужчына і жанчына. Суседзі паведамілі, што ўдзень пару бачылі ў хаце: яны распівалі спіртныя напоі. Прычына пажару — неасцярожнасць пры курэнні.

Паводле інфармацыі Магілёўскага абласнога ўпраўлення МНС, за апошні тыдзень 5 чалавек сталі ахвярамі п'янай звычкі курыць у ложку. Гэта не проста шкодная звычка, яна — смяротна шкодная.

Алена КАЗЛОВА.

СНАРАДЫ ЗНАЙШЛІ ГРЫБНІКІ

29 верасня непадалёк ад вёскі Шапялевічы Круглянскага раёна ў лесе знойдзены 77 артылерыйскіх снарадаў часоў Вялікай Айчыннай вайны. Пра небяспечную знаходку паведамілі ў МНС грыбнікі: у той жа дзень снарады знішчылі.

Алена КАЗЛОВА.

Актуальнае інтэрв'ю

РАСКЛАД ДЛЯ ЗАКАНАДАЎЦАЎ

Аб планах Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі чацвёртага склікання на восеньскую сесію, якая адкрыецца 2 кастрычніка, у інтэрв'ю «Звяздзе» расказаў Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА

— Уладзімір Паўлавіч, прыкладная праграма сесіі звярстана. Колькі ў ёй законапраектаў?

— У праекце сесійнага парадку дня 31 пытанне. Усяго ж у профільных камісіях знаходзіцца больш за 60 законапраектаў. Па меры гатоўнасці яны таксама будуць прапанаваны для абмеркавання ў найбліжэйшыя месяцы альбо на чарговай сесіі.

— Якія пытанні маюць намер рэгламентаваць дэпутаты?

— Іх палітра дастаткова разнастайная, а ў цэлым адлюстроўвае наспелыя патрэбнасці розных сегментаў грамадства і дзяржавы: эканомікі, сацыяльнай сферы, нацыянальнай бяспекі, дзяржаўнага будаўніцтва, экалогіі і прыродакарыстання, адукацыйнай і моладзевай палітыкі, навукі, аховы здароўя, міжнародных спраў.

— Прыярытэты вызначаны?

— Нашы заканатворчыя прыярытэты вызначаны маштабам задач, якія стаяць перад краінай. На іх акцэнтаваў увагу парламентарыяў кіраўнік дзяржавы А.Р. Лукашэнка ў штогадовым Пасланні беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу. Дэпутатам давядзецца прыняць рашэнні, якія павінны пасадзейнічаць павышэнню эфектыўнасці эканамічнай дзейнасці, заахвочванню дзелавой самастойнасці, умацаванню сацыяльнай стабільнасці і развіццю дзяржавы. Тэмай № 1 сесіі стане праект Закона аб рэспубліканскім бюджэце на 2010 год. Ён яшчэ не ўнесены ў Палату прадстаўнікоў, праходзіць узгадненне. Група дэпутатаў удзельнічала ў распрацоўцы яго параметраў, а таксама ў абмеркаванні галоўнага фінансавага дакумента на пасяджэннях Савета Міністраў.

Фота БЕЛТА.

— Як вы мяркуеце, ці забяспечыць бюджэтны механізм нармальную жыццядзейнасць Беларусі ў новым годзе?

— Інакш і быць не можа. На гэты конт кіраўнік дзяржавы выказаўся зусім цвёрда, як і пра неабходнасць захавання сацыяльнай часткі бюджэту ў памеры 60 працэнтаў ўсіх расходаў. Парламентарыі падтрымліваюць такі падыход. Як бы ні было складана ў цяперашніх фінансава-эканамічных умовах, стварыць нармальны бюджэтны тонус для эканомікі і сацыяльнай сферы мы абавязаныя. Думаю, што на восеньскай сесіі будзе ў выніку прыняты збалансаваны, рэальны і сацыяльна накіраваны рэспубліканскі бюджэт.

СТАР. 2

ВАКАНСІЯ Ў «ЧАСОВЫМ» ФАРМАЦЕ

Твае правы

Агульнае скарачэнне колькасці вакансій прынесла адзін даволі нечаканы вынік — рост папулярнасці «часовых» варыянтаў працаўладкавання. Па сутнасці аднолькавая цікавасць да іх назіраецца як з боку работнікаў, так і наймальнікаў, аднак таксама не сакрэт: тут ёсць свае асаблівасці. У прыватнасці, на які тэрмін можна ўладкавацца часова, якія гарантыі маюць у такім выпадку работнікі і калі адбываецца іх звальненне? Аб гэтым — наша гутарка з загадчыкам юрыдычнай кансультацыі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Уладзімірам Іванавічам ШАЛКОВІЧАМ.

«Плюс» для работніка, «плюс» для наймальніка

Увогуле трэба адзначыць: часовымі прызнаюцца работнікі, якія прымаюцца максімум на 2 месяцы. Або, калі гаворка ідзе аб неабходнасці замены «асноўнага» супрацоўніка арганізацыі, што адсутнічае пэўны тэрмін, — максімум на 4 месяцы. Пры гэтым якіх-небудзь мінімальных рамак тут проста не існуе. Інакш кажучы, уладкаванне можа адбыцца нават усяго на некалькі дзён.

— Увогуле, наймальнік, якому патрэбныя людзі для выканання якіх-небудзь непрацяглых работ, напрыклад, па будаўніцтве пэўнага аб'екта, ліквідацыі наступстваў аварыі ці ўборкі ўраджаю можа пайсці шляхам заключэння грамадзянска-прававога дагавору, — адзначае Уладзімір Шалковіч. — Але ўсё ж лепш, калі ў такім выпадку перавага аддаецца дагавору працоўнаму. Прычым фактычна выйграюць тут абодва бакі. Так, пры заключэнні працоўнага дагавора работнік будзе падпарадкоўвацца правілам унутранага працоўнага распарадку, а гэта — відавочны «плюс» для наймальніка. А ў сваю чаргу працоўны дагавор для работніка — гэта дадатковыя гарантыі, скажам, магчымасць карыстацца ўсімі «бонусамі» таго ж калектыўнага дагавора.

Дагавор. Але не кантракт

Працоўны дагавор з работнікам «на пэўны тэрмін» заключаецца пісьмова, прычым у дагаворы абавязкова робіцца запіс аб часовым характары ўладкавання. Аднак тут трэба мець на ўвазе: падобны дагавор не з'яўляецца кантрактам.

— Адпаведна, у адрозненне ад кантрактніка, такому работніку не абавязкова даваць дадатковыя дні водпуску і павышаць тарыфную стаўку або аклад, — кажа Уладзімір Шалковіч. — Пры гэтым тут існуе яшчэ адзін нюанс — пры заключэнні дагавора часоваму работніку нельга вызначыць выпрабавальны тэрмін.

«Бальнічны» мусіць аплаціць

Часовы работнік няхай сабе і на невялікі перыяд, але становіцца паўнапраўным членам працоўнага калектыву. Адпаведна, тут не можа быць ніякіх адрозненняў ва ўмовах аплаты працы. Да таго ж часовы работнік у выпадку неабходнасці можа скарыстацца «бальнічным».

— Магчыма, не ўсе ведаюць, але і выканаўцы работ па грамадзянска-прававым дагаворы, і часовыя работнікі падлягаюць дзяржаўнаму сацыяльнаму страхаванню — гэта дае права і на лісткі па часовай непрацаздольнасці, і на залік пенсійнага стажу, — падкрэслівае Уладзімір Шалковіч. — Да слова, калі часовае месца становіцца ў работніка першым, то наймальнік абавязаны паставіць яго на ўлік у рэгіянальных органах Фонда сацыяльнай абароны насельніцтва, выдаць страхавое пасведчанне, і, зразумела, завесці працоўную кніжку.

СТАР. 2

БЕЛАРУСБАНК

ОАО «Акционерный сберегательный банк «Беларусбанк»

сообщает о проведении 9 октября 2009 года 72-го тиража выигрышей по выигрышным вкладам в белорусских рублях в филиале № 503 ОАО «АСБ Беларусбанк» по адресу: г. Минск, ул. Ангарская, 40 (актовый зал). Начало тиража в 11.00.

Телефон для справок: 8 801 100 54 54 (бесплатный номер).

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

БПС-БАНК

С 1 октября 2009 г. в ОАО «БПС-Банк» устанавливается следующий размер процентов по депозитам физических лиц в иностранной валюте (доллары США, евро, российские рубли):

По вновь заключаемым договорам срочного банковского депозита **«Оптимальный»:**

Срок привлечения	Размер процентов (годовых)	
	Доллары США, евро	Российские рубли
6 месяцев	8	13

По вновь заключаемым и переоформляемым договорам срочного банковского депозита **«Динамичный»:**

Срок привлечения	Размер процентов (годовых)	
	Доллары США, евро	Российские рубли
1 год	8,25	12
3 года	8,5	13

По вновь заключаемым и автоматически продлеваемым договорам карт-счета **«Универсальный»:**

Срок привлечения	Размер процентов (годовых), доллары США, евро
1 год	8,25

ОАО «БПС-Банк» предоставляет клиентам Банка возможность пополнения и получения средств с вкладных, текущих счетов в любом подразделении Банка на территории Республики Беларусь.

В соответствии с Декретом Президента Республики Беларусь № 22 от 04.11.2008, государство гарантирует полную сохранность денежных средств физических лиц в белорусских рублях и иностранной валюте, размещенных на счетах и (или) во вклады (депозиты) и возмещение 100 процентов суммы этих средств в валюте счета либо вклада (депозита).

Дополнительную информацию можно получить в любом учреждении ОАО «БПС-Банк», на веб-сайте **(www.bpsb.by)** или по телефону – **148** (бесплатно в стационарной сети).

Проценты, выплаченные по вкладам в иностранной валюте в течение 2008 г. (млрд. руб.): январь – 2,5; февраль – 2,5; март – 2,9; апрель – 2,9; май – 2,5; июнь – 3,1; июль – 3,2; август – 3,0; сентябрь – 3,4; октябрь – 3,1; ноябрь – 2,3; декабрь – 4,1.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 13.11.2008 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673. ОАО «БПС-Банк».

Сёння — Дзень пажылых людзей

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыхар вёскі Боркі Пружанскага раёна 73 гадовы Сяргей Мікалаевіч ПРАКОПЧЫК у акне свайго дома.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 1.10.2009 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 761,00
1 еўра	4 032,72
1 латвійскі лат	5 700,42
1 літоўскі літ	1 167,99
1 чэшская крона	159,95
1 польскі злоты	952,68
1 расійскі рубель	92,01
1 украінская грыўня	336,50

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	30,0087
UAH	36,0898
1000 BYR	10,8531
EUR	43,8877

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Беларусь будзе надзейным і абавязковым партнёрам...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«У савецкія часы пагранічная служба не зведвала недахопу ў грошах, аднак не хапала даверу. Мы глядзелі адзін на аднаго нават не як на супернікаў, а як на ворагаў, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Цяпер часы змяніліся. У кожнай дзяржавы ёсць уласныя інтарэсы, якія забяспечваюць на апошнім метры зямлі пагранічнікі. Але граніца для нас сёння не жалезная заслона, не нейкая Берлінская сцяна. Мы стараемся яе зрабіць такой, каб яе перасячэнне не прыносіла лішніх праблем людзям. Яна павінна аб'ядноўваць нас, а не раз'ядноўваць. І тут вельмі важны давер». Кіраўнік дзяржавы таксама пацвердзіў, што з боку Беларусі заўсёды будуць даверлівыя і паважлівыя адносіны да партнёраў. «Мы поўнасцю адкрыты для ЕС. Мы не праводзім палітыкі ізаляцыянізму, мы адкрыты ўсяму свету», — сказаў ён.

Як адзначыў начальнік аддзела сумесных аперацый пагранічнага агенцтва Еўрапейскага Саюза «Франтэкс» Рустамас Любаевас, супрацоўніцтва з беларускімі пагранічнікамі заўсёды грунтавалася на ўзаемным даверы, было адкрытым і канструктыўным. Кіраўнік прадстаўніцтва Еўрапейскай камісіі ў Рэспубліцы Беларусь Жан-Эрык Хольцапфель адзначыў, што паміж Еўрасаюзам і Беларуссю дасягнуты значны прагрэс у плане арганізацыі кантролю граніцы, мадэрнізацыі пунктаў пропуску, сумеснай работы з ПРААН. Як падкрэсліў Жан-Эрык Хольцапфель, Еўрапейская камісія гатова ўзмацніць сваё супрацоўніцтва з Беларуссю.

Прэзідэнт падкрэсліў, што Беларусь будзе надзейным і абавязковым партнёрам усіх міжнародных арганізацый і зробіць усё, каб унесці дастойны ўклад у барацьбу з крыміналам.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

РАСКЛАД ДЛЯ ЗАКАНАДАЎЦАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Што вы выдзеліце ў пакеце законапраектаў эканамічнага дыяпазону?

— Я адзначыў бы праект Асаблівай часткі Падатковага кодэкса, змяненні і дапаўненні ў Грамадзянскі кодэкс, якія аптымізуюць шэраг пытанняў стварэння і дзейнасці ўнітарных прадпрыемстваў з улікам напрацаванага ў краіне практычнага вопыту, адаптацыю Закона «Аб гаспадарчых таварыствах» да рэальных умоў іх работы і папраўкі ў заканадаўства аб архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці. Яны ўдасканальваюць сістэму кіравання і працэдур у будаўніцтве, што дазволіць больш дакладна акрэсліць паўнамоцтвы ўдзельнікаў будаўнічай сферы, паменшыць кошт будаўніцтва, у тым ліку пры бюджэтным фінансаванні.

Нядаўна ў Палату прадстаўнікоў з Савета Міністраў паступіў дапрацаваны з улікам новых эканамічных рэалій законапраект «Аб падтрымцы малога і сярэдняга прадпрымальніцтва». Калі па ім у дэпутатаў не ўзнікне сур'ёзных пытанняў, то з яго разглядам на сесіі затрымкі не будзе.

Адзначу таксама спрашчэнне працэдуры афармлення дакументаў на зямельныя ўчасткі, што зафіксавана папраўкамі ў Кодэкс аб зямлі, і пазбаўленне суб'ектаў гаспадарання ад залішняй бюракратызацыі. Гэта не проста працэдурная навацыя, таму што мае немалаважнае значэнне для эфектыўнага гаспадарання, стымулявання дзелавой актыўнасці, а значыць, і для нарошчвання патэнцыялу нашай эканомікі.

— Мяркуючы па тым, што на вясновай сесіі дэпутаты прынялі ў першым чытанні змяненні і дапаўненні ў некаторыя законы аб адміністрацыйных працэдурах, за ліквідацыю неабгрунтаваных бюракратычных перашкод у заканадаўстве парламент узяўся даволі ўпарта.

— У гэтую сесію названы дакумент ідзе на другое чытанне. Яго прыняцце дазволіць удасканаліць каля 30 дзейных нарматыўных актаў у частцы іх перагрузкі адміністрацыйнымі абмежаваннямі і зняцця састарэлых прадпісанняў.

— Літаральна напярэдадні сесіі Палата прадстаўнікоў правяла выязны семінар, прысвечаны практыцы прымянення заканадаўства па пытаннях аховы і рацыянальнага выкарыстання жывёльнага і раслiннага свету. Гэта звязана з падрыхтоўкай да разгляду праекта новага Закона «Аб дзяржаўнай экалагічнай экспертызе»?

— Не толькі яго. Семінар планавы і па сваёй тэматыцы закранаў правапрымяняльную практыку па шырокім коле пытанняў прыродакарыстання і забеспячэння экалагічнай бяспекі Беларусі. Дэпутаты абмеркавалі са спецыялістамі шляхі ўдасканалення прыродаахоўнага заканадаўства, існуючыя ў ім прабелы, абмяняліся з практыкамі сваімі думкамі па надзённых экалагічных праблемах. Выказаныя на семінары цікавыя, канструктыўныя ідэі ўвасобяцца ў новых нарматыўных прававых актах прыродаахоўнай сферы, якія распрацоўваюцца з удзелам нашай профільнай дэпутацкай камісіі. А ў перспектыве — і ў Экалагічным кодэксе. Яго неабходнасць наспела.

— Тым больш што добры прыклад кадыфікацыі галіновых законаў ёсць. Маю на ўвазе праект Кодэкса аб адукацыі. Ён будзе разглядацца на сесіі?

— Яшчэ да абмеркавання Палатай прадстаўнікоў ён выклікаў значны рэзананс як у педагагічным асяроддзі, так і ў грамадстве. Гэта зразумела. Праз сістэму адукацыі праходзяць усе. Мы мяркуем, што нам удасца прыняць усебакова адшліфаваны дакумент, які стане своеасаблівай Адукацыйнай Канстытуцыяй. Такіх кодэксаў у заканадаўстве іншых краін няма, чым мы можам, пагадзіцеся, ганарыцца.

— Атрымаў шырокі водгук і законапраект «Аб асновах дзяржаўнай моладзевай палітыкі». Ён ужо быў адобраны дэпутатамі ў першым чытанні. Які яго далейшы лёс?

— Законапраект сапраўды вельмі важны. У нашай краіне дастаткова хуткімі тэмпамі развіваецца грамадскі моладзевы рух, дзейнічае шэраг моладзевых арганізацый. Таму да заканадаўчага рэгулявання дзяржаўнай моладзевай палітыкі праяўляецца вялікая цікавасць. Дэпутаты пераканаліся ў гэтым на семінары, праведзеным сёлета па моладзевай праблематыцы ў Магілёўскай вобласці, а таксама падчас сустрэч з моладдзю, у тым ліку ў Палаце прадстаўнікоў. Мы лічым, што, закладваючы ў заканадаўства прававыя гарантыі для моладзі, неабходна таксама стымуляваць актыўны ўдзел маладых людзей у жыцці грамадства, бо гэта фактычна інвестыцыі ў будучыню нашай краіны. У міжсесійны перыяд законапраект істотна дапрацоўваўся. Унесены шэраг паправак і дапаўненняў. Цяпер яго чакае абмеркаванне ў другім чытанні.

— Хоць міжнародная дзейнасць дэпутатаў знаходзіцца, так сказаць, за дужкамі сесійнага парадку дня, хацелася б, Уладзімір Паўлавіч, закрануць і гэты вектар парламенцкай работы. Як вы ацэньваеце перспектыву кантактаў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь з Парламенцкай асамблеяй Савета Еўропы?

— Актывізацыя дыялогу паміж нашай дзяржавай і Еўрасаюзам, вынікам чаго стала ўключэнне Беларусі ў праграму «Усходняе партнёрства», адкрывае магчымасці і для парламенцкага складніка нашых адносінаў. Тое, наколькі мы зможам выкарыстаць гэтыя магчымасці на ўзаемную карысць, залежыць не толькі ад беларускага парламента, а ад абодвух бакоў. Гэты год, калі многія аўтарытэтныя еўрапейскія палітыкі пачалі рэальна, без шор, глядзець на факты, паказаў, што ключавы фактар канструктыўнага, раўнапраўнага ўзаемадзеяння — наяўнасць добрай волі і пазітыўных установак. Мы для такога ўзаемадзеяння застаёмся адкрытымі. Статус Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь у ПАСЕ, як спецыяльна запрошанага, павінен быць адноўлены. Гэта тая аснова, на якой мы будзем рухацца наперад, нарошчваючы патэнцыял узаемаразумення і партнёрства.

— Ці змяшчаюцца акцэнты ў міжпарламенцкіх сувязях па лініі СНД, ЕўрАзЭС, АДКБ і Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі?

— Хіба ёсць падстава для якіх-небудзь апасенняў? Статус-кво нашага міжпарламенцкага супрацоўніцтва на постсавецкай прасторы не з'яўляецца нечым часовым. Наадварот, міжпарламенцкае ўзаемадзеянне ў рамках Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, Парламенцкіх структур ЕўрАзЭС, СНД і АДКБ — гэта наш стратэгічны рэсурс. Мы будзем ісці шляхам каардынацыі і далейшага нарошчвання нашых агульных намаганняў, асабліва на эканамічным трэку, фарміруючы адпаведную дагаворна-прававую базу. Так, на восеньскай сесіі Палаты прадстаўнікоў мяркуем ратыфікаваць 13 нарматыўных дакументаў, неабходных для стварэння адзінай тэрыторыі мытнага саюза Беларусі, Казахстана і Расіі.

Я перакананы, што патэнцыял міжпарламенцкага супрацоўніцтва дазваляе нам дыверсіфікаваць яго па розных напрамках інтэграцыі. Гэта прынясе ўсім інтэграцыйным партнёрам, у тым ліку і нашай дзяржаве, рэальную карысць.

Аляксандр ЛУНЁЎ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ІЗРАІЛЬ НАНЁС АВІЯЎДАР ПА СЕКТАРЫ ГАЗА

У ноч на сераду ўзброеныя сілы Ізраіля нанеслі авіяўдар па тунэлях кантрабандыстаў на поўдні сектара Газа. Па меркаваннях вайскоўцаў, гэтыя падземныя збудаванні выкарыстоўваліся для дастаўкі паўстанцам зброі і боепрыпасаў.

У выніку абстрэлу загінулі двое мясцовых жыхароў, яшчэ 12 чалавек былі параненыя. Ізраільскія вайскоўцы лічаць, што сетка з сотняў падземных хадоў звязвае блакіраваны анклаў з Егіптам. Незадоўга да гэтага бамбардзіроўшыкі ВПС атакавалі пустэчу на поўначы сектара, дзе, па меркаваннях спецыялістаў, палесцінскія баевікі разгарнулі ўстаноўку для запуску рэактыўных снарадаў. Акрамя таго, у сераду ўзброеныя сілы Ізраіля абстралялі тэрыторыю, якія размясціліся ў паўночнай частцы сектара Газа, недалёка ад паселішча Бейт-Лахія. Абодва авіяўдары сталі адказам Ізраіля на атакі іх уласнай зямлі з боку палесцінцаў. Так, напярэдадні палесцінскія баевікі абстралялі сумежную ізраільскую тэрыторыю трыма рэактыўнымі снарадамі.

АРХЕОЛАГІ ЗНАЙШЛІ ЛЕГЕНДАРНУЮ ЗАЛУ, ЯКАЯ КРУЦІЦЦА

У Рыме знойдзена зала, якая круцілася і ў якой ладзіў балі сумна вядомы імператар Нерон, лічаць археолагі. Залу знайшлі падчас раскопак сярод руін Залатога палаца на ўзгорку Палацін.

Асаблівасць пабудовы ў тым, што ў яе аснову пакладзеная спецыяльная платформа, якая круцілася. На гэты момант ужо раскрытыя зборы з рухомымі панэлямі са слановай косці, пры дапамозе якіх прысутных на банкетах абсыпалі кветкамі, а таксама падмурак і паваротныя механізмы. Імператар Нерон, вядомы сваёй жорсткасцю і любоўю да раскошы, правіў Рымскай імперыяй з 54 па 68 г. н.э. Праз 60 гадоў пасля яго смерці рымскі гісторык Святоній у сваёй працы «Жыццё дванаццаці цэзараў» апісаў палацавую залу, якая круцілася і ў якой праходзілі балі. «У абедзенных палатах столь была адналькавая, з паваротнымі плітамі, каб рассыпаць кветкі, з адтулінамі, каб рассейваць водары; галоўная палата была круглая і днём і ноччу бесупынна круцілася ўслед небасхілу», — пісаў Святоній.

Ліга чэмпіёнаў

«Севілья», «Арсенал» і «Ліон» без страт

Адбыліся восем матчаў другога тура групавога раўнда Лігі чэмпіёнаў у квартэтах E, F, G, H. Першымі ў Казані адстраляліся «Рубін» і міланскі «Інтэр». Трапіўшы па адным разе ў вароты адзін аднаго, клубы яшчэ больш закруцілі інтрыгу ў сваёй групе. На першае месца там выйшла «Барселона», якая прадказальна выйграла ў кіеўскага «Дынама» 2:0. Па чатыры мячы ў вароты сваіх супернікаў забілі «Севілья» і «Ліон». Пры гэтым іспанцы аднойчы прапусцілі. Таксама без страт ідзе лонданскі «Арсенал». «Кананіры» толькі ў канцы паядынку намаганнямі ван Персі і Аршавіна перамаглі грэчаскі «Алімпіякас» (2:0). А вось другі англійскі клуб, «Ліверпуль», чакала няўдача. Падапечныя Бенітэса «суха» прадулі ў гасцях «Фіярэнціне», двойчы прапусціўшы пасля ўдараў Ёвеціча (0:2). Нямецкі «Штутгарт» мірам разышоўся з дэбютантам Лігі чэмпіёнаў румынскай камандай «Уніра» (1:1), гэтак жа згулялі галандскі АЗ з бельгійскім «Стандартам».

ВАКАНСІЯ Ў «ЧАСОВЫМ» ФАРМАЦЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Звычайна — кампенсацыя

Асобная тэма — водпуск. Права на яго ў часовага работніка ёсць. Аднак з прычыны непрацяглага тэрміну занятасці аплатны адпачынак тут звычайна не даецца. Замест гэтага выкарыстоўваецца практыка выплат кампенсацый за нявыкарыстаны водпуск — прапарцыянальна адпрацаванаму часу.

Пры гэтым, зазначае Уладзімір Шалковіч, у выпадку якіх-небудзь непрадбачаных сітуацый часовы работнік можа звярнуцца з просьбай аб водпуску па сямейна-бытавых абставінах. Але тут давядзецца дамаўляцца з наймальнікам.

За выхадныя «адгулаў» няма

Адметны момант. Заканадаўства вызначае, што часовыя работнікі, якія заключылі працоўны дагавор на тэрмін, большы за 6 дзён, могуць быць прыцягнутыя да выканання сваіх абавязкаў у дзяржаўныя святы, святочныя і выхадныя дні. Прычым у такім разе згода непасрэдна работніка не патрабуецца.

Да таго ж выхады ў дзяржаўныя святы, святочныя і выхадныя прызначэннем іншых дзён адпачынку часовым работнікам не кампенсуюцца, а аплата за такія выхады робіцца ў аднаразовым памеры.

Заява. І звальненне праз 3 дні

Паколькі з часовым работнікам не заключаецца кантракт, ніякай «адпрацоўкі» тут быць не можа. Пры жаданні такі работнік можа звольніцца практычна ў любы час. Для гэтага дастаткова толькі загадзя, за 3 дні, напісаць адпаведную заяву.

— Заканадаўства вызначае некалькі падстаў, калі часовага работніка могуць звольніць па ініцыятыве наймальніка, — працягвае Уладзімір Шалковіч. — Па-першае, датэрміновае скасаванне працоўнага дагавора можа адбыцца за прагул, распіццё алкагольных напояў, крадзеж і іншыя «вінаватыя» дзеянні. Па-другое, падстава для развітання — невыкананне без уважлівых прычын працоўных абавязкаў ці правілаў унутранага працоўнага распарадку. Трэцяя падстава — знаходжанне на «бальнічным» больш чым два тыдні запар. Аднак апошняе не датычыцца выпадкаў вытворчага траўматызму і прафесійных захворванняў — у такім разе часовы работнік захоўвае сваё месца да аднаўлення працаздольнасці або да вызначэння інваліднасці, але не больш чым да заканчэння тэрміну дзеяння працоўнага дагавора.

Нарэшце, чацвёртая верагодная прычына датэрміновага развітання — прыпыненне работ у наймальніка на тэрмін, большы за тыдзень, з прычыны вытворчага характару або ў сувязі са скарачэннем аб'ёмаў. Праўда, у апошнім выпадку часовы работнік павінен атрымаць выхадную дапамогу ў памеры свайго тыднёвага заробку.

— Яшчэ адна нагода для атрымання часовым работнікам выхаднай дапамогі — прызыў на вайсковую службу, — заўважае Уладзімір Шалковіч. — Прычым у такім разе выхадная дапамога вызначаецца ў памеры сярэдніх заробкаў за 2 тыдні.

Калі няпэўны тэрмін?

Між тым, цікавая асаблівасць. Калі часовы работнік адпрацаваў звыш вызначанага тэрміну, і ні адзін з бакоў не запатрабаваў спынення працоўных адносінаў, то лічыцца, што працоўны дагавор працягваецца на няпэўны перыяд. І гэтаксама часовы работнік набывае статус пастаяннага, калі ён звальняецца, але менш чым праз тыдзень уладкоўваецца да таго ж наймальніка, і калі сам тэрмін занятасці да і пасля перапынку ў суме перавышае два (або ў выпадку замены работніка асноўнага — чатыры) месяцы. Прычым варта падкрэсліць: у гэтым выпадку гаворка не ідзе аб абавязковым «паўторным» ўладкаванні на адно і тое ж месца.

Сяргей ГРЫБ.

Абзац

◢ Мінская вобласць павялічыць экспарт мяса-малочнай прадукцыі ў Харкаўскую вобласць, паведаміў старшыня Мінаблвыканкама Леанід Крупец па выніках візіту афіцыйных і дзелавых колаў Міншчыны ў гэты ўкраінскі рэгіён. Абмяркоўваліся і іншыя кірункі супрацоўніцтва — у сельскай гаспадарцы, энергетыцы, машынабудаванні, адукацыі.

◢ 2009 год — юбілейны для Кітая. 60 гадоў таму, 1 кастрычніка 1949 года, была створана Кітайская Народная Рэспубліка, а ўжо на наступны дзень Савецкі Саюз прызнаў яе. СССР аказаў вялікую дапамогу маладой рэспубліцы ў станаўленні народнай гаспадаркі.

◢ Адзін з першых касманаўтаў, двойчы Герой Савецкага Саюза, лётчык-касманаўт СССР Павел Паповіч памёр у Крыме на 79-ым годзе жыцця, перадаюць інфармагенцтвы.

◢ У Мінску ў студзені—жніўні г.г. у сярэднім на аднаго жыхара прыпала Br5 млн бюджэтных даходаў (у краіне — крыху больш за Br2 млн), паведаміў БЕЛТА начальнік інспекцыі па падатках і зборах па Мінску Віктар Дашкевіч.

◢ У Правілах палявання паляўнічай гаспадаркі і палявання мэтазгодна перагледзець увядзенне абмежаванняў на вясновае паляванне птушак на асобных тэрыторыях Беларусі. У першую чаргу гэта датычыцца прыродных тэрыторый пад асаблівай аховай. Такое меркаванне выказаў міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі Уладзімір Цалко ўчора на семінары, які праводзіць Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу краіны. Забарона вясновага палявання на птушак — надзённая праблема, якая мае шырокі грамадскі рэзананс. Дыскусіі па ёй вядуцца ўжо амаль 20 гадоў. За гэты час у рэспубліцы значна знізілася колькасць вадаплаўнай птушкі, адзначыў міністр.

◢ Учора на новабудоўлі ў Мінску ўпаў вежавы кран, паведамілі БЕЛТА ў МНС Беларусі. НЗ адбылося на будаўніцтве адміністрацыйнага будынка на вуліцы Маякоўскага. Краначышчыца шпіталізаваная з ЧМТ і мноствам ранаў. Згодна з папярэдняй версіяй, кран упаў з-за разбурэння рэйкі, па якой ён рухаўся.

◢ Аўтамабіль збіў лася на праспекце Машэрава ў Мінску. Гэта адбылося каля 6 гадзін раніцы 29 верасня ў 300 м ад стэлы «Мінск — горад-герой». Вадзіцель «Фальксвагена» спрабаваў пазбегнуць сутыкнення і рэзка затармазіў. Аднак гэта не дапамагло, машына збіла жывёліну. Лось ударыўся ў лабавое шкло, пераляцеў праз аўто, прайшоў некалькі метраў, аднак упаў мёртвы. Вадзіцель не пацярпеў, машына атрымала сур'ёзныя пашкоджанні.

◢ Лідскія памежнікі затрымалі п'янага вадзіцеля без права кіравання транспартам на кантрабандным аўтамабілі. Супрацоўнікі памежнай службы ПП «Суботнікі» спынілі аўтамабіль «Фальксваген», каб праверыць у вадзіцеля дакументы. Аднак 38-гадовы вадзіцель замест таго, каб іх падаць, дыхнуў перагарам. Як выявілася, у моцна п'янага вадзіцеля не было ні дакументаў на машыну, ні правоў. Аўтамабіль быў раней увезены на тэрыторыю Беларусі з парушэннем заканадаўства. Аўтамабіль затрыманы, праводзіцца расследаванне.

◢ Афганская дзяўчынка загінула пасля таго, як на яе ўпала каробка з інфармацыйнымі буклетамі, скінутымі з борта самалёта брытанскіх ВПС. Гэты інцыдэнт адбыўся 23 чэрвеня, аднак вядома пра яго стала толькі цяпер. Як выявілася, брытанскія самалёты раскідвалі інфармацыйныя буклеты ў аддаленай правінцыі. На жаль, адна каробка не змагла поўнасцю раскрыцца і ў падчас прызямлення прычыніла сур'ёзныя траўмы афганскаму дзіцяці. Дзяўчынка была дастаўленая ў мясцовую бальніцу ў Кандагары, дзе, нягледзячы на ўсе спробы выратаваць яе, памерла ад траўмаў. Каробкі з лістоўкамі, што раскідваюць брытанскія ваенныя, важаць ад 14 да 18 кг.

Поўны абзац

◢ З 1 кастрычніка ў Таджыкістане ўвойдуць у сілу правілы, якія датычацца адзення і знешняга выгляду настаўнікаў. Яны будуць дзейнічаць як у школах, так і ў ВНУ. Правілы, якія распрацавала Міністэрства адукацыі, абмяжуюць, у прыватнасці, магчымасць насіць бараду. Адпускаць яе могуць толькі выкладчыкі, старэйшыя за 50 гадоў, пры гэтым даўжыня барады не павінна перавышаць трох сантыметраў. Нельга насіць джынсы і міні-спадніцы, каляровыя футболкі, празрыстыя сукенкі і адзенне, якое шчыльна прылягае да цела.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Частное производственно-торговое унитарное предприятие «ПрисласльСтройТорг» ликвидируется. Требования кредиторов принимаются по адресу: Минская область, Смолевичский р-н, д. Драчково, ул. Гомельская, д. 17. УНП 690563905.
Ликвидатор — Кудряшова И.В., г. Минск, ул. Пермская, д. 52, кв. 5.

КАНСТРУКТЫЎНАЯ ІНІЦЫЯТЫВА ПАДТРЫМАНА

Істотна садзейнічаць у прыцягненні творчых ідэй і інавацыйных падыходаў грамадзянскай супольнасці пры фарміраванні і рэалізацыі найважнейшых кірункаў дзяржаўнай палітыкі закліканы Грамадска-кансультацыйны савет пры Адміністрацыі Прэзідэнта. Спектр праблем, што абмяркоўваюцца на яго пасяджэннях, дастаткова шырокі, пытанні, што выносяцца на разгляд, маюць важнае сацыяльна-эканамічнае значэнне.

На адным з пасяджэнняў па ініцыятыве дырэктара Цэнтра сістэмных бізнэс-тэхналогій SATIO Ж.В. Грынюк, якая ўваходзіць у склад савета, былі прапанаваны актуальныя падыходы па павышэнні ролі чалавечага фактару ва ўмовах сусветнага фінансавага крызісу. Ёю выказаны прапановы па ўзмацненні кіраўніцкага патэнцыялу і ўдасканаленні сістэмы маркетынгу на айчынных прадпрыемствах з выкарыстаннем у гэтых мэтах замежнай практыкі. Гэтыя прапановы былі ўсебакова разгледжаны ў Адміністрацыі Прэзідэнта сумесна з рэспубліканскімі і мясцовымі органамі дзяржаўнага кіравання, знайшлі ў іх разуменне і падтрымку.

Асаблівую ўвагу выклікала прапанова аб стварэнні ў рэспубліцы нацыянальнай сістэмы кваліфікацый з улікам досведу краін СНД і Еўрасаюза. У гэту сістэму павінны ўвайсці цесна ўзаемазвязаныя структурныя часткі: нацыянальная рамка кваліфікацый — структураванае па ўзроўнях апісанне прызнаных у краіне кваліфікацый. З яе дапамогай ажыццяўляецца вымярэнне і ўзаемасувязь вынікаў навучання чалавека ў працэсе ўсяго жыцця і вызначаюцца суадносіны яго ведаў і ўменняў з патрабаваннямі пэўнага ўзроўню кваліфікацыі па галінах прафесійнай дзейнасці; прафесійныя стандарты — нарматыўны дакумент, які вызначае ў рамках канкрэтнага віду прафесійнай дзейнасці патрабаванні, неабходныя для адпаведнасці пэўнай кваліфікацыі; адукацыйныя стандарты — спецыяльныя праграмы падрыхтоўкі, якія фарміруюць веды і ўменні, прадугледжаныя прафесійнымі стандартамі; сістэма сертыфікацыі якасці кваліфікацыі — сістэма ацэнкі і пацвярджэння кваліфікацый, засвоеных падчас атрымання сярэдняй, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі, перападрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі, навучання ў працэсе выканання работы.

Увогуле нацыянальная сістэма кваліфікацый можа дазволіць больш эфектыўна рэгуляваць баланс попыту і прапановы на рынку працы, павысіць якасць падрыхтоўкі неабходных кваліфікаваных спецыялістаў, эфектыўна выкарыстаць патэнцыял работнікаў, арганізаваць аўдыт адпаведнасці кадраў сучасным патрабаванням.

Для забеспячэння высокага ўзроўню прафесійнай кампетэнтнасці кіраўніцкіх кадраў і спецыялістаў у сферы маркетынгу прапануецца павялічыць агульную колькасць гадзін у вучэбных планах перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі для гэтых катэгорый работнікаў, а таксама павысіць эфектыўнасць праходжання стажыровак названымі работнікамі на айчынных і замежных прадпрыемствах пад непасрэдным кантролем профільных міністэрстваў.

У мэтах аб'ектыўнай ацэнкі эфектыўнасці дзейнасці маркетынгавых службаў прадпрыемстваў рэспубліканскай і камунальнай формаў уласнасці разглядаецца пытанне неабходнасці правядзення іх аўдыту.

Пры фарміраванні банкаў звестак на маладых і таленавітых кіраўнікоў і спецыялістаў «Перспектыва» рэспубліканскімі і мясцовымі органамі дзяржкіравання будзе прадугледжвацца штогадовае ўключэнне ў іх склад кіраўнікоў, якія праявілі сябе ў сферы менеджменту і маркетынгу, а таксама антыкрызісных кіраўнікоў.

У частцы павышэння патрабаванняў да ўзроўню прафесійнай кампетэнтнасці кіраўнікоў і спецыялістаў у галіне менеджменту і маркетынгу разглядаецца неабходнасць унясення адпаведных дапаўненняў і змяненняў у Тыпавое палажэнне аб атэстацыі кіраўнікоў і спецыялістаў прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый.

Кіраўніцтвам Адміністрацыі Прэзідэнта рэкамендавана Ураду сумесна з зацікаўленымі дзяржаўнымі органамі неадкладна зрабіць канкрэтныя захады па рэалізацыі прапанаваных Ж.В. Грынюк канструктыўных падыходаў.

«Мерседэс» для дырэктара

Супрацоўнікамі міліцыі затрыманы і змешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання былы дырэктар замежнага прадпрыемства «Гранд Імекс».

Як паведаміла карэспандэнту «Звязды» оперупаўнаважаны па асабліва важных справах Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі КМ МУС Вераніка Пасмеццева, падазраецца былы кіраўнік у крадзяжы 9 тысяч долараў ЗША і таварна-матэрыяльных каштоўнасцяў прадпрыемства амаль на 70 мільёнаў рублёў. Так, як мяркуецца, у кастрычніку 2007 года, атрымаўшы ад заснавальнікаў наяўнымі 9 тысяч долараў нібыта на набыццё для прадпрыемства аўтобуса, ён купіў аўтамабіль «Мерседэс», які не паставіў на баланс, а выкарыстоўваў у асабістых мэтах. А праз паўгода прадаў яго, паклаўшы грошы ва ўласную кішэню. Акрамя таго, па-за касай прадпрыемства апынуліся і амаль 70 мільёнаў рублёў пасля адной «здзелкі», якую правёў «камерсант». У прыватнасці, падазроны прадаў індывідуальным прадпрымальнікам паветранагравальнае абсталяванне, што знаходзілася на балансе прадпрыемства і афарміў афіцыйныя накладныя на яго адгрузку. У касу выручаныя грошы не былі ўнесеныя. У дачыненні да былога дырэктара заведзена крымінальная справа.

Ігар ГРЫШЫН.

СВК «Гараны» Полацкага раёна на працягу года прадаваў бычкоў прадпрымальніку-нябожчыку

Шматлікія парушэнні фінансавай дысцыпліны выяўленыя ў СВК «Гараны» і КСУП «Эксперыментальная база «Ветрынская» Полацкага раёна. Пра гэта паведаміла ўчора на калегіі КДК Віцебскай вобласці галоўны спецыяліст Полацкага міжраённага камітэта Таццяна Хітрова.

Толькі за 2008 год гэтыя два прадпрыемствы атрымалі Br4,1 млрд і Br1,1 млрд дзяржаўнай падтрымкі за закупку маладняку жывёлы. Больш як Br1 млрд бюджэтных сродкаў яны выкарысталі з парушэннем заканадаўства і каля Br60 млн атрымалі незаконна. Пры гэтым ні адно з прадпрыемстваў план па вырабе і рэалізацыі сельгаспрадукцыі не выканала, а прыбытковая дзейнасць была забяспечана толькі за кошт атрыманых з бюджэту датацый. Падчас праверкі фінансава-гаспадарчай дзейнасці гэтых суб'ектаў гаспадарання было выяўлена, што атрыманыя сродкі яны накіроўвалі на пагашэнне запазычанасці па выплаце зарплаты работнікам і іншыя мэты.

Акрамя таго, выявіліся шматлікія фінансавыя аферы кіраўнікоў і адказных работнікаў. Так, у СВК «Гараны» ўвайшло ў практыку скажэнне статыстычнай справаздачнасці, ажыццяўленне наяўных разлікаў з прыватнымі асобамі міма касы, складанне фальшывых дакументаў пры махінацыях па закупцы жывёлы ў насельніцтва, індывідуальных прадпрымальнікаў і прадпрыемстваў і па продажы яе ім. Напрыклад, у 2008 годзе прадпрыемства заключыла здзелкі па продажы жывёлы і мяса на Br70 млн з прадпрымальнікам-нябожчыкам, пад іменем якога хаваўся другі, зусім здаровы чалавек...

БЕЛТА.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ ОБЪЕКТА ДОЛЕВОГО СТРОИТЕЛЬСТВА

1-секционный 19-этажный 132-квартирный жилой дом серии М 111-90 по пр. Машерова. Совместное общество с ограниченной ответственностью «БЕЛИНТЕ-РОБА» информирует физических и юридических лиц о создании объекта долевого строительства

Информация о Застройщике

Застройщик (Заказчик) – СООО «БЕЛИНТЕ-РОБА»

Зарегистрировано решением № 653 Минского городского исполнительного комитета от 31 марта 2004 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190527399.

Адрес Застройщика: 220103, г. Минск, ул, Калиновского, 77а, ком. 320, телефон/факс 281 41 15, 281 21 98.

Режим работы: понедельник – пятница: с 8.30 до 17.30, обед: 13.30 –14.30, выходные дни: суббота, воскресенье.

СООО «БЕЛИНТЕ-РОБА» 31.03.2009 года был сдан в эксплуатацию объект «Многоквартирный жилой дом не повышенной комфортности по ул. Волгоградская, 64» (решение Минского городского исполнительного комитета от 02.04.2009 года № 667).

СООО «БЕЛИНТЕ-РОБА» имеет специальное разрешение (лицензия) № 02250/0463596 на право осуществления деятельности «Проектирование и строительство зданий и сооружений I и II уровней ответственности и проведению инженерных изысканий для этих целей», действительная до 03.03.2013 года, выданная Министерством архитектуры и строительства Республики Беларусь.

Информация о проекте

Цель строительства – выполнение инвестиционного проекта «Многоэтажный жилой дом по пр. Машерова» в соответствии с утвержденным Председателем Минского горисполкома протоколом от 22 мая 2007 года.

Строительство 1-секционного 19-этажного 132-квартирного жилого дома серии М 111-90 по пр. Машерова планируется осуществить в срок до 31 января 2011 года.

Информация об объекте долевого строительства:

Объект долевого строительства – Строительство 1-секционного 19-этажного 132-квартирного жилого дома серии М 111-90 по пр. Машерова. Начало строительства – октябрь 2009 года. Продолжительность строительства – 15 месяцев.

Площадь жилого здания – 9221,35 кв.м.

Общая площадь квартир (проектная) – 7700,16 кв.м.

Состав квартир на этажах принят:

2-1-2-1-2-1 (1 этаж), 2-1-2-1-2-1-3 (2…19 этажи).

Строительный проект разработан на основе проектных решений жилых крупнопанельных домов серии М 111-90.

Проектом предусмотрено применение строительных конструкций, материалов, огнезащитных составов и заполнений в противопожарных преградах, прошедших сертификацию на соответствие требованиям пожарной безопасности в испытательных подразделениях МЧС РБ или с известными пожарно-техническими показателями.

Внутренняя отделка здания – декоративная штукатурка (места общего пользования), покраска акриловой и масляной краской. Полы в квартире – конструкция пола без покрытия, ж/б панель. Наружная отделка здания – покраска фасадной краской. Окна – из ПВХ профиля, стеклопакет. Лоджия – ПВХ профиль, остекление. Двери квартир входные – деревянные щитовые. Сантехническое оборудование – унитаз, счетчики холодной и горячей воды, внутренняя разводка системы водопровода и канализации. Система отопления и вентиляции – приборы отопления, естественная вентиляция. Наличие в доме: технического этажа, помещения товарищества собственников, лифтов.

Объект долевого строительства расположен в Центральном районе в г. Минске по пр. Машерова на участке площадью 1,001 га.

Границы участка определены земельно-кадастровыми планами – приложениями к свидетельствам (удостоверениям) о государственной регистрации № 500/969-1518, № 500/969-1519 , выданных Государственным комитетом по имуществу Республики Беларусь, республиканским унитарным предприятием «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» от 25 сентября 2009 г.

В состав строительства проектируемого здания входят:

- 19-этажный жилой дом;

- открытые автопарковки для временного хранения транспортных средств населения суммарной емкостью 44 машино-места (в соответствии с п. 11.6.1 СНБ 3.01.04-02 – на 1-ю очередь строительства);

- площадка для хозяйственных целей, мусоросборник для крупногабаритного мусора, озелененные дворовые территории.

Согласно Указа Президента Республики Беларусь от 15.06.2006 г. № 396 «О долевом строительстве многоквартирных жилых домов», для привлечения физических и юридических лиц к строительству по договорам создания объекта долевого строительства предлагается 132 квартиры стоимостью:

- однокомнатные – общей площадью 45.5 стоимостью за 1 кв.м в белорусских рублях в сумме, эквивалентной 1600 долл. США по курсу Национального банка Республики Беларусь на день заключения договора долевого строительства, количество квартир – 57.

ТРЫУМФ І ТРАГЕДЫЯ ГАРАДЗЕНСКАГА СТАРАСТЫ

Чаму нас вучыць Антоній Тызенгаўз?

Кандыдат гістарычных навук, дацэнт Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Ірына Кітурка правяла анкетаванне сярод студэнтаў з мэтай высветліць, што яны ведаюць пра палітычнага дзеяча, рэфарматара эканомікі, мецэната навукі і культуры ў Вялікім Княстве Літоўскім, гарадзенскага старасту Антонія Тызенгаўза. Рэспандэнты вучыліся не на гістарычным факультэце і тым не менш вынікі гэтага апытання не проста ўражваюць — шакіруюць. Практычна ніхто дакладна не адказаў, калі дзейнічаў Тызенгаўз (замест сапраўднага перыяду называліся часы Полацкага княства, Расійскай імперыі...), у якіх галінах грамадскага жыцця ён працаваў...

Значыць, не ведаюць, чаму плошча ў абласным цэнтры носіць імя Тызенгаўза і што гэта за постаць у гісторыі горада над Нёманам. Няма ахвоты пацікавіцца? Ці вось так мы вучым наша падрастаючае пакаленне? Зрэшты, пытанне не толькі ў дачыненні да моладзі. Калі правесці такое ж анкетаванне сярод больш сталых гараджан, то ці будзе вынік іншым?

Такія пытанні, а не толькі новыя факты і версіі, засталіся пасля ўжо традыцыйных «Гарадзенскіх чытанняў», на гэты раз прысвечаных Антонію Тызенгаўзу і яго эпосе. Лёсавызначальнай асобе ў жыцці Гародні другой паловы XVIII стагоддзя, дзякуючы якому горад стаў

«Дамок майстра».

цэнтрам палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця. Чалавеку, якога адны называлі геніем, мяркуючы, што ён апярэдзіў свой час і зрабіў для людзей шмат добрага, а іншыя ненавідзелі і раілі не браць з яго прыклад.

Дык чаму ж нас вучыць Антоній Тызенгаўз? Што можна выкарыстаць у цяперашніх умовах і ад чаго варта засцерагчыся? Якія загадкі застаюцца для сённяшняга і наступных пакаленняў гісторыкаў і проста ўлюбёных у свой край людзей?

Адна сцяна цагельная, а іншыя... драўляныя

Адна з загадак прапануецца неабыякавому воку на вуліцы Ажэшкі (пры Антоніі Тызенгаўзе — Раскоша, па назве аднайменнай карчмы) у музеі гісторыі Гарадніцы. Ён размешчаны ў былым «дамку майстра» — адзіным уцалелым будынку з дваццаці так званых «басняцкіх» дамкоў, адной з сямі тызенгаўзаўскіх пабудоў (а было прыкладна 80), якім пашанцавала дажыць да нашага часу. І вось загадка: чаму фасадная сцяна, што з вуліцы, цагельная, а іншыя... з драўляных брусоў? Адкуль такая архітэктурная навацыя?

Версій на гэты конт некалькі, і адна з іх, якой прытрымліваецца краязнаўца, журналіст Вітольд Іваноўскі, наступная. Прадпрымальнаму Тызенгаўзу заўсёды не хапала грошай на ягоныя праекты і трэба было, кажучы па-сучаснаму, прыцягнуць сродкі замежных інвестараў. Але чым жа іх зацікавіць? Гарадзенскі староста вырашае ўздоўж вуліцы Раскоша ўзвесці цэлы рад фасадных сцэнаў з цэглы, а потым запрашае замежнікаў на «прэзентацыю». Пасля шчодрага на стравы і спіртное пачастунку гасцей усаджваюць у карэты і — на прагулку па Раскошы! Менавіта там, паведаміў граф Тызенгаўз, прадугледжана жыллё для замежных спецыялістаў. Але ж яны бачаць толькі... цагельныя сцены. Дзе жыць?

Гэта пытанне гасціннага гаспадара знянацку не застала. Староста патлумачыў, што ён... свядома не закончыў будаўніцтва дамоў, паколькі не ведаў, ці спадабаюцца яны будучым дзелавым партнёрам. І вось цяпер, калі пазнаёміліся, у іх ёсць магчымасць завяршыць будоўлю — кожнаму на свой густ. І, што было, пэўна, найбольш прынцыпова для Тызенгаўза ў гэтым праекце, за свой кошт.

Заезджыя спецыялісты, вядома, без асаблівага энтузіязму, але ўсё ж пагадзіліся. Аднак паколькі яны, мусіць, былі абмежаваныя ў фінансавых магчымасцях, то выбралі найбольш танны варыянт дабудовы жылля — з драўляных брусоў.

А яшчэ адзін будынак часоў Тызенгаўза можна ўбачыць непадалёк ад «цагельна-драўлянага» музея гісторыі Гарадніцы, адразу за галоўным корпусам дзяржуніверсітэта імя Янкі Купалы. Пры гарадзенскім старасце тут, у медыцынскай школе, а затым у акадэміі давалі клятву Гіпакрата папярэднікі цяперашніх студэнтаў Гродзенскага медуніверсітэта. Нягледзячы на наступныя змены, гэты, характэрны для стылю барока, будынак і сёння захоўвае свой твар, прыцягваючы ўвагу арыгінальнымі, розных формаў вокнамі, а таксама двума шасцігранным вежамі па абодва бакі фасада.

Літаральна побач — шэдэўр эпохі Тызенгаўза, батанічны сад пры медыцынскай акадэміі, які цяпер з'яўляецца гарадскім паркам імя французскага вучонага-натураліста, прафесара медыцыны Жана Эмануэля Жылібера. Менавіта ён стварыў першую на тэрыторыі сучаснай Беларусі вышэйшую медыцынскую навучальную ўстанову і заклаў вядомы на ўсю Еўропу батанічны сад. А заслуга гарадзенскага старасты ў тым, што пад свае праекты ён умеў прыцягваць таленавітых людзей, сапраўдных прафесіяналаў у сваёй працы. Скажам, Жылібер быў запрошаны з Ліёна, а адзін з галоўных праекціроўшчыкаў архітэктурнага аблічча горада над Нёманам Джузэпэ дэ Сака — з італьянскай Вероны. Па яго праектах праводзілася рэканструкцыя Новага замка, пабудаваныя каралеўскія рэзідэнцыі ў Станіслававе і Аўгустоўцы, палац Тызенгаўза на цяперашняй аднайменнай плошчы. А яшчэ — палацы ў Свяцку, Шчорсах, Паставах, Брэсце, Камянцы, Беніцы, каралеўскія мануфактуры, будынак тэатра на Гарадніцы...

Дарэчы, аднымі з першых «ластавак» жанру паркавай скульптуры сталі ў Гродне менавіта помнікі гэтым асобам. Прынамсі так спачатку меркавалася і нават артыкул у «Звяздзе» з гэтай нагоды называўся «Жылібер вяртаецца ў Гродна». Пра жаданне стварыць яго вобраз казаў аўтару гэтых радкоў скульптар Уладзімір Панцялееў, калі яшчэ працаваў у майстэрні над скульптурай. Аднак на этапе ўзгадненняў нешта ўпусцілі і цяпер гэта скульптура афіцыйна мае нейтральную назву «Гараджанін». А скульптура Аляксандра Анціпіна, таксама размешчаная ў гарадскім парку, непадалёк ад месца, дзе жыў галоўны архітэктар Вялікага Княства Літоўскага, хоць і атаясамліваецца са знакамітым італьянцам, але насамрэч называецца «Дойлідам Гарадніцы» — зборны вобраз архітэктараў, якія будавалі Гродна.

Будынак лямуса на Гарадніцы.

Атрымліваецца, што на сёння помнікаў, прысвечаных канкрэтна Жану Эмануэлю Жыліберу і Джузэпэ Дэ Сака, у горадзе няма. Не робіць нам гонару і тое, што дагэтуль не ўшанаваны помнікам і іх патрон Антоній Тызенгаўз. Мажліва, у недалёкай будучыні помнік яму ўсё ж з'явіцца на аднайменнай плошчы? Пакуль жа ёсць толькі помнік, усталяваны каля 1900 года ў Фарным касцёле. На прыступцы — жаночая постаць з дзюма пальмавымі галінамі, пасярэдзіне помніка — латунны медальён з рэльефным бюстам графа, а ніжэй надпіс: «Гр. Антоній Тызенгаўз (1733—1785), староста Гродзенскі, падскарбій ВКЛ. Выконваючы волю бацькі і брата, помнік гэты паставіла гр. Марыя Тызенгаўз з Пшаздзецкіх».

І эканоміка, і музыка

Антонія Тызенгаўза, карыстаючыся сучаснай тэрміналогіяй, можна назваць антыкрызісным менеджарам. І трэба аддаць належнае каралю Рэчы Паспалітай Станіславу Аўгусту Панятоўскаму, які, прызначаючы ў 1765 годзе графа Тызенгаўза на высокія пасады надворнага падскарбія і генеральнага адміністратара ВКЛ (у цяперашнім разуменні — міністра фінансаў і эканомікі) , а таксама гарадзенскага старасты, ставіўся да яго не толькі як да сябра дзяцінства, але і з улікам дзелавых якасцяў.

Карыстаючыся неабмежаваным даверам караля, Тызенгаўз разгарнуў проста грандыёзную дзейнасць па вывадзе каралеўскіх эканомій з крызісу. У рамках аднаго артыкула проста немагчыма расказаць аб усіх ягоных рэформах, таму падкрэслім у агульных рысах галоўнае. У аграрнай сферы — гэта аднаўленне фальваркаў (гаспадарак, што вырабляюць збожжа для продажу), новы перамер зямлі, каб падаткі і павіннасці збіраліся з рэальных плошчаў, а таксама адмова ад здачы каралеўскіх эканомій у арэнду і кіраванне імі сваёй адміністрацыяй.

Так, новыя падыходы не заўсёды станоўча адбіваліся на становішчы сялянства, пра што сведчаць шматлікія скаргі. Але, разам з тым, насельніцтва каралеўскіх эканомій пазбавілася ад злоўжыванняў арандатараў, сяляне атрымалі мінімальна абавязковы зямельны надзел з магчымасцю яго пашырэння. Пачалася меліяратыўная праца, пракладваліся дарогі, куплялі за мяжой племянную жывёлу...

Што ж датычыцца прамысловасці, дык староста ў Гродне і яго ваколіцах пачаў будаваць шматлікія мануфактуры — суконную, камлотную, палатняную, шаўковых тканін, панчошную, капялюшную, карункавую, шкляную, ювелірную, скураных і медных вырабаў, васковых свечак, картаў для гульні... У майстэрні пад кіраўніцтвам спецыяліста з Парыжа выраблялося шыкоўныя карэты, адну з якіх набыў кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. А ткач Селіман арганічна спалучыў усходнія і заходнія матывы — форму слуцкага пояса і французскі арнамент на ім.

Менавіта з Антоніем Тызенгаўзам звязаны і пераўтварэнні ў Паставах. Пры ім там з'явіліся першыя каменныя дамы, у палацы працавалі аркестр і балетная школа, а ў створаных графам мануфактурах выраблялі гербавую паперу, дываны, карабельныя парусы, модныя капелюшы, паясы і нават дыліжансы.

Пры гэтым, заключаючы кантракты з замежнымі майстрамі, Тызенгаўз ставіў перад імі абавязковую ўмову падрыхтаваць сабе змену з мясцовага насельніцтва. Згодна з патрэбнасцямі эканомікі ў Гродне адчыніліся школы па падрыхтоўцы будаўнікоў, бухгалтараў, каморнікаў.

Мануфактуры забяспечвалі таварам каралеўскі двор у Варшаве, многія магнацкія і шляхецкія сядзібы. Існавала нават «Кніга ўзораў», па якіх рабіліся замовы. Праўда, вырабы, як цяпер кажуць, айчыннай вытворчасці далёка не заўсёды карысталіся попытам сярод мясцовай шляхты. Па якасці яны былі не горшыя, а можа, нават і лепшыя за прывазныя, аднак з-за малапрадукцыйнай працы і вялікіх расходаў на пакупку сыравіны за мяжой каштавалі даражэй і таму не знаходзілі збыту, назапашваліся на складах. У выніку, не вытрымаўшы канкурэнцыі з замежнымі вытворцамі, многія каралеўскія мануфактуры, асабліва пасля адхілення Тызенгаўза ад кіравання імі, прыйшлі ў заняпад і пачалі зачыняцца.

Трагедыя гарадзенскага старасты, напэўна, была і ў тым, што ён не здолеў стварыць эфектыўную адміністрацыю. Некаторыя з тых, каго Тызенгаўз лічыў сваімі паплечнікамі і каму вельмі давяраў, насамрэч былі заклапочаныя не рэфармаваннем гаспадаркі, а

Будынак тэатра лялек.

папаўненнем грашыма сваіх кішэняў. Апалчыліся і пачалі інтрыгі супраць Тызенгаўза і тыя, каго ён у свой час звольніў альбо чые інтарэсы закрануў, праводзячы рэформы. Тыповая для ўсіх часоў сітуацыя.

Апошнія гады жыцця пасля адхілення ад каралеўскіх пасадаў граф Тызенгаўз правёў у Варшаве, а калі памёр, то яго цела было перавезена на Гродзеншчыну, у Жалудок. Там, у крыпце мясцовага касцёла, і спачывае гэты неардынарны чалавек і дзяржаўны дзеяч.

А даследчыкі і сёння дапаўняюць яго партрэт раней невядомымі рысамі. У прыватнасці, на «Гарадзенскіх чытаннях» выкладчык Гродзенскага музычнага каледжа Уладзімір Лябецкі паведаміў, што Тызенгаўз не толькі стварыў у горадзе над Нёманам тэатр, капэлу, з якой па колькасці інструментаў наўрад ці могуць параўнацца сучасныя калектывы, а таксама тэатральную школу, але і сам выступаў у ролі... кампазітара.

Альбо такая загадка, якую вылучыў для далейшых даследаванняў краязнаўца, гісторык архітэктуры Ігар Трусаў. Дагэтуль традыцыйна лічылася, што тэатр Тызенгаўза яшчэ пры яго жыцці працаваў у будынку, дзе цяпер тэатр лялек. Аднак у Санкт-Пецярбургу знойдзены архіўныя дакументы, паводле якіх у той час там быў манеж. А для тэатральных паказаў гэты будынак быў прыстасаваны на пачатку XIX стагоддзя. Але дзе ж тады ў часы графа Тызенгаўза ажыццяўляліся шматлікія оперныя і балетныя пастаноўкі?

Барыс ПРАКОПЧЫК.
Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

Хто што сказаў учора...

Святлана ДУБЕНЬ,
кандыдат медыцынскіх навук, намеснік дырэктара па арганізацыйна-метадычнай рабоце РНПЦ «Кардыялогія» — пра тое, **ці падкошвае фінансавы крызіс здароўе нацыі:**

— У Беларусі, як і ў іншых краінах свету, на працягу апошніх пятнаццаці гадоў адзначаецца рост хваробаў сістэмы кровазвароту, якія традыцыйна займаюць першае месца ў структуры смяротнасці і інваліднасці насельніцтва. У нашай краіне агульная колькасць хваробаў сістэмы кровазвароту сёлета вырасла больш як на 11 працэнтаў у параўнанні з мінулым годам. Павелічэнне смяротнасці абумоўлена мноствам фактараў, сярод якіх паніжэнне ўзроўню жыцця, рост псіхаэмацыйных нагрузак, змена характару харчавання, умоў жыцця і працы, адсутнасць у грамадзян матывацыі да захавання здаровага ладу жыцця і лячэння артэрыяльнай гіпертэнзіі і ішэмічнай хваробы сэрца. З улікам фінансава-эканамічнага крызісу беларусы сталі больш схільныя да стрэсу.

Андрэй АЛЁШКІН,
кіраўнік прадстаўніцтва міжнароднай кансалтынгавай кампаніі ў Беларусі — пра ***станоўчыя моманты пераводу жылых памяшканняў у дамах у нежылыя:***

— Указ Прэзідэнта пра перавод жылых памяшканняў у нежылыя станоўча паўплывае на развіццё ў Беларусі гандлёвай нерухомасці. Здача ў арэнду першых паверхаў жылых будынкаў выгадная не толькі аператарам гандлёвых памяшканняў, але і ўласнікам жылых будынкаў. Гэта звычайная еўрапейская практыка. На першых паверхах, па-першае, нязручна жыць. З іншага ж боку, гэта выдатная магчымасць уладальнікам жылых будынкаў атрымліваць рэгулярны прыбытак за кошт доўгатэрміновай арэнды.

Антон БЕЛЯКОЎ,
дэпутат Дзяржаўнай думы РФ — пра **неабходнасць прыняцця ў Расіі закона пра кастрацыю педафілаў:**

— І што б там ні казалі «праваабаронцы» пра захаванне правоў асуджаных, незалежна ад віду ўчыненага злачынства, хімічная кастрацыя — гэта тая мінімальная «нязручнасць», якую мы можам даставіць гвалтаўнікам і забойцам нашых дзяцей, разбуральнікам сем'яў і маньякам.

Рэйманд КУРЦВЕЙЛ,
амерыканскі вучоны, футуролаг — пра тое, што **бяссмерце стане магчымым праз 20 гадоў:**

— Сучасныя тэмпы развіцця генетыкі, нанатэхналогій і камп'ютарнай тэхнікі дазваляюць выказаць здагадку, што ўжо праз 20 гадоў чалавек зможа забяспечыць сабе вечнае жыццё. Нанатэхналогіі дапамогуць выраблять жыццяздольныя тканкі для «папраўкі» дэфектных органаў чалавечага цела. Бо мікраскапічныя нанаробаты ў крывяноснай сістэме чалавека зробяць работу сардэчна-сасудзістай сістэмы ў тысячы разоў больш эфектыўнай. Праз дваццаць гадоў у распараджэнні чалавецтва з'явяцца і іншыя сродкі для паўторнага біялагічнага праграмавання арганізма, і тады стане магчымым цалкам звесці старэнне ў нябыт.

Капуста — як сонца

Фота Анатоля КЛЕЦЧУКА.

Давыд-Гарадок Столінскага раёна здаўна лічыцца месцам высокай культуры земляробства. Тут працуе кожны лапік зямлі, а ўраджаі заўсёды радуюць гаспадароў. Нават пачаткоўцаў, маладых, як Валянціна КОЗЕЛ (на фотаздымку). Безумоўна, якасць глебы тут даволі высокая. Але ўменне працаваць на зямлі ў гарадчукоў, без перабольшвання, перадаецца з генамі. Валянціна працуе электрамантажніцай на мясцовым механічным заводзе, а ў вольны час з ахвотаю шчыруе на чатырох прысядзібных сотках. Вось і сёлетні ўраджай капусты абяцае стаць добрым плёнам яе земляробчага хобі. Качаны, як на падбор — што сонца.

Старасць і радасць

У Магілёўскім абласным драматычным тэатры адкрылася фотавыстава «Антыстэрэатыпы ў дачыненні да пажылога ўзросту».

Арганізатар выставы, фонд ААН у галіне народанасельніцтва, заклікае людзей пераглядзець сваё стаўленне да сталення і спрагназаваць сваю будучыню.

Героі фотавыставы — магілёўскія пенсіянеры, якія абвяргаюць сваім актыўным ладам жыцця меркаванні, якія склаліся ў грамадстве пра старасць. Маўляў, выйшаў на пенсію — выйшаў у тыраж. Няўжо мужчына ў 60 гадоў і жанчына ў 55 прачынаюцца і ў адзін дзень сапраўды становяцца старымі людзьмі? «Не, жыццё на пенсіі толькі пачынаецца!», — сцвярджаюць магілёўскія пенсіянеры.

Паводле апытанняў, старыя звычайна аддаюць перавагу прагляду тэлепраграм, слухаюць радыё, чытаюць газеты, гуляюць з унукамі. Але людзі на фота не выглядаюць такімі класічнымі бабулямі і дзядулямі: яны займаюцца спортам, маюць мастацкія захапленні, цікаўныя да ўсяго на свеце, схільныя да новых тэхналогій і кахання.

Жанчыны на зялёным лужку робяць гімнастыку. Адна з фізкультурніц — Аляксандра Аляксандраўна Балнокіна: «Мне 68 гадоў, а я са сваімі сябрамі дасюль хаджу на лыжах, купаюся ў возеры, адным словам — не сяджу на месцы!»

Юлія Іванаўна Агапава ў свае 68 катаецца на ролікавых каньках, яе падтрымлівае пад руку Іван Паўлавіч Пятроўскі. Мужчына перакананы, што рух — гэта жыццё, і мае выдатны жыццёвы дэвіз: «Хто не гарыць — той курадымiць! Няхай гарыць полымя майго жыцця!»

Тамары Сцяпанаўне Тарасавай — 64 гады, яе сяброўцы Зоі Аляксандраўне Брэдус — 73, і яны не пабаяліся апрабаваць экстрэмальны атракцыён з пераваротамі, да якога не асмельваюцца падысці і вельмі маладыя асобы.

— На мой погляд, без актыўнага ладу жыццё ператвараецца ў сумнае, шэрае, аднастайнае, — лічыць 68-гадовая Тамара Паўлаўна Бурдэнкава.

Самыя рамантычныя фота на выставе — маладых сужэнцаў, якія знайшлі сваё шчасце пад старасць. У Марыі Міхайлаўны Савіцкай і ветэрана вайны Паўла Фёдаравіча Мазалава — другая маладосць. Сёлетнім летам яны пажаніліся: і дарма што жаніху — 82 гады, а нявесце — 75, але «энергія засталася і для пачуццяў, і для актыўнага жыцця».

Пятру Андрыянавічу Скірнеўскаму і Валянціне Рыгораўне Біцюк — пад 70, а разам яны 5 гадоў: «Мы — неразлучныя ўжо назаўсёды!» Валянціна Рыгораўна пазіруе з камп'ютарам, які нядаўна падарыў сын: трэба ісці ў нагу з часам!

Цяпер у Беларусі кожны пяты жыхар — пенсіянер. Паводле прагнозаў, да 2030 года колькасць людзей, старэйшых за 65 гадоў, будзе ў краіне не меншая за 27 %. Насельніцтва старэе, працягласць жыцця павялічваецца: сёлета чакаецца, што гэты паказчык ушчыльную наблізіцца да 70 гадоў.

Таму арганізатары выставы ў Магілёве нагадваюць: пенсіянеры — гэта не наша мінулае, а наша будучыня. Не трэба глядзець на пенсію як на заканчэнне актыўнага жыцця, агітуюць магілёўскія пенсіянеры. Дзяржаве ж выпадае клапаціцца не толькі пра адзінокіх і нямоглых старых, але і тых, хто ў свае «за 60» хоча займацца спортам і мастацтвам і не адставаць ад актыўнага жыцця.

Ілона ІВАНОВА.

УКРАЎ САЛЯРЫЙ

У дом да пінчанкі, якая пражывае ў Дарожным завулку, праз акно на паддашку залез злодзей. І выцягнуў дабра амаль на 10 мільёнаў рублёў. Забраў пыласос, тэлевізар і нават пераносны салярый. Па падазрэнні ў крадзяжы затрыманы 34-гадовы непрацуючы жыхар Пінска, які ўжо быў судзімы за крадзеж.

Яна СВЕТАВА.

Віктар ГАНЧАРЭНКА:

«У ЕЎРОПЕ ЯК НЕ БЫЛО ЦІКАВАСЦІ ДА БАТЭ, ТАК І НЯМА»

Сёння ў 20 гадзін на мінскім стадыёне «Дынама» чэмпіён краіны БАТЭ правядзе свой першы хатні матч Лігі Еўропы, яго супернік — ліверпульскі «Эвертан». За дзень да паядынку было раскуплена ўсяго каля 18 тысяч білетаў (умяшчальнасць стадыёна — 34 тысячы). Больш за паўтары тысячы англійскіх балельшчыкаў чакаецца ў беларускай сталіцы, большасць з іх прыбудзе ў дзень матчу. На стадыёне яны размесцяцца ў 10 і 11 сектарах. Дапамагаць беларускай міліцыі ў справаджэнні замежных балельшчыкаў будуць тры англійскія паліцэйскія. Найбольш падазроных фанаў англійскага клуба агледзяць у спецыяльнай палатцы на тэрыторыі стадыёна «Дынама». Самалёт з англійскай камандай прызямліўся ўчора ў сталічным аэрапорце ў 14.45 і каманда накіравалася ў гасцініцу «Crowne Plaza». Адразу пасля матчу прадстаўнікі клуба пакінуць нашу сталіцу — рэйс запланаваны на 0.30 2 кастрычніка. Учора ўвечары госці правялі трэніроўку на стадыёне «Дынама». Беларускі клуб апрабоўваць дынамаўскі газон не стаў і трэніраваўся на сваёй базе ў Дудзінцы. За дзень да матчу галоўны трэнер БАТЭ Віктар Ганчарэнка сустрэўся з журналістамі.

«Мы рыхтуемся да матчу з добрым настроем. У нас ёсць нераможная серыя ў чэмпіянаце Беларусі, якая садзейнічае як аднаўленню гульцоў, так і настрою. Жывём маючай адбыцца гульнёй, з нецярпеннем чакаем пачатку матчу», — сцісла апісаў настрой на матч Віктар Ганчарэнка.

— Што ведаеце пра суперніка?

— Лічу, што ў нас дастаткова інфармацыі. Ёсць запіс амаль усіх гульняў, якія правёў «Эвертан» сёлета. Да таго ж, Вадзім Скрыпчанка ездзіў на гульню «Портсмут» — «Эвертан». Гэта магутная, сілавая каманда, у адрозненне ад нашага папярэдняга суперніка — партугальскай «Бенфікі», аддае перавагу доўгаму пасу, доўгім перадачам, вызначаецца вельмі небяспечнымі стандартамі, да таго ж гэта надзвычай атлетычныя гульцы.

— Перадматчавую трэніроўку клуб праводзіць у Дудзінцы. Калі збіраецеся апрабоўваць газон «Дынама»?

— Мяркую, што калі і не апробуем, ніякіх праблем не ўзнікне. Мы яго і так добра ведаем, па яго знешнім выглядзе зразумела, што ён добрай якасці, што садзейнічае добраму футболу.

— Сіноптыкі ўвечары абяцаюць дождж і даволі прахалоднае надвор'е...

— Хочаце сказаць, што будзе англійскае надвор'е? Мы гатовыя, у тым ліку, і да снегу.

— Падчас леташняй Лігі чэмпіёнаў у першым хатнім супрацьстаянні з «Ювентусам» ваша каманда здзівіла ўсіх высокай хуткасцю, дзякуючы якой паспяхова гуляла з супернікам. Ці гатовая сёлета каманда да высокага тэмпу?

— Функцыянальна мы гатовыя, у гэтым няма сумненняў. І летась мы казалі, што хочацца хутчэй навучыцца гуляць на такіх хуткасцях, як супернік. І ў нейкай ступені для мяне было нечаканасцю, што футбалісты вельмі хутка падстроіліся і паказвалі выдатны футбол з выдатнымі хуткасцямі. Хочацца спадзявацца, што гэтак жа будзе і ў найбліжэйшай гульні.

— Летась вы наракалі, што прэса больш цікавасці праяўляе да суперніка, чым да каманды БАТЭ. Як сёлета? Ці сталі больш гаварыць пра БАТЭ ў Еўропе?

— Як не было да нас ніякай цікавасці ў Еўропе, так і няма. Магу толькі пацвердзіць, што шмат увагі беларуская прэса надае нашым супернікам, і ў меншай ступені нам. У той жа час я разумею і журналістаў: яшчэ і гульцы, і трэнерскі штаб не зусім падрыхтаваныя да бясконцых інтэрв'ю, і калі з'яўляецца нейкая ніша, вы запаўняеце яе замежнымі камандамі. Мы ўсе разам павінны рабіць больш папулярным наш футбол. Хочацца, каб вы ўсё ж больш ведалі пра нашых футбалістаў — такіх, як Крывец. На мой погляд, ён больш цікавы, чым Білялетдзінаў. (У дзень размовы на першай старонцы адной са спартыўных беларускіх газет выйшла інтэрв'ю з гульцом «Эвертана» і расійскай зборнай Дзіняram Білялетдзінавым. — **Аўт.**).

— Калі пасля турніру замежныя клубы праявяць цікавасць да таго ж Сяргея Крыўца, наколькі ахвотна клуб яго адпусціць?

— Мяркую, што клуб — ахвотна. Не хоча развівацца з вядучымі гульцамі, як правіла, трэнерскі штаб. Але мы з разуменнем да гэтага ставімся. І калі з'явіцца добрыя прапановы, мы толькі абедзвюма рукамі за тое, каб усе нашы футбалісты выступалі ў больш моцных чэмпіянатах, што пойдзе на карысць нашай зборнай. А свае страты мы заўсёды ўдала кампенсавалі, і ў нас на прыкмеце заўсёды ёсць гульцы, якіх мы запросім да сябе ў наступным сезоне.

— Мяркуючы па колькасці прададзеных білетаў, аншлаг на стадыёне «Дынама» пад пытаннем. Магчыма, з вашых родных Хойнікаў прыедзе група падтрымкі?

— Нават калі ўвесь горад прыедзе, іх не хопіць... Хацелася б, натуральна, каб быў поўны стадыён. Нам было б куды прыемней гуляць пры падтрымцы сваіх балельшчыкаў.

— Перад матчам зборных паміж Англіяй і Беларуссю склалася няпростая сітуацыя з атрыманнем англійскіх візаў нашымі балельшчыкамі. Шмат адмоў, матываваных недастатковым узроўнем даходаў. Такая сітуацыя можа ўзнікнуць і перад матчам у адказ з «Эвертанам». На ваш погляд, ці патрэбны тут асобны падыход для балельшчыкаў?

— Мне здаецца, калі ёсць нейкая магчымасць зрабіць паслабленне для балельшчыкаў, то хацелася б, каб і беларускае, і англійскае пасольствы на гэта пайшлі. Калі ёсць два лагеры, кожны з якіх хварэе за сваю каманду, гэта надае гульні пэўны шарм, таму спадзяюся, што беларускія балельшчыкі атрымаюць візы і падтрымаюць нас на выездзе.

Фота Пятра ФАМІНА.

Паўабаронца БАТЭ Сяргей КРЫВЕЦ таксама падзяліўся з журналістамі сваімі меркаваннямі напярэдадні гульні.

— Летась, калі мы выступалі ў Лізе чэмпіёнаў, усё было ўпершыню, усе супернікі былі надзвычай моцныя. Сёлета наша каманда мае вопыт гульняў з вядучымі замежнымі клубамі, таму ўсё больш спакойна.

— Летась вы марылі забіць «Рэалу». Ці ёсць сярод супернікаў на групе сёлета якія-небудзь пераваг?

— Проста буду імкнуцца забіць, і як мага больш. Сёлета няма такой топ-каманды, таму забіваць хочацца ўсім. А калі казаць пра камандныя мэты, то будзем імкнуцца выйсці з групы.

— Якое ў вас ўражанне ад «Эвертана»?

— Мне падабаецца гэтая каманда. З гульцоў вызначыў бы Сцівена Піенаара — крайні паўабаронца, і нападаючага Луі Саа. У цэлым у іх хапае добрых футбалістаў, гэта моцная каманда.

— На ваш погляд, дзе будуць разгортвацца асноўныя баі: зверху ці ўнізе, у цэнтры поля ці на флангах?

— На футбольным полі... Мяркую, што ўнізе, не думаю, што будзе настолькі брытанскі футбол. Па меншай меры, мы будзем імкнуцца трымаць мяч унізе.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

На слыху

Беларусамі звацца. У Швецыі

Цяпер шведы афіцыйна паймянуюць нас не vitryssar, a belarusier

Упершыню пытанне аб змене назвы Беларусі з Vitryssland на Belarus уздымалася шведскім дэпутатам Урбанам Алінам яшчэ ў 1996 годзе, але тады моўны камітэт адхіліў гэту прапанову, палічыўшы яе неабгрунтаванай. Тое, што не ўдалося зрабіць аднаму чалавеку, праз нейкі час атрымалася ў грамадскай ініцыятыўнай групы.

Некалькі гадоў запар беларусы, якія жывуць у Швецыі, дабіваліся змены тамтэйшай назвы нашай краіны. У звароце, накіраваным у Міністэрства замежных спраў, моўны камітэт і Шведскую Каралеўскую акадэмію, адзначалася, у прыватнасці: назва «Vitryssland» даслоўна перакладаецца як «Белая Расія», што, як падкрэслілі аўтары ліста — члены Беларускага згуртавання Стакгольма, выклікае ў паўсядзённым жыцці пастаянную блытаніну дзвюх краін. Ініцыятыўную групу падтрымаў шэраг вядомых шведскіх палітыкаў і грамадскіх дзеячаў, у тым ліку і пасол Швецыі ў Беларусі Стэфан Эрыксан. «Аднак без вялікага клопату простых грамадзян Швецыі беларускага паходжання, якія вельмі нам дапамаглі, гэты мур ніколі б не паў», — упэўнены адзін з ініцыятараў звароту, гісторык Андрэй Катлярчук.

На гэты раз вынік не прымусіў сябе чакаць: 25 верасня на пасяджэнні Шведскай акадэміі прынятае рашэнне — замяніць афіцыйную шведскую назву беларускага народа з vitryssar на belarusier. Гэтыя змяненні патраляць у акадэмічны слоўнік шведскай мовы, які ўсталёўвае нормы словаўжывання. На сёння, 1 кастрычніка, прызначаны наступны крок — сумеснае пасяджэнне Шведскай акадэміі і моўнага камітэта, якія разгледзяць пытанне афіцыйнай змены геаграфічнай назвы Vitryssland на Belarus.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Кампанія Nokia прапануе тэлефоны з беларускамоўным меню

Пакуль айчынныя вытворцы толькі «раскачваюцца» з выпускам уласнай маркі мабільных тэлефонаў, пазітыўныя змены на беларускім рынку ўсё ж адбываюцца. Напрыклад, кампанія Nokia пачала выпускаць апараты з беларускай лакалізацыяй.

На гэты момант магчымасць выбару беларускамоўнага меню ёсць у мадэлях 5030 і 1661 (абодва тэлефоны — бюджэтныя мадэлі коштам да 80 долараў), але чакаецца, што пералік гэты пазней істотна пашырыцца. Некалькі гадоў таму беларускую версію меню ў тэлефонах анансаваў таксама Samsung, але потым гэтыя планы знянацку адмяніліся, і кампанія абмежавалася беларускамоўнай рэкламай многіх сваіх тавараў.

«ЗАГРУЗКУ» ТРЭБА ПАШУКАЦЬ?

Федэрацыя прафсаюзаў мае намер звярнуцца ў Савет Міністраў з прапановай тэрмінова разгледзець сітуацыю з няпоўнай занятасцю — пра гэта карэспандэнту «Звязды» паведаміла прэс-сакратар ФПБ Вольга ЗУЁНАК.

Маніторынг стану прадпрыемстваў, які праводзіць Федэрацыя прафсаюзаў, паказаў, што ў сёлетніх студзені—ліпені ў рэжыме няпоўнага працоўнага тыдня або дня ў краіне былі занятыя 127,8 тыс. чалавек, а колькасць работнікаў, якія вымушаныя былі пайсці ў водпускі па ініцыятыве наймальніка, склала 110 тысяч. Гэтыя паказчыкі ўзраслі адпаведна ў 6 і 4,4 раза. За перыяд вымушаных прастояў ці водпускаў работнікі атрымліваюць усяго 2/3 сваёй тарыфнай стаўкі, і тое не заўсёды. Паводле ацэнак ФПБ, каля 40 % работнікаў былі накіраваныя ў водпускі ўвогуле без аплаты.

У сувязі з гэтым, перакананыя ў Федэрацыі, тут трэба тэрмінова прымаць пэўныя меры. Так, прафсаюзы лічаць: кіраўнікі «праблемных» прадпрыемстваў павінны разгледзець магчымасці часовага прыцягнення супрацоўнікаў да бягучых рамонтаў, рэканструкцый і падрыхтоўкі вытворчых памяшканняў і цэхаў да зімы, а таксама да прыборкі тэрыторый, прычым гэта работа павінна аплачвацца ў поўнай меры. «Калі ж магчымасцяў забяспечыць такой работай у найманікаў рэальна няма, то неабходна больш актыўна займацца перакваліфікацыяй кадраў», — адзначыла Вольга Зуёнак.

Сяргей ГРЫБ.

Нефармат

СУСТРЭЧА ПАД ПАВУЦІНАЙ

Не, я не маю на ўвазе тонкую, ледзь прыкметную павуцінку, якую гоніць праз поле вецер бабінага лета, я кажу пра каварнае сусветнае Павуцінне — інтэрнэт. Яно можа ўварвацца ў жыццё асобнага чалавека, нават калі яго зусім не просяць, і перавярнуць яго, гэта жыццё, з ног на галаву.

Калі б хто сказаў пару гадоў таму шаноўнаму выкладчыку ВНУ, чалавеку сталаму і станоўчаму, што бязглуздыя збег абставінаў, выпадковасць, нейкая электронная абракадабра давядуць яго ледзь не да інфаркту, не паверыў бы. Зусім не паверыў бы. Бо гэта магло здарыцца з кім заўгодна, толькі не з ім.

А з чаго пачалося? З усеагульнага захаплення сайтам «Аднакласнікі». Зайшоў неяк з цікавасці і ўбачыў фота сваёй далёкай таварышкі па школьнай парце. Ну, можа калі падносіў школьны партфель ці з навагодняга вечара дамоў праводзіў. Але, як бывае, шляхі разышліся, пасля выпускнога вечара, лічы, і не бачыліся. Напісаў колькі слоў, завязалася перапіска. Яна таксама шчыруе на выкладчыцкай ніве, толькі вельмі далёка, амаль за тысячу кіламетраў. Жыве з дачкой, з мужам разбегліся даўно. Ды, мяркуючы па пісьмах, былая аднакласніца жыве ў гармоніі з сабой, будуе і ажыццяўляе навуковыя і іншыя планы. Даўно навучылася зарабляць грошы, быць самастойнай і самадастатковай. З дачкой-студэнткай кожны год адпачываюць у іншай краіне, каб «паглядзець свет». Яму таксама, як ён лічыў, было пра што расказаць. Словам, перапісваліся яны ўжо некалькі гадоў, і падобна на тое, кожны атрымліваў ад таго абмену думкамі нейкае задавальненне. І цягнулася б гэта яшчэ невядома колькі, каб аднойчы ў электронную пошту хатняга камп'ютара не зазірнула жонка Івана Іванавіча.

Тая самая жонка, якая працуе ў суседняй ВНУ, і якую ўся кафедра лічыць прыгожай, разумнай, эталонам жонкі і гаспадыні сям'і. І ён так лічыў... Ва ўсялякім разе за паўтара дзясятка гадоў, на працягу якіх яны з мужам абмяркоўваюць свае навуковыя працы і надзённыя праблемы ў нас за кавай, не даводзілася адчуць нейкай незадаволенасці сямейным жыццём. Наадварот, пра жонку ён адгукаўся толькі з павагай. І нагул, Іван Іванавіч не з тых людзей, якія ахвотна гавораць пра асабістае, і не з той кагорты, пра якую кажуць, што балбатун — знаходка для шпіёна. Але цяпер усё памянялася.

Цяпер ён расказвае, нібы хоча знайсці падтрымку і паратунак. Бо жыццё сапраўды ператварылася ў нейкі вэрхал. На хатні тэлефон у пажарным парадку ўсталяваны вызначальнік нумароў. Мабільныя тэлефоны кожны дзень правяраюцца на прадмет уваходных і выходных званкоў. Сядзяць яны з мужам на кухні за кавай, і кожныя паўгадзіны, як стрэл, гучыць кантрольны званок. Жыццё, паводле яго слоў, стала нечым нагадваць рэжым зоны, дзе абавязковыя ранішняя праверка і вячэрняе пастраенне. Толькі што ногі не прымушаюць ставіць на шырыню плячэй і ўзнімаць рукі для вобыску. Даходзіць да абсурду, калі пасля лекцыі, на час якой адключаеш тэлефон, трэба апраўдвацца і тлумачыць. Бывае няёмка не толькі перад калегамі, але і перад студэнтамі. Вось гэты пастаянны прэсінг, недавер пасля амаль трыццаці гадоў сумеснага жыцця, не проста нервуе, з сябе выводзіць, але ўсё перакрэслівае...

Адзін вясёлы таварыш па працы Івана Іванавіча, які не абцяжарвае сябе пісьмамі да жанчын, напісаны мі «высокім стылем», ды знаходзіць дарогу да іх сэрцаў хутка і проста, нібы паручнік Ржэўскі, спачувае каллегу, але кажа, што той ва ўсім вінаваты сам. «Разбэсціў ты сваю бабу, усё жыццё маліўся, як на абраз, думаць у другі бок і тое не дазваляў себе. Вось і знайшла зачэпку ў драбніцы. А калі б яна ноч якую не паспала ў думках, ці прыйдзеш, ці вернешся дадому, то і цаніла б лепей. Мая, каб убачыла пісьмо, дзе няма канкрэтна вызначанага месца і часу сустрэчы, нават увагі не звярнула б», — падсумаваў кафедральны аматар і знаўца жаночай прыгажосці.

Якое там месца і час сустрэчы. Пра гэта гаворка ніколі не ішла. Наадварот, ён расказваў пра сваю добрую сям'ю, пра поспехі дзяцей. А цяпер усё часцей ловіць сябе на думцы, што хоча ўзяць білет ды і паехаць. Хоць, шчыра кажучы, і туды ніхто не клікаў. Тым больш цяпер, калі жонка напісала ёй абразлівае, нічым не заслужанае, пісьмо.

Як чалавек тактоўны, Іван Іванавіч стараецца ўсё ж з чужымі людзьмі не абмяркоўваць сваю жонку. Цяпер іх размовы з мужам часта заходзяць на тэмы больш глабальныя і філасофскія. Накшталт таго, куды прывядзе нас тэхнічны прагрэс. Гадоў праз 20—30 кожны чалавек можа стаць аб'ектам нейкага татальнага ўліку і кантролю. Мы некалі смяяліся з артадаксальных вернікаў, якія адмаўляліся браць пашпарты з асабістымі нумарамі. А ў гэтым нешта было, першы званочак. Цяпер нам прапануюць здаць адбіткі пальцаў, выклікаюць па чарзе ў міліцыю. Справа зусім недалёкай будучыні — увядзенне электронных чыпаў. Чып стане монстрам і валадаром кожнага, па ім стане магчымым вызначаць месцазнаходжанне кожнага чалавека ў любы момант. І вось гэтыя чыпы адымуць галоўны складнік чалавечнасці — свабоду. А чалавек несвабодны — гэта зусім не чалавек. Гэта іншая істота, нейкі біяробат, якога старанна вымалёўвалі пісьменнікі-фантасты.

«Што ж тэта будзе за грамадства!?» — усклікае выкладчык грамадскіх дысцыплінаў, трасе газетай, якую спецыяльна прынёс і шчодра пляскае сабе ў шклянку каньяку. Зрабіўшы пару глыткоў, цытуе: «Грамадства апошніх часоў — вось што гэта будзе. А пры такім раскладзе канец свету — хоць нейкая нагода для аптымізму».

Не ведаю, як з грамадствам, а з Іванам Іванавічам робіцца нешта нядобрае і непатрэбнае. Ён ніколі не злоўжывае, у госці мог прыйсці хіба што з кульком цукерак. А цяпер усё часцей захоплівае пляшку, а то і прыходзіць ужо ў стане «павышанай весялосці», што яму зусім не пасуе. І трэба ж было жонцы ўбіцца ў тое злашчаснае Павуцінне. Раней, паводле яго слоў, яна зусім не сябравала з інтэрнэтам. Але ж часы мяняюцца. І грамадства настойліва прасоўваецца да нейкіх іншых сваіх часоў.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

А не шкодзь!

Адказалі спаўна

За незаконную здабычу бабра і выдры суд Нясвіжскага раёна прызначыў браканьеру пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на 1 год і 6 месяцаў з адтэрміноўкай выканання прызначанага прыгавору на 1 год. Парушальнік таксама павінен пакрыць нанесеную шкоду ў памеры 5,6 мільёна рублёў.

Канфіскаваны GPS-навігатар і бінокль, а таксама штраф у памеры амаль 3 мільёнаў — так па рашэнні суда Мядзельскага раёна адказаў іншы браканьер за здабычу рыбы забароненымі прыладамі рыбалоўства і нанясенне прыродзе шкоды ў буйным памеры. Суд Глыбоцкага раёна за аналагічнае правапарушэнне, здзейсненае ў перыяд забароны на лоўлю рыбы, а таксама за прыцягненне да ўчынення гэтага злачынства няпоўнагадовай асобы «адмераў» «рыбаку» абмежаванне волі тэрмінам на 1 год і 6 месяцаў без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу. Яму ж трэба будзе пакрыць і нанесеную шкоду ў памеры 1,9 мільёна рублёў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Тэлеінтэрнат

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Маласямейны інтэрнат у Давыд-Гарадку Столінскага раёна.

Zamor'e

А ШТО Ў ВАС У ЧАМАДАНЧЫКУ?

АБО З ЖЫЦЦЯ МЫТНІКАЎ

Фота БЕЛТА.

Жыццё супрацоўніка мытнай службы, які штодня правярае некалькі тысяч адзінак багажнай кладзі, назваць сумным нельга. Акрамя адзення і жыццёва важных рэчаў, пасажыры часам спрабуюць правезці самыя што ні на ёсць дзіўныя прадметы. Цяпер сэкс-цацкай, якая аўтаматычна ўключылася на кантролі, нікога не здзівіш. Сёння ў свеце ў чамаданах падарожнічаюць каты, касцюмы вярблюдаў, кракадзілы і нават шкілеты. Ніжэй сабраныя дзіўныя рэчы і істоты, знойдзеных службамі мытні аэрапортаў.

ПАХАВАННЕ ПА-ІТАЛЬЯНСКУ

Супрацоўнікі мюнхенскага аэрапорта затрымалі сталую даму, якая перавозіла ў сваім багажы запячатаны ў поліэтыленавы пакет шкілет. Якое было здзіўленне мытнікаў, якія выявілі італьянскую 62-гадовую кілершу! Як высветлілася, бабуля выконвала апошняе жаданне свайго брата, які памёр 11 гадоў таму, — пахаваць яго ў роднай зямлі ў Італіі. Ну што ж, лепш позна, чым ніколі! Бо жанчына не парушыла закона, улады выдалі ёй дазвол, які адпавядае на перавозку такога незвычайнага грузу ў Неапаль.

ВЯРБЛЮДЖЫЯ ПАКУТЫ

Навошта пакаваць з сабой касцюм вярблюда? На гэтае пытанне зможа адказаць толькі пасажыр, які выклікаў сваім незвычайным багажом перапалох у сіднэйскім аэрапорце. Сітуацыя не была б такой камічнай, калі б грузчык не вырашыў на час «пазычыць» экстравагантную частку гардэроба. У вярблюджым абліччы ён вырашыў паказацца народу на пасадачнай паласе, дзе пасажыр і распазнаў сваю ўласнасць. Падбухторшчык бязладзіцы быў імгненна злоўлены за парушэнне правілаў бяспекі. Затое ўсе пасажыры самалёта засталіся задаволеныя такім «спектаклем».

АТРУТНАЕ ХАРЧАВАННЕ

Маладая амерыканская мама спакойна накіроўвалася на свой рэйс, калі ахова аэрапорта JFK спыніла яе для агляду. Наўрад ці яна калі-небудзь магла ўявіць сабе, што падобную рэакцыю могуць выклікаць тры бутэлечкі з грудным малаком, якія захоўваліся ў жанчыны ў сумцы. Супрацоўнікі JFK прынялі вадкасць за яд, прымусіўшы небараку выпіць з кожнай з трох бутэлек. Амерыканка прапанавала проста накапаць вадкасць на руку, але ахова адчайна настойвала на дэгустацыі.

ДЛЯ НАВУКІ

Працоўны персанал міжнароднага аэрапорта Логан быў здзіўлены, знайшоўшы ў чамадане аднаго з пасажыраў разрэзаную напалову галаву цюленя. Мужчына, які быў біёлагам, растлумачыў, што адрэзаў гэтую частку цела ад мёртвага цюленя, на якога ён выпадкова наткнуўся на адпачынку. Біёлаг збіраўся выкарыстаць гэты асобнік у адукацыйных мэтах, але за адсутнасцю спецыяльнага дазволу гала-ва ад трупа засталася ў мытнікаў. Пасажырам гэтага рэйса сапраўды пашанцавала — уявіце сабе толькі пах гэтага багажу.

ВЕТЭРАНА РАЗЗБРОІЛІ

У лос-анджэлескім аэрапорце быў затрыманы брытанскі вандроўца Джудзі Паўэл. Бязлітасны персанал аэрапорта адабраў у дзядулі падарунак для любімага ўнука. Але і ім гэтае рашэнне далося няпроста. Работнікі памяталі аб сваім галоўным абавязку — канфіскоўваць у пасажыраў усё тое, што чым-небудзь нагадвае зброю. Таму над канфіскацыяй цацкі ў дзядулі, які перыядычна махаў вінтоўкай, яны доўга ламалі галаву. У выніку, праўда, усё ж вырашылі адабраць. Такім чынам, страшны «пластмасавы» тэрарыст быў абясшкоджаны, а ўнук так і застаўся без доўгачаканага прэзента.

КРАКАДЗІЛАВАЯ СУМКА

Затрыманы ў аэрапорце Манілы філіпінец сцвярджаў, што перавозіць у багажы жывую рыбу. Гэта і так гучыць даволі дзіўна, але тое, што знайшлі ў яго насамрэч, было куды цікавей. У багажы знаходзіліся тры жывыя сіямскія кракадзілы! Сумка з кракадзіла гэта яшчэ куды ні шло, але кракадзілы ў сумцы — ужо абсалютная беззаконнасць. Так палічылі і работнікі мытні, адправіўшы кракадзілаў ураду, а пасажыра — на сустрэчу з вялікімі непрыемнасцямі.

БАБУЛЯ-ТЭРАРЫСТКА

Ні для каго не сакрэт, што пажылыя замежнікі перыядычна возяць з собой кубікі лёду, каб прыкладваць іх да хворых месцаў. Таму змест сумкі 66-гадовай Сары Вейс не адрозніваўся ўнікальнасцю, але тое, што адбылося з ёй у аэрапорце ў Сан-Дыега, было сапраўды дзіўным. Кубікі лёду, запячатаныя клейкай стужкай, выклікалі ў службы бяспекі падазрэнне. Пажылой жанчыне спатрэбілася тры гадзіны і куча нерваў, каб давесці службе аэрапорта, што яна ніяк не звязаная з Усамай Бін Ладэнам!

ПАСАЖЫР У ЧАМАДАНЕ

У нейкай Мэры Мартэл апынуўся бясплатковы спадарожнік да Нью-Брунсвіка. І гэта вызначылася толькі тады, калі жанчына прыехала ў гатэль па месцы прызначэння — у яе багажы знаходзіўся любімы кот. Мяркуецца, што хітрая жывёліна незаўважна забралася ў чамадан, калі гаспадыня бесклапотна паказвала рэчы. Як ні дзіўна, у аэрапорце «іншароднага» прадмета выяўлена не было, таму жывёліна без лішніх праблем даехала да гатэля. На шчасце, авіякампанія Air Canada дазволіла разумнаму бясквітоўніку даляцець назад дадому бясплатна.

ЖАНОЧАЯ ЗБРОЯ

71-гадовая Рафаэла Мендэз занядбала правіламі аэрапорта. Бабулька была затрыманая ў міжнародным аэрапорце Тампа за перавозку ў багажы скуранай біты. Прычынай узбраення Рафаэлы сталі перыядычныя сэксуальныя дамаганні з боку мужчын. Таму бабулька ўсё жыццё возіць з сабой прыладу, «каб біць іх па руках».

РАСОЛ СУПРАЦЬ ЗМЯІ

Кот, дарэчы, далёка не адзінкавы выпадак няўважлівай працы работнікаў аэрапортаў. У Індыі была затрыманая пасажырка, якая везла з сабой жывую змяю. Гад быў знойдзены толькі падчас палёту. Адну са сцюардэс самалёта здзівіў слоік з агуркамі, які выпаў з сумкі пасажыркі. Пры наступным вобыску ў дзяўчыны ў чаравіках знайшлі змяю. Самым цікавым стаў той факт, што служба бяспекі палічыла расол з агуркамі нашмат небяспечней за жывую змяю.

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка

Наименование предмета аукциона	Подсобное хозяйство и право заключения договора аренды земельного участка
Местонахождение недвижимого имущества	Брестская обл., Дрогичинский р-н, д. Горавица
Продавец недвижимого имущества	ГЛХУ «Дрогичинский лесхоз», (01644) 3 64 16, 3 64 20
Характеристика предмета аукциона	Здание свинофермы с пристройкой 1992 г.п., площадь – 252 кв.м, водонапорная башня; здание зернохранилища 1988 г.п., площадь – 308 кв.м; здание коровника 1987 г.п., площадь – 401 кв.м, весовая, сарай. Земельный участок площадью 0,8121 га; срок аренды – 50 лет
Начальная цена предмета аукциона, руб.	112 493 609
Сумма задатка, руб.	11 249 000
Реквизиты счета для перечисления задатка	р/с 3642902530005 ГФ по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНП 200020538; срок внесения суммы задатка – по 14 октября 2009 года включительно
Организатор аукциона	**Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. (0162) 23 12 63, 20 87 85, www.brest-region.by**

Аукцион состоится **15 октября 2009 года в 11.00** по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан:

подписать протокол аукциона в день аукциона;

в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этого участка; внести в местный бюджет плату за право заключения договора аренды земельного участка, после чего не позднее 2-х рабочих дней заключить с продавцом договор купли-продажи недвижимого имущества, а с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 года № 462.

Более подробная информация об участии в аукционе опубликована в газете «Звязда» от 1 августа 2009 г. № 142.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 405, 404, фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 17.30 по рабочим дням по 14 октября 2009 года включительно.

КАЛИНКОВИЧСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ (ГОМЕЛЬСКАЯ ОБЛАСТЬ)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

Лот 1 — по продаже земельного участка в частную собственность негосударственным юридическим лицам и индивидуальным предпринимателям Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного двухэтажного жилого дома по адресу: Гомельская область, г. Калинковичи, ул. Братьев Ясковец, 8, площадь участка 0,1037 га, кадастровый номер 322350100003003710. Начальная цена продажи 3 668 163 белорусских рубля. Ограничений в использовании нет. К земельному участку подведены инженерные коммуникации (газ, вода, канализация, электроэнергия). Победитель аукциона возмещает затраты, связанные с организацией и проведением аукциона в сумме 470 772 белорусских рубля и затраты на объявления в СМИ. Условия проведения аукциона (наличие не менее двух участников).

Лот 2 — по продаже земельного участка в частную собственность негосударственным юридическим лицам и индивидуальным предпринимателям Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного двухэтажного жилого дома по адресу: Гомельская область, г. Калинковичи, ул. Братьев Ясковец, 10, площадь участка 0,1038 га, кадастровый номер 322350100003003711. Начальная цена продажи 3 896 130 белорусских рублей. Ограничений в использовании нет. К земельному участку подведены инженерные коммуникации (газ, вода, канализация, электроэнергия). Победитель аукциона возмещает затраты, связанные с организацией и проведением аукциона в сумме 470 772 белорусских рубля и затраты на объявления в СМИ. Условия проведения аукциона (наличие не менее двух участников).

Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на счет Калинковичского райисполкома № 3642419000189, филиал 313 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Калинковичи, код 674, УНН 400061401. Оплата за объект аукциона должна быть осуществлена в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Возможность ознакомиться с земельными участками предоставляется продавцом в срок до 2 ноября 2009 года.

Аукцион состоится **06.11.2009 года** в 10.00 по адресу: Гомельская область, г. Калинковичи, пл. Ленина, 1 (райисполком).

Заявления на участие и необходимые документы принимаются с момента опубликования извещения до 17.30 **2 ноября 2009 года** по адресу: г. Калинковичи, ул. Князева, 4, кабинет 218 (землеустроительная и геодезическая служба Калинковичского района).

Контактные телефоны: 8 (02345) 33 855, 32 600.

УНП 400061401

ГОМЕЛЬСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ТЕРРИТОРИАЛЬНЫЙ ФОНД ГОСУДАРСТВЕННОГО ИМУЩЕСТВА

проводит 13 октября 2009 г. повторный аукцион по продаже объектов недвижимости государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества

ЛОТ № 1

Незавершенное законсервированное капитальное строение – здание КБО и право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества.

Сведения о предмете аукциона: двухэтажное кирпичное незавершенное строительством здание КБО с подвалом, инв. № 320/U-16288, фундаменты – сборные бетонные, стены второго этажа отсутствуют, междуэтажные перекрытия – ж/бетонные плиты, площадь застройки – 811 кв.м, строительная готовность – 38 %.

Местонахождение: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, микрорайон № 19, д. 34-б.

Условия использования – под торговое здание, здание общественного питания, бытового обслуживания населения, объект культурно-развлекательного назначения.

Земельный участок – 0,2652 га. Срок аренды земельного участка 30 лет.

Начальная цена единого предмета аукциона – 222 731 724 руб., в т.ч. имущества – 171 819 375 руб. (стоимость снижена на 50 %), права заключения договора аренды земельного участка – **50 912 349 руб.** Расходы, связанные с формированием земельного участка и государственной регистрацией в отношении этого участка, составляют **498 570 руб.**

Задаток, вносимый участником, – 20 000 000 руб.

ЛОТ № 2

Незавершенное законсервированное капитальное строение – здание АТС и право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества.

Сведения о предмете аукциона: четырехэтажное панельное незавершенное строительством здание АТС, инв. № 320/U-16306, фундаменты – сборные бетонные, стены – стеновые панели, частично кирпичные, перекрытия – ж/бетонные плиты, кровля – совмещенная рулонная, площадь застройки – 789 кв. м, строительная готовность – 66 %.

Местонахождение: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, микрорайон № 16.

Условия использования – под административно-бытовое здание.

Земельный участок – 0,4250 га. Срок аренды земельного участка 30 лет.

Начальная цена единого предмета аукциона – 698 571 245 руб., в т.ч. имущества – **596 365 119 руб.** (стоимость снижена на 50 %), права заключения договора аренды земельного участка – **102 206 126 руб.** Расходы, связанные с формированием земельного участка и государственной регистрацией в отношении этого участка, составляют **235 041 руб.**

Задаток, вносимый участником, – 65 000 000 руб.

ЛОТ № 3

Незавершенное законсервированное капитальное строение – учебно-производственные мастерские металлургического техникума на 720 учащихся и право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества.

Сведения о предмете аукциона: одноэтажное кирпичное незавершенное строительством здание, инв. № 320/U-21319, фундамент – сборный железобетонный – готовность 77 %, стены кирпичные – готовность 3 %, строительная готовность – 4,99 %.

Местонахождение: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, микрорайон № 20.

Условия использования – под торговое здание, общественного питания, бытового обслуживания населения, объект культурно-развлекательного назначения.

Земельный участок – 0,6734 га. Срок аренды земельного участка 30 лет.

Начальная цена единого предмета аукциона – 291 937 296 руб., в т.ч. имущества – **199 048 779 руб.** (стоимость снижена на 50 %), право заключения договора аренды земельного участка – **92 888 517 руб.** Расходы, связанные с формированием земельного участка и государственной регистрацией в отношении этого участка, составляют **802 520 руб.**

Задаток, вносимый участником, – 25 000 000 руб.

ЛОТ № 4

Незавершенное законсервированное капитальное строение – центр творчества детей и юношества и право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества.

Сведения о предмете аукциона: двухэтажное незавершенное строительством здание с подвалом, инв. № 320/U-16667, фундаменты – бетонные, стены – кирпичные и стеновые панели, перекрытия – ж/б плиты, строительная готовность – 56 %.

Местонахождение: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, микрорайон № 17, д. 45.

Условия использования – под административно-бытовое здание, объект культурно-развлекательного назначения.

Земельный участок – 0,9811 га. Срок аренды земельного участка 30 лет.

Начальная цена единого предмета аукциона – 725 865 717 руб., в т.ч. имущества – **554 259 017 руб.** (стоимость снижена на 50 %), право заключения договора аренды земельного участка – **171 606 700 руб.** Расходы, связанные с формированием земельного участка и государственной регистрацией в отношении этого участка, составляют **631 791 руб.**

Задаток, вносимый участником, – 70 000 000 руб.

По лотам 1–4 продавец: имущества – РУП «Белорусский металлургический завод», тел. (02334) 5 41 25, 5 46 26, права заключения договора аренды земельного участка – Жлобинский районный исполнительный комитет, тел. (02334) 2 12 37.

ЛОТ № 5

Капитальное строение (размораживающее устройство), инв. № 342/С-50245 и право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества.

Сведения о предмете аукциона: одноэтажное кирпичное здание общей площадью 963,1 кв.м, перекрытия – ж/бетонные плиты, кровля – совмещенная, год постройки – 1969.

Местонахождение: Гомельская область, г. Светлогорск, ул. Свердлова, 7а.

Условия использования – для производственных, коммунально-складских целей.

Земельный участок – 0,2112 га. Срок аренды земельного участка 50 лет. Земельный участок имеет ограничения в использовании на площади 0,0124 га: охранная зона линий электропередачи напряжением до 1000 вольт, охранная зона линейных инженерных сооружений (теплотрасса).

Начальная цена единого предмета аукциона – 180 982 019 руб., в т.ч. имущества – **177 100 419 руб.**, право заключения договора аренды земельного участка – **3 881 600 руб.** Расходы, связанные с формированием земельного участка и государственной регистрацией в отношении этого участка, составляют **537 523 руб.**

Задаток, вносимый участником, – 15 000 000 руб.

Продавец: имущества – Транспортно-экспедиционное республиканское дочернее унитарное предприятие «Гомельжелдортранс», тел. (0232) 95 45 25; права заключения договора аренды земельного участка – Светлогорский райисполком, тел. (02342) 4 17 29.

ЛОТ № 6

Капитальное строение (здание ткацкого цеха с финским домиком), инв. № 311/С-29710 и право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества.

Сведения о предмете аукциона: здание кирпичное одноэтажное, общей площадью 162 кв.м, фундамент – кирпичный бетонный, год постройки 1976.

Местонахождение: Гомельская область, Ветковский район, дер. Неглюбка.

Условия использования – для размещения объектов обслуживания населения и мелких производственных объектов, не оказывающих вредного воздействия на окружающую среду.

Земельный участок – 0,1200 га. Срок аренды земельного участка 20 лет.

Условия аукциона: торги по данному лоту проводятся в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 27 февраля 2007 г. № 108. К участию в торгах допускаются негосударственные юридические лица и индивидуальные предприниматели на условиях:

• ввода объекта в эксплуатацию в течение 2-х лет с момента государственной регистрации договора купли-продажи;

• осуществления покупателем предпринимательской деятельности на данном объекте не менее 5-ти лет с даты государственной регистрации договора купли-продажи;

• обязательного создания не менее 3-х дополнительных рабочих мест в течение 2-х лет с момента государственной регистрации купли-продажи;

• запрещения покупателю продажи иного отчуждения объекта до выполнения им условий договора купли-продажи.

Начальная цена единого предмета аукциона – 40 790 руб., в т.ч. имущества – **35 000 руб.**, право заключения договора аренды земельного участка – **5 790 руб.**

Задаток, вносимый участником, – 4 000 рублей.

Продавец: имущества – республиканское унитарное предприятие «Гомельская фабрика художественных изделий «Любна», тел. (0232) 74 92 81; права заключения договора аренды земельного участка – Ветковский райисполком, тел. (02330) 2 15 60.

Организатор аукциона – фонд «Гомельоблимущество», **г. Гомель, проспект Ленина, 3, контактные телефоны: (0232) 70 14 72, 74 90 27.**

Аукцион проводится **13 октября 2009 г. в 11.30** по адресу: г. Гомель, проспект Ленина, 3.

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Желающим участвовать в аукционе необходимо в срок до 17.00 9 октября 2009 г. заключить с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон и представить организатору аукциона следующие документы: заявление на участие в аукционе по установленной форме; заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающую внесение задатка на счет организатора аукциона, указанный в извещении; копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицом – доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного юридического лица или иностранного гражданина, лица без гражданства – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе участники или их представители предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Организатор аукциона вправе снять объект с торгов до объявления его проданным.

Задаток перечисляется на расчетный счет фонда «Гомельоблимущество» **№ 3642927330048** в филиале **№ 300** АСБ «Беларусбанк» г. Гомель, код **МФО 151501661**, УНН 400243904. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гомель, проспект Ленина, 3, фонд «Гомельоблимущество», **ком. 406 с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00** по рабочим дням по **9 октября 2009 г.** включительно.

Заключительная регистрация участников **13 октября 2009 г. с 10.00 до 11.15.**

Победитель аукциона в течение 10 р

Краіна здароўя

Выпуск № 39 (153)

Баявая гатоўнасць

Прышчэпка, сон і зялёны чай

Сусветная арганізацыя аховы здароўя заклікае дзяржавы ахапіць да 2010 года вакцынацыяй супраць грыпу 75 працэнтаў насельніцтва. Вядома, што эканамічны эфект імунізацыі ў 10—20 разоў перавышае затраты на яе правядзенне.

Паводле слоў **намесніка галоўнага ўрача па медыцынскай часці 2-й Мінскай гарадской дзіцячай паліклінікі Ірыны РЫЖКОВАЙ**, эфектыўнасць прышчэпак узрастае ў тых калектывах, дзе імі ахоплены не менш за 40 працэнтаў. Той, хто не абгрунтавана адмаўляецца ад вакцынацыі, можа нанесці шкоду не толькі сабе, але і навакольным.

Наогул вакцынацыя закліканая не толькі зніжаць уласна захваральнасць на грып, але і змяншаць колькасць ускладненняў, выкліканых апошнім. Ускладненні ж часцей за ўсё ўзнікаюць у тых, хто пакутуе ад хранічных хваробаў дыхальнай, сардэчна-сасудзістай, эндакрыннай сістэм, нырак. У групе рызыкі і асобы ва ўзросце пасля 65.

Статыстыка сведчыць, што сярод сталых асобаў, прышчэпленых супраць грыпу, рызыка развіцця пнеўманіі — самага частага ўскладнення — і неабходнасць у шпіталізацыі зніжаецца адпаведна на 53 і 50 працэнтаў, а смяротнасць — амаль на 70. Захваральнасць жа на грып сярод тых, хто прышчэпліваецца, зніжаецца дзесьці ў 1,5-3,5 раза.

— Сучасныя вакцыны дазваляюць бяспечна вакцынаваць пацыентаў з цяжкімі захворваннямі, — кажа Ірына Васільеўна. — Вакцыны цяпер — высокаачышчаныя, адаптаваныя. Для іх вытворчасці выкарыстоўваюць розныя тэхналогіі. Таму шэраг вакцын — «Грыпол», «Ваксігрып», «Флюарыкс» могуць прымяняцца для імунізацыі цяжарных на другім і трэцім трыместрах. Нежывымі вакцынамі могуць прышчэплівацца і мамы, якія выкормліваюць дзіця грудным малаком. Спліт-вакцыны прызначаны для асобаў з імунадэфіцытам, якія атрымліваюць гарманальную тэрапію... Дарэчы, за перыяд рэалізацыі праграмы па імунапрафілактыцы грыпу з 2002 года ў Беларусі зарэгістравана толькі адно ўскладненне пасля прышчэпкі — ацёк Квінке, які не адбіўся на далейшым стане здароўя прышчэпленага. Вакцына можа ўводзіцца як з дапамогай ін'екцыі, так і ў выглядзе спрэя ў нос. Від вакцыны выбірае ўрач, які ўлічвае індывідуальныя асаблівасці чалавека...

Неабходна ведаць, што ўвядзенне ў арганізм вакцыны выклікае запуск цэлага комплексу імуналагічных рэакцый, скіраваных на абарону арганізма. Таму на працягу некалькіх дзён можа назірацца павышэнне тэмпературы, ушчыльненне і хваравітасць у месцы ін'екцыі, што не варта расцэньваць як неэфектыўнасць праведзенай маніпуляцыі.

— Вядомыя тры варыянты вірусаў грыпу — А, В і С, — тлумачыць **урач-педыятр 2-й Мінскай гарадской дзіцячай паліклінікі Галіна ХАЛЕЦКАЯ**. — Пандэмічнае распаўсюджанне мае толькі вірус А. Вірус В выклікае больш абмежаваныя эпідэміі, С — спарадычныя захворванні. Імклівыя эпідэміі грыпу ўзнікаюць у перыяд з лістапада па люты і ахопліваюць ад 6—8 да 30—35 працэнтаў насельніцтва горада на працягу 3-4 тыдняў, краіны — 1-2 месяцаў і паўшар'я — 2-3 месяцаў. Перадача віруса адбываецца падчас размовы, кашлі, чханні. 90 працэнтаў тых, хто хварэе на грып, — гэта дзеці...

Пачынаецца грып востра, праз некалькі гадзін ці 1-2 дзён пасля заражэння. Праяўляецца павышэннем тэмпературы да 39—40 градусаў. Праз дзень-два яна зніжаецца. Часам можа назірацца другі кароткі ўздым тэмпературы яшчэ на 1-2 дні. Акрамя таго, хворы пакутуе ад закладзенага носу, набухання слізістых, сухога кашлю. У такім стане неабходна абавязкова заставацца дома.

Для таго, каб папярэдзіць захворванне, нельга забывацца на шэраг простых мерапрыемстваў. Загартоўка, дастатковы сон, спакой, адпачынак, заняткі фізкультурай забяспечаць зладжаную работу ўсіх сістэм арганізма. У рацыён харчавання варта ўключаць зялёны чай, лімон, цыбулю, часнок, фрукты. Неабходна рэгулярна праветрываць кватэру, памяшканні па месцы працы ці вучобы.

Як толькі вы адчулі першыя прыкметы прастуды, застаньцеся дома. Не прымайце аспірын, паколькі ён можа спрыяць узнікненню такога цяжкага ўскладнення, як сіндром Рэйе, пры якім сур'ёзна церпяць ныркі. Не забудзьцеся пра гарбату з мятай, рамонкам, чаборам, шыпшынай. Можна скарыстацца лекавымі сродкамі на аснове траў — настойкамі элеўтэракоку, жэньшэню, заманіхі, а таксама вітаміннымі комплексамі з мікраэлементамі, якія варта перамяжоўваць з антыаксідантным комплексам. Працягласць курсу — па адным месяцы.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Здароўе на талерцы

ЦАРЫЦА БАЛОТАЎ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Восень — сезон журавін. Паспяваюць яны ў верасні—кастрычніку, а збіраць іх лепш пасля першых замаразкаў, а можна і ранняй вясной, калі растае снег.

У старой Еўропе лічылася, што журавіны — рускія ягады. Трэба меркаваць, што такая думка ўзнікла дзякуючы актыўнасці рускіх купцоў, якія вазілі журавіны на продаж у еўрапейскія краіны, насельніцтва якіх менш схільнае да збірання. Насамрэч, журавіны — ягады інтэрнацыянальныя і растуць у многіх мясцінах, калі дазваляюць умовы. А любяць яны балоцістую глебу, тундравыя і мохавыя балоты.

Журавіны ўтрымліваюць цэлы комплекс карысных для чалавека рэчываў: цукры (глюкоза, фруктоза, цукроза), арганічныя кіслоты (лімонная, бензойная, хінная, яблычная і інш.), пекціны, вітаміны (С, B_1, B_2, B_5, B_6, РР, K_1), флаваноіды, а таксама макра- і мікраэлементы (калій, фосфар, кальцый, жалеза, марганец, малібдэн, медзь, цынк і інш.).

ГАЮЧЫЯ ЎЛАСЦІВАСЦІ ЖУРАВІН

● аказваюць мачагоннае дзеянне, таму рэкамендуюцца да ўжывання пры захворваннях нырак і мачавых шляхоў;

● прымяняюцца як бактэрыцыдны і гарачкапаніжальны сродак;

● узбуджаюць дзейнасць стрававальных залозаў, паляпшаюць апетыт, садзейнічаюць страваванню;

● дзякуючы высокаму ўтрыманню ў іх вітамінаў Р-групы, гэтыя ягады добра зарэкамендавалі сябе пры лячэнні гіпертаніі, атэрасклерозу, рэўматызму;

● у якасці вітаміннай падтрымкі ўжываюцца падчас лекавага галадання;

● як танізавальны сродак прымяняецца журавінавы сок, разведзены з вадой (таксама яго можна спалучаць з настоем шыпшыны).

Увага! *Журавіны супрацьпаказаны пры язвавай хваробе страўніка і дванаццаціперснай кішкі, пры гастрыце з павышанай кіслотнасцю, пры хворай печані.*

Морс з журавінаў (класічны рэцэпт прыгатавання)

1 шклянку ягад размяць драўлянай лыжкай, адціснуць сок; макуху заліць літрам вады, давесці да кіпення і працадзіць; злучыць сок і адвар, дадаць 1 ст. лыжку мёду і ахаладзіць.

МОЧАНЫЯ ЖУРАВІНЫ

На 1 літр вады бяруць 4 ст. лыжкі цукру, 0,5 ч. лыжкі солі, 3-4 гарошыны духмянага перцу, 3-4 бутоны гваздзікі.

Перабраныя і старанна прамытыя ягады высыпаць у падрыхтаваную пасудзіну і заліць ахалоджанай заліўкай. Зверху накрыць тканінай і пакласці цяжар. Трымаць 6—10 дзён пры пакаёвай тэмпературы, каб актывізаваць працэс браджэння; затым перанесці ў халаднаватае месца. Праз 25—30 дзён мочаныя ягады гатовыя да ўжывання. Выкарыстоўваюць іх як гарнір да мясных ці рыбных страў, як дабаўку ў вінегрэты і салаты.

САЛАТА З ЯБЛЫКАЎ, ЖУРАВІН І ВІНАГРАДУ

Яблыкі (250 г) нарэзаць кубікамі. Журавіны (50 г) прабланшыраваць, змяшаць з яблыкамі, маянэзам (80 г), лімонным сокам і мёдам. Выкласці горкай на зялёнае лісце салаты і ўпрыгожыць вінаградам (200 г).

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Лечымся без лекаў

ПА ГІПАТАНІІ — ЗАРАДКАЙ!

Утой час, як большая палова чалавецтва змагаецца з павышаным ціскам, астатняя частка спрабуе справіцца з адваротнай немаччу — гіпатаніяй. Гэта стан чалавека, які суправаджаецца нізкім артэрыяльным ціскам, што садзейнічае слабаму кровазабеспячэнню галаўнога мозга. Немач праяўляецца слабасцю, вяласцю, галавакружэннем, апатыяй, пагаршэннем памяці, няўважлівасцю, паніжанай працаздольнасцю.

Як жа змагацца з нізкім ціскам?

Пры гіпатаніі проста неабходныя **штодзённыя заняткі спортам**. Яны павышаюць тонус сасудаў, узмацняюць кровазварот, пазітыўна ўплываюць на работу сэрца. Комплекс практыкаванняў, рэкамендаваны пры гэтай немачы, трэба выконваць вельмі плаўна, без «рыўкоў». Як правіла, гіпатонікі адчуваюць сябе горш у першай палове дня, асабліва адразу пасля абуджэння, таму фіззарадкай лепш займацца пасля паўдня, бліжэй да вечара. Неабходна памятаць, што эфект ад практыкаванняў наступіць праз 7—10 дзён рэгулярных заняткаў.

Самыя простыя практыкаванні робяцца ў становішчы «лежачы на спіне»:

● Выконваць скрыжоўванне рук, ног («нажніцы»).

● Плаўна падымаць і апускаць рукі ў бакі, можна з цяжарам (напрыклад, кнігі).

● Баксіраваць рукамі паветра.

● Рукі падняць уверх і рэзка «выпусціць» іх. А потым рукі падняць і трымаць іх у такім становішчы да знямення і зноў «выпусціць». Такое ж практыкаванне можна рабіць з нагамі.

● Калені падцягніце да жывата, абхапіце іх рукамі. Цяпер сцісніце з усіх сілаў, спрабуючы расчапіць рукі.

Пры гіпатаніі важна захоўваць **рэжым харчавання**. Ні ў якім разе нельга пераядаць, лепш есці ў 5-6 прыёмаў, невялікімі порцыямі, пажадана ў адзін і той жа час. Выключыце з рацыёну вострыя і вэнджаныя стравы. Гіпатонікам рэкамендуецца аддаваць перавагу малочна-раслінная ежы (агародніне, садавіне, тварагу, сыру і г.д.).

Тыя, хто пакутуе ад нізкага ціску, пачынаюць дзень з кубачка кавы, і гэта нармальна. Але не забудзьцеся да кавы дадаць бутэрброд або сырны дэсерт. Павышэнню ціску садзейнічаюць салёныя і тлустыя прадукты, а сыр — ідэальны па суадносінах тлушчу і солі. Таму кубачак кавы з сырным бутэрбродам — гэта амаль лекавая працэдура для хворага на гіпатанію чалавека.

Не забывайце і пра **паўнацэнны сон**. Многія лічаць гіпатонікаў «сонямі». Але 9—11 гадзін сну — норма для іх. Сон — гэта ахоўная рэакцыя арганізма. Не будзіце іх.

Трэба навучыцца правільна ўставаць з ложка, інакш вы можаце страціць прытомнасць. Прачнуўшыся, варта крыху паляжаць у пасцелі, потым сесці, некаторы час пасядзець, не звешваючы ногі; пасля апусціць ногі і пасядзець у такім становішчы.

Раніцай вельмі карысны **кантрасны душ**. Але пераходы ад цяпла да холаду не павінны быць рэзкімі.

Добра нармалізуюць артэрыяльны ціск **ванны з чаборам** (500 г сыравіны на поўную ванну). Прымаць ванну па 5—20 хвілін штодзень або праз дзень. Курс 10—15 працэдур.

Народная медыцына рэкамендуе пры гіпатаніі прымаць адвары лопуху аптэчнага, базіліку, бярозавага лісця, дзівасілу, кветак крывавуніку, травы вербены лекавай, шалфею мускатнага, святаянніку (зверабою). А вось ранішні кубак кавы паспрабуйце замяніць шклянкай настою чайнага грыба з 1 ст. лыжкай мёду, 20 кроплямі настойкі залатога кораня ці араліі.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сам сабе псіхолаг

5 КАРЫСНЫХ ЯКАСЦЯЎ ДЛЯ КІРАЎНІКОЎ

Аб прасоўванні па службовай лесвіцы мараць усе. Але далёка не ўсе валодаюць неабходнымі для гэтага якасцямі. Праверце сябе і, калі якойсьці з пералічаных ніжэй рысаў вам не хапае, не засмучайцеся — ім таксама можна навучыцца.

Уменне хутка прымаць рашэнні. Не бывае бязвольных начальнікаў. Безумоўна, можна параіцца з калектывам. Але не заўсёды на гэта знаходзіцца час і не заўсёды калектыў здольны адэкватна ацаніць сітуацыю. Калі ўнутры вас сядзіць «чарвяк сумнення», яго трэба выкараніць, як паразіта.

Камунікабельнасць. Калі вы станеце вялікім начальнікам, у вас будзе права быць нешматслоўным, а для кагосьці нават маладаступным. Але прасоўванне да запаветнага крэсла патрабуе таварыскасці, абаяння і ветлівасці.

Шчырасць. Рэдкія чуткі і плёткі не становяцца здабыткам калектыву. Ужо лепш выказаць усё, што вы думаеце пра чалавека, у вочы. Калі вы аматар «перамыць костачкі», ад гэтай якасці неабходна пазбавіцца.

Гнуткасць. Усім добры не будзеш. Калі вы дробная сошка, можаце спакойна прасядзець у сваім кутку, звёўшы кантакт з непрыемнымі вам людзьмі да мінімуму. Як толькі вы становіцеся кіраўніком — вам не даводзіцца выбіраць, з кім падтрымліваць адносіны, а з кім не. Вы павінны навучыцца лавіраваць, умець дамаўляцца з асабістымі ворагамі і прымірацьбакі, якія канфліктуюць.

Сабранасць. Якасць, аб вартасцях якой разважаць залішне. Вы проста павінны быць сабранымі, чаго б гэта ні каштавала.

КРЭДЫТАМАНІЯ — НОВАЯ ХВАРОБА?

Не так даўно з'явілася новая псіхалагічная залежнасць — крэдытаманія. Яна ўжо стала на адзін узровень з гульняманіяй. Недасведчанасць людзей у фінансавых пытаннях можа прывесці да сумных наступстваў.

Стаўшы даступнымі, крэдыты пачалі «зацягваць» людзей. Нярэдка чалавек, нават не маючы грошай, бярэ крэдыт, спадзеючыся як-небудзь расплаціцца ў будучыні. І нават перспектыва «апынуцца на самым дне» не спыняе людзей, і яны асуджваюць сябе на практычна пажыццёвую выплату.

Калі правесці паралелі паміж гульняманіяй і крэдытаманіяй, можна знайсці падабенства. Гулец разважае: цяпер я не выйграў — выйграю ў наступны раз. Тое ж самае ў выпадку з крэдытам: калі я тут не магу расплаціцца, вазьму другі крэдыт — закрыю першы, потым вазьму трэці — і гэтак далей.

Вось так чалавек насуперак усім аргументам цвяразага сэнсу спрабуе вырашыць свае праблемы з дапамогай пазыковых грошай. Паддаўшыся адзін раз, чалавек не зможа ўтрымацца і ў наступны. Гэта зацягвае. Але самае сумнае, што чалавек заходзіць у глухі тупік — без грошай, без нічога, затое з мноствам рэчаў, якія набытыя ў крэдыт і за якія ён не можа і не зможа заплаціць. Такія псіхалагічныя праблемы, як правіла, пераходзяць у дэпрэсію. Часам даўжнікі, якія адчаяліся, скарыстоўваюць крайнюю меру — суіцыд.

Дзе ж выйсце? Галоўнае тут — не пераацэньваць сваіх магчымасцяў. Не варта браць, калі сумняваешся, што пацягнеш крэдыт. Калі вы ўсё ж вырашылі ўзяць крэдыт, вам абавязкова трэба прадумаць стратэгію вяртання грошай без урону для асабістага ці сямейнага бюджэту, падлічыць, якая сума ідзе кожны месяц на выдаткі, без якіх не абысціся (ежу, камунальныя паслугі, транспарт і г.д.), і якую частку даходаў «з'есць» плацеж па крэдыце.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Прафілактыка

Даймае пякотка? Ешце водарасці!

Па любых крытэрыях, стрававальныя сокі — рэч неапетытная. Страўнік заўсёды напоўнены едкім кактэйлем з салянай кіслаты, ферментаў і іншых рэчываў, якія растваряюць і расшчапляюць праглынутую намі ежу. Сам гэты орган абаронены ад грымучай сумесі слізістай абалонкай, якая пакрывае яго знутры. Але часам па тых ці іншых прычынах кіслае змесціва страўніка «закідваецца» ў стрававод (трубку, якая звязана з ротавай поласцю), раздражняе яго сценкі і выклікае пякотку. Многія з нас тушаць гэты «агонь у грудзях» антацыднымі прэпаратамі. Аднак лепш не чакаць, калі арганізм папросіць дапамогі, а паспрабаваць папярэдзіць з'яўленне пякоткі, выконваючы наступныя рэкамендацыі гастраэнтэролагаў.

Змагайцеся з лішняй кіслатой. Найноўшы спосаб прафілактыкі пякоткі звязаны з безрэцэптурнымі сродкамі, якія раней адпускаліся па прызначэнні доктара. Як няцяжка здагадацца, гэтыя прэпараты падаўляюць здольнасць страўніка выпрацоўваць кіслату (тады як антацыды нейтралізуюць тую, якая ўжо выдзелілася). Калі прымаць іх згодна з інструкцыяй не больш як два тыдні, яны эфектыўныя і цалкам бяспечныя.

Цяжарным жанчынам, дзецям, людзям, якія пакутуюць ад язвы і хваробаў нырак, неабходна пракансультавацца з урачом наконт прыёму гэтых сродкаў. Акрамя таго, уважліва чытайце ў інструкцыі раздзел аб лекавых узаемадзеяннях, калі вы прымаеце іншыя лекавыя прэпараты.

Не ўжывайце прадукты-правакатары. Адны прадукты расслабляюць колцавую мышцу (сфінктар) у ніжнім канцы стрававода, дазваляючы прасочвацца ў яго страўнікавай кіслаце. Другія стымулююць яе залішняе ўтварэнне. Трэція самі па сабе кіслыя. Калі вы схільныя да пякоткі, выключце: спіртное, газіроўку, шакалад і кафеін (і ўсё, што іх утрымлівае), цытрусавыя, кіслыя яблыкі, тлустую ежу, часнок і цыбулю, мяту ў любым выглядзе (жвачка, ледзянцы), вострыя прыправы, таматы, кіслыя яблыкі, кефір, чорны хлеб.

Ешце водарасці. Гэта непрывычная для нас ежа, як і ўсім вядомая марская капуста, змяшчае слізістыя рэчывы, якія звязваюць страўнікавую кіслату. Трэба проста шаткаваць водарасці і дадаваць іх у супы, салаты або тушаныя стравы.

Увага! Калі вы адчувальныя да натрыю або ў вас павышаны крывяны ціск, вымочвайце і прамывайце водарасці перад ужываннем.

Запівайце. Вада змывае кіслату, якая трапіла ў стрававод, і разбаўляе тую, што «плёскаецца» ў страўніку.

Звядзіце рызыку да мінімуму. Чым больш з'елі, тым вышэйшая верагоднасць з'яўлення пякоткі. Таму лепш есці малымі порцыямі, але часцей.

Аслабце ціск. Усё, што сцісне на жывот пасля сытнага абеду, можа выштурхнуць кіслату са страўніка ў стрававод. Калі, скажам, збіраецеся паласавацца за святочным сталом, загадзя адзеньцеся больш свабодна. Не займайцеся фізкультурай і не падымайце цяжар як мінімум дзве (а лепш тры) гадзіны пасля такой трапезы.

Не ператраўлівайце ежу лежачы. Калі ў найбліжэйшыя дзве гадзіны пасля яды прылегчы, верагоднасць з'яўлення пякоткі павялічыцца. Калі тулава знаходзіцца ў гарызантальным становішчы, кіслаце лягчэй пранікнуць са страўніка ў стрававод. Памятайце пра гэта правіла, плануючы познюю вячэру.

Гуляйце пасля яды. Няспешная хада «ўтрамбоўвае» ежу ў страўніку, прымушаючы кіслату заставацца там, дзе ёй належыць быць.

Кіньце курыць. Калі вам мала іншых прычын, каб расстацца з цыгарэтамі, ведайце: курэнне падаўляе слінавыдзяленне, стымулюе ўтварэнне кіслаты ў страўніку і расслабляе сфінктар. Усё гэта — прычыны пякоткі.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

НАС НЕ ЗЛОМІШ!

Па нейкай дзіўнай прыхамаці астэапароз часцей «выбірае» блакітнавокіх бландзінак. Але і астатнім не варта расслабляцца!

Астэапароз — прагрэсуючае захворванне касцявой тканкі, пры якой косці страчваюць кальцый, а разам з ім трываласць. Яны становяцца асабліва крохкімі і ломкімі, нібы старадаўні фарфор. Дастаткова падвярнуць нагу ці няёмка ўпасці — і адразу пералом. З-за чаго ж узнікае астэапароз і як з ім змагацца?

Пасля таго як рост шкілета спыняецца, нам здаецца, што з ім ужо нічога не адбываецца. Насамрэч на працягу ўсяго нашага жыцця ідзе працэс абнаўлення — разбурэнне старой і ўтварэнне новай косці. Найбольшай моцы косці дасягаюць да 25—30 гадоў. Пасля 30 касцявая маса пачынае паціхеньку змяншацца. У норме гэты працэс натуральны і вельмі марудны. Праблемы ж пачынаюцца, калі з-за нейкіх прычын ён паскараецца.

Астэапароз называюць «жаночай» немаччу. Бо часцей за ўсё яго ахвярамі аказваюцца менавіта прадстаўніцы цудоўнага полу. Асабліва да яго схільныя худзенькія бландзінкі невялікага росту, са светлай скурай і блакітнымі вачыма. Сярод іншых «улюбёнцаў» астэапарозу курцы і людзі, якія злоўжываюць кавай і алкаголем. Акрамя гэтага, развіццё немачы могуць правакаваць позні пачатак менструацыі (або яе адсутнасць), цяжарнасць, менапаўза, дэфіцыт кальцыю і вітаміну D, маларухомы лад жыцця. Да таго ж астэапароз нярэдка перадаецца ў спадчыну — ад маці дачцэ. Сучасныя даследаванні паказалі, што, калі жанчына падчас цяжарнасці недаатрымлівае кальцыю і вітаміну D, дзіця (асабліва дзяўчынка) нараджаецца ўжо з дэфіцытам касцявой масы каля 10 %.

Астэапароз каварны тым, што доўгі час можа ніяк сябе не праяўляць. «Першымі званочкамі» з'яўляюцца ломкасць пазногцяў, змяненне выгляду зубоў (апошнія становяцца па краях як быццам паўпразрыстымі). І яшчэ. На пачатковых стадыях гэта захворванне можа «маскіравацца» пад астэахандроз. У гэтым выпадку чалавека непакоіць цягнучы боль у спіне (асабліва падчас доўгага стаяння).

«Сігналам трывогі» таксама могуць быць начныя сутаргі ў галёнках і ступнях, боль у касцях, у паясніцы, «удовін горб» — скрыўленне пазваночніка наперад, змяншэнне росту (на 2—3 см за год), дачаснае пасівенне.

Калі вы выявілі ў сябе гэтыя сімптомы, пачынайце дзейнічаць! Дакладна даведацца аб стане касцей дапаможа спецыяльнае даследаванне — дэнсітаметрыя (вымярэнне мінеральнай шчыльнасці касцявой тканкі ўльтрагукавым спосабам). Толькі не зацягвайце з візітам да доктара! Дабіцца поўнага спынення страты касцявой масы, на жаль, немагчыма. Але цалкам рэальна гэты працэс затармазіць і не даць хваробе прагрэсаваць.

І памятайце: лепшае лячэнне — гэта прафілактыка. Галоўнае ў ёй — паўнацэннае харчаванне з дастатковым ужываннем прадуктаў, багатых на кальцый і вітамін D. Кальцый змяшчаюць малако і кісламалочныя прадукты, зяленіва (салата, пятрушка, кроп, сельдэрэй, брокалі), фасоля, грэчка, соя, кунжут, халва. Але для засваення арганізмам гэтага элемента патрэбен вітамін D. Апошні прысутнічае ў сметанковым масле, рыбіным тлушчы, яечным жаўтку, марской рыбе. А асноўны яго «пастаўшчык» — сонца, якое садзейнічае выпрацоўцы вітаміну D у арганізме.

Адмоўцеся ад курэння, не злоўжывайце алкаголем, кавай, соллю — усё гэта адмоўна ўплывае на абмен рэчываў. І пабольш рухаў! Аэробіка, бег трушком, тэніс, проста пешыя прагулкі дапамогуць вам умацаваць косці.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

У ПАЖЫЛЫХ МІНЧАН ЁСЦЬ СВАЯ ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ЛІНІЯ

Свой дзесяцігадовы юбілей адзначыць 1 кастрычніка, у Дзень пажылых людзей, Мінскі гарадскі геронтычны цэнтр.

У 1999 годзе ён стаў першай установай у краіне, якая аказвала спецыялізаваную кансультатыўную дапамогу пажылым людзям па прафілактыцы заўчаснага старэння, працаўладкаванні і рэабілітацыі, а таксама спрыяла ўчастковым урачам і «вузкім» спецыялістам, якія абслугоўваюць немаладых пацыентаў у паліклініках. Асаблівая ўвага надавалася ўзаемадзеянню з органамі сацыяльнай абароны і грамадскімі арганізацыямі. Цэнтр стаў падмуркам для стварэння геронтычнай службы і ў сталіцы, і ўвогуле ў краіне. Сёння медыцынская дапамога пажылому насельніцтву аказваецца ў Мінску ў 35 амбулаторна-паліклінічных установах, дзе працуюць урачы-геронтры на штатнай ці функцыянальнай аснове, у сталіцы адчынены таксама 26 геронтычных кабінетаў. Толькі за першае паўгоддзе 2009 года ўрачамі-геронтрамі было прынята звыш 58 тысяч пацыентаў «ва ўзросце» і зроблена больш як чатыры сотні актыўных візітаў. Ва ўсіх лячэбных установах горада арганізаваныя «Школы здароўя трэцяга ўзросту», у якіх прайшлі навучанне ўжо больш як 10 тысяч чалавек.

За 6 сёлетніх месяцаў у Мінскім гарадскім геронтрычным цэнтры, які размешчаны на базе 14-й цэнтральнай раённай паліклінікі, былі пракансультаваныя звыш 1300 пацыентаў немаладога ўзросту. А на прыём да псіхолага звярнуліся больш як 850 чалавек. Дарэчы, па ініцыятыве супрацоўнікаў гарадскога геронтычнага цэнтра ў сталіцы шмат гадоў паспяхова працуе тэлефонная інфармацыйная лінія для тлумачэння медыцынскіх пытанняў людзям «ва ўзросце». Вырашыць свае праблемы можна патэлефанаваўшы **па нумары 299 58 15**. У першым паўгоддзі на інфармацыйную лінію звярнуліся 560 мінчан.

«МЯККАЕ» ВЫРАШЭННЕ МУЖЧЫНСКІХ ПРАБЛЕМ

Як паведамляе ВВС, амерыканскія навукоўцы збіраюцца прапанаваць мужчынам з праблемамі ў сэксуальным жыцці крэм для лячэння эрэктыльнай дысфункцыі. Яго дзейснае рэчыва адносіцца да той жа групы лекаў, што і добра вядомая ўсім «Віягра», аднак мясцовае прымяненне крэму павінна зменшыць рызыку такіх пабочных эфектаў, як галаўны боль, расстройствы страўніка і парушэнні зроку. Акрамя таго, «Віягра» супрацьпаказаная людзям з цяжкімі захворваннямі сардэчна-сасудзістай сістэмы.

Каб папярэдзіць пабочныя эфекты, даследчыкі вырашылі «ўпакаваць» дзейснае рэчыва ў наначасцінкі, якія лёгка пранікаюць скрозь скуру, і зрабілі на іх аснове крэм. У склад эксперыментальнага прэпарата ўвайшлі тадалафіл, сіяларфін (новае лякарства ад імпатэнцыі) і аксід азоту, неабходны для напаўнення пяшчэрыстых целаў крывёй.

Невялікае пілотнае даследаванне было праведзена на 18 пацуках з генетычна абумоўленай эрэктыльнай дысфункцыяй. У адзінаццаці, якія атрымалі эксперыментальны прэпарат, наступіла яўнае паляпшэнне, а ў астатніх сямі, якія атрымалі пустыя наначасцінкі, нічога не змянілася. Як сцвярджаюць даследчыкі, эфект ад прымянення крэму наступаў на працягу некалькіх хвілін, што адпавядае патрэбам людзей з эрэктыльнай дысфункцыяй. А дзеянне аналагічных прэпаратаў у таблетках пачынаецца толькі праз 30—60 хвілін. Для вывядзення новага лякарства на рынак трэба праверыць яго на эфектыўнасць і бяспечнасць у больш маштабных эксперыментах на жывёлінах, а затым — і на добраахвотніках з ліку людзей. Таму ў аптэках яно можа з'явіцца не раней чым праз некалькі гадоў.

УДЗЯЧНЫХ ПАЦЫЕНТАЎ ПРОСЯЦЬ ЗАЙСЦІ... У КАСУ

Міністр аховы здароўя Казахстана Жаксылык Даскаліеў прапанаваў арганізаваць у лячэбных установах легальныя «касы для ўдзячных пацыентаў». У казахстанскім Міністэрстве аховы здароўя даўно шукаюць спосабы барацьбы з карупцыяй у падведамасных установах.

На думку міністра, легалізацыя грашовых удзячнасцяў застрахуе медыкаў, якія рызыкуюць сваёй свабодай за некалькі тысяч тэнге (10—20 долараў). «Гэты механізм — самы антыкарупцыйны. Здараецца, што ўдзячнасць перапаўняе цябе і хочацца аддзякаваць ўрачоў. Сам ведаю, унук нядаўна нарадзіўся, і я адчуў такое жаданне», — прызнаўся міністр. Згодна з яго прапановай, грашовыя сумы пацыенты будуць перадаваць у спецыялізаваную цэнтралізаваную касу лячэбнай установы. З гэтай касы будуць ажыццяўляцца падатковыя адлічэнні і выдзяляцца прэміі медыкам, якія гэта заслужылі. Кіраўнік медыцынскай галіны збіраецца вынесці сваю прапанову на абмеркаванне ў рэгіёнах, і, калі тая знойдзе падтрымку, усур'ёз падумаць над укараненнем новаўвядзення.

Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.

Да ведама

«РЫБА БЕЛАРУСІ. УРАДЖАЙ 2009»

Пад такой назвай 3 кастрычніка ў сталіцы на пляцоўцы каля Палаца спорту пройдзе грандыёзны кірмаш па продажы рыбнай прадукцыі.

Як удакладнілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзеле па забеспячэнні і збыце дзяржаўнага вытворчага аб'яднання «Белмеліявадгас», у працы кірмашу возьмуць удзел усе рыбгасы Беларусі. Нагадаем, у нашай краіне працуе 19 рыбаводчых гаспадарак. Яны выставяць поўны асартымент сажалкавай і азёрнарачной рыбы. Пакупнікі змогуць набыць карпа, шчупака, ляшча, плотку, карася, таўсталобіка, сома, белага амура, фарэль, асятра, сцерлядзь, судака, а таксама гатовую рыбапрадукцыю. Абяцаюць, што цэны на рыбу будуць ад вытворцаў, гэта значыць, са зніжкай 5—10 працэнтаў у залежнасці ад віду прадукцыі і канкрэтнага рыбгаса. Наведвальнікаў кірмашу чакаюць таксама юшка і бараніна з рыбы, выступленні калектываў народнай творчасці, дзіцячая праграма, рыбная латарэя. Адначасова міні-кірмашы па продажы рыбнай прадукцыі пройдуць у Фрунзенскім, Партызанскім, Маскоўскім, Заводскім і Кастрычніцкім раёнах сталіцы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ДА ГУТАРКІ ПРЫ ЎЛАДКАВАННІ НА ПРАЦУ РЫХТУЙЦЕСЯ ЗАГАДЗЯ

Гутаркі аб прыёме на працу ў параўнанні з дакрызісным перыядам становяцца ў сталіцы ўсё больш жорсткімі. Гэтым меркаваннем падзялілася загадчыца сектара прафарыентацыі аддзела прафнавучання і прафарыентацыі ўпраўлення занятасці насельніцтва Камітэта па працы, занятасці і сацабароне Мінгарвыканкама Святлана Савіна.

Як расказваюць супрацоўнікам службы занятасці сушукальнікі, гутаркі ў прыватных кампаніях нярэдка чымсьці нагадваюць перакрыжаваны допыт. Здараецца, прэтэндэнта прапускаюць праз ланцужок памочнікаў. Скрозь такое сіта бывае складана прайсці чалавеку, псіхічна да гэтага непадрыхтаванаму. Варта быць гатовым да таго, што могуць спытаць не толькі, на які заробак вы прэтэндуеце, але і чаму, і нават: якія ў вас недахопы? Акрамя таго, наймальнікі ўсё часцей збіраюць пра сушукальнікаў так званае інтэрнэт-дасье.

На думку Святланы Савінай, тым, хто хоча атрымаць працу, варта загадзя прадумваць адказы на складаныя пытанні і авалодваць уменнем складаць рэзюме і самапрэзентацыі.

Ніна ЯНОВІЧ, «Мінск—Навіны».

МАНАСТЫРСКІ МЁД

АБРЫСЫ АЙЧЫНЫ

Час медазбору ўжо скончыўся, лічаць у Пустынках, і «труднікі» звозяць з пляцовак вуллі на зімовае захоўванне на колішняй калгаснай ферме. Мо таму і ўзяў у рукі іераманах Герасім пераносную газонакасілку, каб развітацца з пажухлым травастоем. Але, хутчэй, для падтрымання элементарнага парадку — штодня праз манастыр праходзяць дзясяткі, а ў выхадныя і сотні людзей. Нягледзячы на тое, што манастыр яшчэ ў паўразбураным стане і ў манастыры адны мужчыны, тым не менш клапатлівая гаспадарская рука павінна адчувацца на кожным кроку. Таму на пустынкаўскай тэрыторыі і восеньскія кветачкі красуюць абапал асфальтаванай дарогі, і ззяюць чырвоныя яблыкі маладога саду, і пафарбаваныя фасады свецяцца ружова-белымі колерамі.

Наогул, манастырская эклектыка сучасных Пустынак надзвычай цікавая. Варта было б мастакам не ўпусціць гэты момант. Высокая, вернутая з небыцця званіца рэзка кантрастуе з непадуладным рэстаўрацыі Успенскім саборам, а колішняя земляробчая школа, у якой цяпер знаходзяць часовы прыстанак пілігрымы і ў адным з пакояў з'явіўся нерукатворны лік Збаўцы, сваім адноўленым выглядам робіць выклік рэшткам Пакроўскага храма. Але гэткі стан — пераходны, трансфармацыя рана ці позна адбудзецца і Пустынкі стануць падобнымі на тыя, якімі бачылі іх жыхары навакольных беларускіх і рускіх вёсак з Мсціслаўскага, Манастыршчынскага і Хіславіцкага раёнаў даваеннага часу.

Сёння ў Пустынках ужо ёсць поўнасцю адноўлены і завершаны крынічны архітэктурны ансамбль. Менавіта да яго імкнуцца паломнікі і экскурсанты — набраць вады, апусціцца ў купель, паставіць свечку ў Багародзіцкай царкве, пастаяць перад абразом. З гэтай царквы пачыналіся некалі (згодна з першымі звесткамі, у 1380 годзе) Пустынкі. Заснавальнікам манастыра лічыцца Мсціслаўскі князь Сімеон-Лугвеній. Захавалася легенда, якая сведчыць пра тое, што ва ўзросце 30 гадоў Лугвен ледзь не згубіў зрок. У сне яму ўбачыўся старац і параіў знайсці ў Пустыні крыніцу, памыць вочы. Князь паслаў ваяроў у лясныя нетры, і калі крынічка была адшуканая, некалькі разоў памыўся вадою з яе. Вернуты зрок дапамог князю ўбачыць на дрэве ззянне, якое ішло ад абразочка з выявай Божай Маці. На гэтым месцы Лугвен загадаў стварыць манастыр, а над крыніцай паставіў капліцу.

У царкве вядзецца кніга падзяк і водгукаў, сярод якіх ёсць сведчанні пра выздараўленне і нават шчаслівае мацярынства, атрыманае дзякуючы пустынкаўскай крыніцы. Запісаў ужо нямала, і пагалоска пра цудадзейнасць вады кожнага дня расце. Айцец Герасім, які ўзяўся правесці мяне па сакральных куточках, кажа, што крыніца б'е якраз у цэнтры храма пад падлогаю, і кожную раніцу а пятай гадзіне над ёю пачынаецца першая манастырская служба. Прыходзяць сюды тры святары, адзін манах, два паслушнікі. Сёлета спаўняецца пяць гадоў, як у Пустынках з'явіліся сталыя насельнікі — манахі, і пачаліся штодзённыя малітвы над крыніцаю. Дарэчы, пазней я наведаў Мсціслаўскую раённую санэпідэмстанцыю, каб спраўдзіць пагалоску наконт незвычайнасці хімічнага складу вады. Але там нічога новага мне не паведамілі, акрамя таго, што ўтрыманне нітратаў у крыніцы ў чатыры разы меншае за дапушчальную норму.

Іераманах параіў не заходзіць за сцены колішніх Успенскага і Пакроўскага храмаў, бо гэта зона высокай бяспекі. Нядаўна не вытрымаў і абрынуўся адзін са зводаў. Нездарма на цэгле напаўразбуранага будынка прымацавана папераджальная шыльдачка. Усе насельнікі Пустынкаўскага манастыра жывуць чаканнем пачатку рэстаўрацыі, бо, па словах айца Герасіма, праектная дакументацыя ўжо падрыхтаваная.

❑ «Манастырскі мёд гэткі ж, як і паўсюль», — тлумачыць манах-пчаляр іерадыякан Цярэнцій, падглядваючы апошні, яшчэ не звезены з поля вулей. Але ён, напэўна, не ведае, што ў некаторых рэгіёнах Беларусі з-за дажджлівага лета пчаляры засталіся наогул без мёду. А ў Пустынках з шасці пчаліных хатак у гэтым сезоне атрымана ажно дзвесце літраў — ліпавага, з канюшыны, з лугавога і ляснога разнатраўя мёду. Два гады манах (колішні жыхар Мінска) займаецца манастырскімі пчоламі, навучыўся правільна з імі абыходзіцца, своечасова перасаджваць, даставаць рамкі, уцяпляць, лавіць раі. Гэтаму яго навучыў мясцовы пчаляр Леанід Карнаухаў, які жыве на самым беларуска-рускім памежжы. Дарэчы, манастыр Пустынкі — апошні населены пункт Магілёўшчыны, у сотні метраў за ім пачынаецца Смаленская зямля. Таму манастырскі мёд у нейкім сэнсе інтэрнацыянальны. Напэўна, ад адной гэтай думкі ён здаецца больш духмяным і смачнейшым? На маё пытанне манах адказаў толькі ўсмешкаю.

Анатоль КЛЯШЧУК.
Фота аўтара.

Мсціслаўскі раён.

Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.

«ГРАЕМ СЯРЭДНЯВЕЧНЫ РОК»

Зміцер САСНОЎСКІ, лідар гурта «Стары Ольса»:

Адзін з найбольш яскравых прадстаўнікоў стылю «медыяваль» у Беларусі — гурт «Стары Ольса». Без гэтага калектыву цяпер цяжка ўявіць сабе айчынны музычны асяродак. Не пабачыўшы музыкаў, здаецца, што «ольсы» — гэткія прызнаныя мэтры ў паважным узросце. Першую частку сцвярджэння (наконт мэтраў) шмат у чым можна лічыць справядлівай, паколькі аўтарытэт у гурта вялікі. А наконт узросту выканаўцаў — яўнае перабольшванне. Ды і сам гурт (нягледзячы на назву) даволі малады — сёлета адзначае сваё 10-годдзе. Святкаваць будуць каля легендарнага Гальшанскага замка падчас вялікага фэсту, які пройдзе тут 3 кастрычніка. Чым парадуюць слухачоў музыкі, як адбываецца вяртанне музычнай спадчыны, дзе навучыцца граць на старадаўніх інструментах? Пра ўсё гэта і не толькі карэспандэнт «Звязды» распытаў у лідара гурта «Стары Ольса» Зміцера Сасноўскага.

«Вучыўся ў майстра як 500 гадоў таму»

— Зміцер, якім чынам прываблівае старадаўняя музыка?

— Насамрэч усё пайшло з калекцыі старадаўніх музычных інструментаў, якую я запачаткаваў дзесьці ў 1992-1993 гадах. Копіі тады можна было замовіць у нашых майстроў. У той час удзельнічаў у навуковых экспедыцыях. Я сам гісторык па адукацыі і, як усе, хто ўсур'ёз захапіўся вывучэннем мінуўшчыны, знайшоў свой напрамак для даследаванняў. Кагосьці паварочвае да пісьменнай гісторыі, кагосьці — да археалогіі, архітэктуры, мастацтва, этнаграфіі, фалькларыстыкі. Людзі захапляюцца рознымі відамі спадчыны, але я ў рэшце рэшт прыйшоў да высновы, што найбліжэй, найцікавей і больш эмацыйна дазваляе адчуць тую ці іншую эпоху толькі музыка. Вось я спачатку і збіраў калекцыю інструментаў, якія сам рэстаўраваў, вучыўся граць — па чарзе на кожным.

— Чуў, што давялося табе паспытаць ліха падчас навучання музычнай грамаце. Ці гэта проста байкі?

— Не, не байкі. Каб навучыцца граць на старадаўнім інструменце, давялося ісці да майстра і ў прамым сэнсе слова пакланіцца яму ў ножкі. Я калісьці так авалодваў гуслямі ў Латвіі. Сам не лайдак і люблю фізічна папрацаваць, але такіх вялізных мазалёў, як зарабіў тады, у мяне ніколі не было. Навучанне амаль нічым не адрознівалася ад таго, якое было 500 гадоў таму. Памятаеш адносіны паміж майстрам і вучнем у сярэднявечны? Вось так было і са мной — у майстэрню трапляў толькі пасля дня цяжкай працы па гаспадарцы, калі рукі ўжо амаль не рухаліся, ці падчас дажджоў. Мы рабілі ліры, свірэлі, аднак у першую чаргу — гуслі. Традыцыя цяпер выглядае дзікавата, але яна мае рацыю — пачынаеш цаніць веды, атрыманыя праз такія намаганні, і вопыт вельмі карысны.

— І гэты вопыт пасля спатрэбіўся?

— Так, я ж нядоўга граў «сам з сабою». Падабраліся паплечнікі і разам мы ўтварылі гурт. У першым складзе інструментаў былі дуда, барабан і колавая ліра. Спявалі і балады пад гуслі. Упершыню выступілі ў Полацку падчас Дня пісьменства. Праўда, гурт тады называўся па-іншаму — «Руявіт» (гэта бог вайны ў славянскай міфалогіі). Мы імкнуліся па максімуму сыграць аўтэнтычна гістарычную музыку — з гэтага эксперыменту ўсё і пачалося.

«Дрымба — выключна рыцарскі інструмент»

— Заўсёды было цікава даведацца: старадаўняя музыка, якая выконваецца цяпер, — гэта стылізацыя ці ўсё ж запраўднае вяртанне, магчымасць ушчыльную наблізіцца да колішняй культурнай спадчыны?

— Можна казаць пра тую ці іншую ступень набліжэння да аўтэнтычнага выканання, але не пра поўную рэканструкцыю гістарычнай спадчыны. Мы выконваем музыку Сярэднявечча, і цяпер няма самага важнага крытэрыю ацэнкі нашых намаганняў — чалавека таго часу. Толькі ён мог бы вызначыць, якім чынам усё атрымалася. Наблізіцца да аўтэнтычнасці дазваляюць нотныя матэрыялы тых часоў, даследаванні тагачаснай культуры, побыту, маралі. Ну і, вядома, непаўторнае гучанне даюць старадаўнія інструменты. Выкарыстоўваем лютні, цытры, рэбек, томбарын, барочныя флейты, шалмеі, жалейкі, дуды, гуслі, колавую ліру, барабаны, бразготкі, шаршуны. Захаваліся выявы інструментаў, таксама іх узоры знаходзяць падчас археалагічных раскопак (часцей гліняныя, радзей сустракаюцца і драўляныя).

— У асобных кампазіцыях «Старога Ольсы» можна пачуць і варган — інструмент, які ў многіх выклікае асацыяцыі з народамі Поўначы. А ў Беларусі ён адкуль?

— Варган, ці больш правільна па-беларуску дрымба, быў распаўсюджаны на тэрыторыі цяперашняй Беларусі толькі ў X—XI стагоддзях. Яго неаднаразова адшуквалі падчас раскопак. Але знаходзяць толькі ў пахаваннях тагачасных ваяроў, таму лічыцца, што гэта інструмент, які прыналежны толькі рыцарам. Дрымба разам з іншымі інструментамі стварае непаўторны каларыт даволі змрочнай музыкі ранняга сярэднявечча. Яно і зразумела — рыцары, якія ваявалі, не маглі спяваць выкшталцонымі высокімі фальцэтамі. Гэта абумоўлена цяжкасцямі побыту — холад, голад, раны, начныя пераправы, дазоры і г.д. У нас ёсць асобны альбом, дзе адмыслова сабрана менавіта вайсковая музыка, — пра рыцараў і саміх жа рыцараў. Там можна знайсці дзве малітвы — Багародзіцы, а таксама псалом «Манарху вечнэму». Апошні, дарэчы, спявала асабістая ахова Крыштафа Радзівіла Перуна, калі ішлі ў бой. Тэкст псалома захаваўся дзякуючы таму, што яго дакладна працытаваў адзін з рыцараў магнацкай світы Андрэй Рымша.

— Зміцер, апроч ваярскай музыкі з вашым удзелам ладзяцца і сярэднявечныя дыскатэкі. Гэта крок насустрач непадрыхтаванаму слухачу?

— Я так не ставіў бы пытанне. Гэта не спроба заваяваць такім чынам папулярнасць у слухачоў, а, перш за ўсё, — імкненне аднавіць колішні спосаб адпачынку. Сярэднявечная дыскатэка па сутнасці — гэта старая карчма. Што ні ў якім разе нельга лічыць прыстасаваннем старога пад новае. Мы нават на аднайменным дыску напісалі: сяредняве чная дыскатэка — форма адпачынку нашых продкаў пад сучасны назвай, якая спалучае ўсе прыкметы гэтага адпачынку. Ствараецца карчомная атмасфера, калі можна танчыць пад адпаведную музыку, выкананую на старадаўніх інструментах, піць піва. Так, гэта менавіта наяўнасць піва, паколькі моцны алкаголь у нас даволі позна з'явіўся і доўгі час выкарыстоўваўся выключна ў медыцынскіх мэтах. У шынках, корчмах былі піва і квас. Мы заклікаем людзей падчас адпачынку ўжываць толькі такія напоі. Паралельна з аднаўленнем музычнай спадчыны адраджаюцца і сярэднявечныя танцы. Людзі не толькі ўсё могуць пабачыць, але і навучыцца і пасля пусціцца ў скокі па ўсіх правілах.

«Адбываецца змена эмацыйнага музычнага фону»

— Ваярскія песні, сярэднявечная дыскатэка, камерная, духоўная музыка і шмат чаго яшчэ. Лягчэй, напэўна, пералічыць тыя кірункі, якія вы не асвойвалі. Куды рушыце ад першага альбома «Келіх кола» да апошняга «Дрыгула» (выйшаў не так даўно)?

— Крытыкі сур'ёзна вывучаюць нашу творчасць і надрукавалі шмат артыкулаў пра змяненне стылістыкі, кірункаў, нашых прыхільнасцяў. Насамрэч мы спачатку шмат самі пісалі «пад старое». Ствараліся музыку, імітуючы старадаўняе. А апошнім часам сутыкнуліся з такім аб'ёмам музычнай спадчыны, што пісаць нешта «ад сябе» стала проста блюзнерствам, непавагай да створанага нашымі продкамі. Мяркуй сам: з «Віленскага сшытка» сыгралі 7 мелодый, а з «Полацкага сшытка» — толькі 15 з 70. Гэта толькі адзін з прыкладаў. Ноты з Вялікага Княства Літоўскага сустракаюцца ва ўсіх архівах еўрапейскіх краін, не кажучы пра Маскву і Піцер. Таму ўвесь час адбываюцца новыя адкрыцці. Мы цяпер не проста граем, а займаемся навуковымі даследаваннямі. І надалей будзем працягваць такія эксперыменты.

— Зміцер, адкуль з'явілася методыка гістарычнай рэканструкцыі музычнай спадчыны?

— Методык ужываецца шмат, але мы найперш карыстаемся прыкладам сусветна вядомага дырыжора і майстра барочнай музыкі Нікалаўса Арнанкура. Ён перайграў на ўсіх даступных у Еўропе і Амерыцы інструментах. Арнанкур лічыць, што старадаўнюю музыку трэба выконваць толькі ў своеасаблівай стылістыцы, якая вельмі адрозніваецца ад сучаснай. У Францыі ладзяцца адпаведныя эксперыменты, падчас якіх музыка, што выконваецца на старадаўніх інструментах, запісваецца менавіта ў сценах таго стагоддзя, калі яна была напісана. Мы пакуль сабе такіх эксперыментаў дазволіць не можам, паколькі музыка ў стылі «медыяваль» не настолькі ў нас папулярная, гэты напрамак толькі пачынае развівацца. Хіба што толькі з дапамогай фундатараў такія праекты магчымыя.

— Музычную спадчыну Вялікага Княства Літоўскага абралі адмыслова?

— Вялікае Княства Літоўскае — частка Еўропы, аднак тэрыторыя мела свае асаблівасці. Яны датычыліся і музыкі. Тут працавалі італьянскія, бельгійскія, нямецкія, венгерскія, польскія музыкі. Праз талерантнасць у гэтай дзяржаве не толькі жылі, але і развівалі сваю культуру, мастацтва апроч ліцвінаў шэраг іншых нацыянальнасцяў. Гэты шматнацыянальны кангламерат паспяхова развіваўся за кошт узаемнага ўплыву паміж рознымі плынямі. Тое ж датычыцца і рэлігійных канфесій. Гэта і праваслаўны распеў, каталіцкая меса, пратэстанцкія харалы. Падчас Рэфармацыі ўтварыліся цэлыя музычныя цэнтры. Напэўна, нямногія ведаюць такі факт: асноўным замоўшчыкам нотадрукаў (зборнікаў нот) у Кракаве былі менавіта магнаты ВКЛ. Уся магнатэрыя была толькі мясцовага паходжання. Палацавая музыка спалучалася з народнай абрадавай, музыкай гарадоў і мястэчак (самай дэмакратычнай плынню ў тагачаснай музыцы), а таксама еўрапейскай, якую прыносілі вандроўныя музыкі. У выніку ўтварыўся проста ўнікальны сінтэз.

Тая музыка, якую грае «Стары Ольса» — гэта сярэднявечны рок...

— Вось дык вызначэнне, з гэтага месца, калі ласка, больш падрабязна...

— Нічога дзіўнага, сярэднявечная абрадавая музыка ўтваралася па тых жа прыкметах, што і сучасны рок. Гэта ўпарадкаванне навакольных гукаў, што перадаецца з дапамогай адпаведных інструментаў. Пакуль вакол нас не пачалі раўці машыны, то не было жорсткіх гітарных рыфаў. Гэта ж не што іншае, як імітацыя, упарадкаванне навакольнага гукавога «маторнага» асяроддзя. Таму рок — сучасная абрадавая музыка. А мы «вандруем» па сярэднявеччы. Вось і ўся розніца. За гэты час запісалі 7 альбомаў і 1 аўдыяпраект паводле апавядання Уладзіміра Караткевіча «Ладдзя роспачы». Імкнёмся спрыяць таму, каб праз вяртанне да вытокаў, нацыянальных каранёў адбывалася змена эмацыйнага музычнага фону. З іншага боку, мы ніколькі не адмаўляемся ад сучасных магчымасцяў. Таму паспяхова развіваюцца цікавыя праекты ў разнастайных стылях. Дарэчы, сяброў «Старога Ольсы» і вялікі наш канцэрт можна будзе пачуць падчас Гальшанскага фэсту. Думаю, што вельмі цікава атрымаецца пайграць у такім месцы. Так што абавязкова завітайце.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

БУДУЦЬ ДАДАТКОВЫЯ ЦЯГНІКІ

Дадаткова прызначаюцца цягнікі № 603 Гомель — Мінск. Адпраўляцца з Гомеля яны будуць 9, 11, 23, 25 кастрычніка ў 17.05, прыбываць у Мінск у гэтыя ж дні ў 22.06.

Адначасова Мінскае аддзяленне Беларускай чыгункі ўдакладняе час прыбыцця прызначанага з 4 кастрычніка па нядзелях на ўчастку Мінск — Баранавічы — Мінск паскоранага электрацягніка (мы паведамлялі пра гэта ў нумары за 30 верасня) на станцыю Баранавічы-Палескія — 19.17. Даведкі па тэлефонах 225 70 00, 105.

Сяргей РАСОЛЬКА.

З учарашняй пошты

«Звязда» прываблівае сваёй мовай»

Пасля доўгага перапынку зноў стаў чытаць «Звязду». Прывабіла перш за ўсё мова. А было так.

З паўгода, год таму я наважыўся звярнуцца да вас з лістом-запытаннем: чаму газета так настойліва трымаецца давальнага склону — піша: *па гэтаму пытанню*, калі іншыя беларускія выданні перайшлі на правільную канструкцыю *па гэтым пытанні*.

На шчасце, нешта падказала мне пагартаць, пачытаць газету. Прыемна здзівіўся, убачыўшы паслядоўныя напісанні: *меры па павышэнні эфектыўнасці, па сваім меркаванні* і падобныя.

Захацелася бліжэй пазнаёміцца з сённяшняй моваю газеты. І атрымаў задавальненне ад багатага і разнастайнага слоўніка, ад рэальнай беларускай граматыкі (напрыклад, ужыванне «поўных» канчаткаў назоўнікаў: *нормаў, фермаў, правілаў;* унікненне скалкаваных формаў дзеяслова: *парадак* дзейны, а не дзеючы; *разнабой* наяўны, а не існуючы).

Але, як той казаў, калі добра, дык хочацца яшчэ лепшага. Неяк звярнуў увагу на рубрыку ўнізе апошняй старонкі пад назвай *«Усміхнёмся!»* Толькі на мяне запрашэнне гэтае не падзейнічала. Прычына ў тым, што дзеяслоў *усміхнёмся* можа быць дарэчы, успрыняты адназначна, калі маецца на ўвазе будучы час: «Усміхнёмся тады, як будзе настрой». Калі ж трэба запрасіць (граматысты кажуць пабудзіць) каго-небудзь да супольнага з аўтарам мовы дзеяння, то мусім сказаць (напісаць): «Усміхнемся!» Параўнайма аналагічныя выказванні: *Хадзем на двор! Бярэмся за стол і нясем! П'ем за здароўе маладых!* Гэта нарматыўныя беларускія формы загаднага ладу.

Алесь КАЎРУС,
кандыдат філалагічных навук.

Прыемна, што нашы чытачы, а тым больш спецыялісты ў галіне мовазнаўства, заўважаюць перамены ў лепшы бок, што адбываюцца ў газеце. За ўсім, што робіцца, стаяць, вядома ж, людзі. І нам хочацца назваць аднаго з аўтараў звяздоўскіх унармаванняў — шмат новага прынесла з сабою стыль-рэдактар «Звязды» Марына Абрагімовіч. Разам з закінаўленымі аўтарамі будзем старацца рабіць цікавую і пісьменную газету.

Проса — расліна і крупы, а кавун, як ні дзіўна, — ягада

«Вы апошнім часам шмат пішаце пра беларускую мову, вось і патлумачце мне, як назваць крупы з проса. Бо проса — гэта, як вядома, расліна, а крупы па-руску называюцца «пшено». Але ж па-беларуску так не скажаш?

І яшчэ. Вы пішаце ў газеце пра кавуны, але чамусьці называеце іх паласатымі ягадамі. 75 гадоў пражыў на свеце (дарэчы, 30 з іх выпісваю «Звязду»), але не чуў, каб кавуны называлі ягадамі.

Віталь Фёдаравіч АЎРАМЕНКА, *Добрушскі раён».*

Па-першае, Віталю Фёдаравічу вялікі дзякуй за вернасць нашай газеце. Вельмі радуе, што пытанні, якія ўзнікаюць, ён адрасуе выданню, у якім прывык знаходзіць адказы.

Цяпер пра проса. Сапраўды, і расліна, і яе насенне маюць аднолькавую назву: «Проса — злакавая расліна, з зерня якой атрымліваюцца крупы.// Крупы, прыгатаваныя з зерня гэтай расліны», — так трактуе гэтую сітуацыю «Тлумачальны слоўнік беларускай мовы» пад рэдакцыяй Кандрата Крапівы. Прыкладна тое ж самае дае і слоўнік пад рэдакцыяй М.Судніка і М.Крыўко. Тут жа пішацца пра *прасяную кашу*. Можна яшчэ сказаць *каша з прасяных крупаў* — усё будзе правільна. І ў любым выпадку — смачна!

Што да такой ягады, як кавун, то ніякай памылкі тут няма — біёлагі, батанікі сапраўды называюць плод кавуна ягадай, бо ён мае сакавітую мякаць і мноства семак. Дзіўна, праўда? Ягада вагой як не ў пуд.

Васіль Фёдаравіч знайшоў у газеце і памылку ў датах праграмы тэлебачання — што тут казаць, на жаль, бывае! Штодзённая газета робіцца ў высокім тэмпе, робяць яе людзі, а нам, людзям, уласціва і памыляцца. Думаем, варта з разуменнем ставіцца да гэтага, і ўжо ва ўсякім разе — без знявагі. Хоць «аўтары» найбольш істотных памылак атрымліваюць заслужаны «ганарар» — мінус у разліковай ведамасці.

Ліст з каментарам

Тым, хто аднаўляў мірнае жыццё ў першыя пасляваенныя...

Ад безвыходнасці вырашыў звярнуцца да вас. Спадзяюся, што вы зможаце аднавіць справядлівасць. Сутнасць у тым, што я ў ліпені 1944 года, пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, добраахвотна ўступіў у знішчальны батальён пры Маладзечанскім НКУС. У той час мне было 16 гадоў. Мне была выдадзена баявая зброя і пасведчанне асобы. Наш батальён дзейнічаў на тэрыторыях Маладзечанскага, Радашковіцкага і Валожынскага раёнаў, а таксама Вілейскага. Служыў я да снежня 1949 года. У той час на тэрыторыі Заходняй Беларусі лютавалі ўзброеныя банды. Нам не адзін раз даводзілася ўступаць у баявыя дзеянні... Даводзілася рабіць засады, вылоўліваць дэзерціраў, ахоўваць савецкія ўстановы, прымаць актыўны ўдзел у аднаўленні савецкай улады на тэрыторыі Мінскай вобласці. У 1949 годзе батальён быў расфарміраваны, многія засталіся працаваць у міліцыі. Асабіста я ў снежні 1949 года пайшоў у Савецкую Армію. Пасведчанне я пакінуў дома, як зараз памятаю, пад бэлькай у хаце. Калі вярнуўся з арміі, яго ўжо не знайшоў, недзе згубілася. Па маладосці нічога не аднаўляў... Ніколі не задумваўся пра тое, каб аднавіць факт свайго ўдзелу ў Вялікай Айчыннай вайне. Зараз мне ўжо 81 год... Я не разумею, чаму мне не вераць, я клянуся ўсім, што ў мяне ёсць, што я сапраўды служыў у знішчальным батальёне... Буду шчыра ўдзячны за разуменне і дапамогу ў аднаўленні факта ісціны ў маёй справе.

Фёдар Іосіфавіч СЯНЬКО, *г. Маладзечна*

Ліст чытача складаецца, як сам жа і ўдакладняе Фёдар Іосіфавіч, з 14 аркушаў. На якіх падрабязна занатаваны як некаторыя баявыя эпізоды з мінулага нашага заяўніка, так і перыпетыі дзён сучасных. У прыватнасці, таго, як чытач адшукаў двух сведак, з якімі ён некалі служыў у знішчальным батальёне, і якія, у сваю чаргу, дакументальна (іх словы засведчаны натарыусам, менавіта словы саслужыўцаў, а не факты, выкладзеныя ў дакументе, як пазначана на адной з папер) пацвердзілі гэты факт. Аднак, з горыччу распавядае далей Фёдар Іосіфавіч, іх сведчанняў, як высветлілася, недастатковых. Дакументаў жа ў архівах не захавалася. Чытач даслаў нам ксеракопіі адказаў на яго запыты: ва ўпраўленне ўнутраных спраў Мінскага аблвыканкама, Камітэт дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, Расійскі дзяржаўны ваенны архіў, Міністэрства ўнутраных спраў Расійскай Федэрацыі, ваенны камісарыят г. Мінска і Мінскай вобласці, упраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Маладзечанскага райвыканкама, суд Маладзечанскага раёна... У некаторыя інстанцыі заяўнік звяртаўся неаднойчы, а ўвогуле ўсе дасланыя дакументы датаваныя перыядам з 1992 па 2007 год. Як можна здагадацца, у большасці адказаў гаворыцца, што патрэбных чытачу звестак не захавалася або яны адсутнічаюць.

«Улічваючы вышэйвыкладзенае і той факт, што паказанні сведак не з'яўляюцца падставай для ўстанаўлення статуса ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны, пасведчанне ўдзельніка Вялікай Айчыннай вайны грамадзяніну не выдаваць...» Такія словы можна прачытаць у адной з дасланых нам афіцыйных папер-адказаў Фёдару Іосіфавічу. «Дзеючым заканадаўствам прадугледжана група фактаў, устанаўленне якіх у судзе не дапускаецца, яны ўстанаўліваюцца ў адміністрацыйным парадку. Так, не падлягаюць устанаўленню ў судзе факты: знаходжанне на фронце, знаходжанне ў партызанскім атрадзе і іншыя». Гэта ўжо цытата з рашэння суда Маладзечанскага раёна аб адмове ў завядзенні справы аб устанаўленні факта ўдзелу заяўніка ў Вялікай Айчыннай вайне...

У чым магла б быць дапамога рэдакцыі ў аналагічнай сітуацыі? Звычайна мы падказваем алгарытм дзеянняў: куды, з якімі зыходнымі звесткамі трэба звяртацца заяўніку ў пошуку патрэбнай яму інфармацыі. Але зрабіць гэта за грамадзяніна, як таго часам некаторыя просяць, практычна заўсёды не можам, паколькі патрабуецца ўласнаручна напісаная чалавекам заява. У нашай сітуацыі такая падказка не патрэбная: Фёдар Іосіфавіч ужо звяртаўся ва ўсе месцы, дзе маглі б быць такія патрэбныя яму дакументы. На жаль, там іх няма. Як было сказана вышэй і вынікае з усяго выкладзенага, дзейнае заканадаўства патрабуе прад'яўлення менавіта архіўных звестак. Адмяніць законы, тым больш абысці іх, мы не можам. Пачалавечы цалкам зразумелы боль і горыч нашага заяўніка, але ў гэтай сітуацыі, на жаль, застаецца толькі спадзявацца, што ўсё ж такі такія дакументы адшукаюцца. Пакуль жа няхай хоць бы нейкім маральным суцяшэннем для чалавека паслужыць гэтая публікацыя, у якой мы прыгадалі пакаленне людзей, якія аднаўлялі мірнае нармальнае жыццё ў першыя пасляваенныя гады, і канкрэтна — Фёдар Іосіфавіч Сянько. Дзякуй за гэты ваш унёсак!

Дарога да Перамогі

РАЗВЕДЧЫЦА СПЕЦГРУПЫ «ЧАЦВЁРТЫЯ»

Вялікая Айчынная напаткала карэнную мінчанку Тамару Васільеўну Сушкову ва ўкраінскім Данбасе, дзе яны з сястрой Жэняй гасцявалі ў сваякоў.

У лістападзе фашысты занялі горад. Пачаліся вобыскі, расстрэлы, паказальныя пакаранні патрыётаў і падпольшчыкаў. Дзяўчатам пагражала адпраўка на работы ў Германію, і таму яны вырашылі прабірацца да маці, у Мінск.

Дадому Тома і Жэня дабраліся толькі ў красавіку 1942 года. На той момант іх маці, Агафія Якаўлеўна, ужо была звязана з партызанамі. Хутка дочкі ўступілі ў атрад «Смерць фашызму», які дзейнічаў на тэрыторыі Мінскай вобласці.

Томку, як яе звалі партызаны, прызначылі разведчыцай. Яна досыць хутка асвоіла нялёгкія навыкі разведвальнай дзейнасці. Упарта трэніравала памяць, вучылася звяртаць увагу на дробязі, разбірацца ў паводзінах салдатаў і афіцэраў вайсковых часцей, якія напоўнілі Мінск. Набыла вопыт праходжання з забароненымі рэчамі праз нямецкія кантрольна-праверачныя пасты. На працягу года Тома ўстанавіла сувязь з Мінскім падполлем, пачала дастаўляць зброю і боепрыпасы, медыкаменты і лістоўкі, выводзіла людзей з горада. Дапамагаў «аўсвайс» — пропуск, раздабыты падпольшчыкамі, якія працавалі ў Смалявіцкай гарадской управе. Сёння гэты важны дакумент экспануецца ў музеі Вялікай Айчыннай вайны.

1 красавіка 1943 года Тома разам з іншымі байцамі атрада назірала, як на парашутах спусціліся 10 байцоў-дэсантнікаў на чале з камандзірам, маёрам Аляксандрам Мяцёлкіным. Гэта былі чэкісты спецгрупы НКДБ «Чацвёртыя», якія ўжо другі раз прыбылі на тэрыторыю Беларусі, а дакладней, у Барысаўскі раён. «Іх чакалі, — расказвае Тамара Сушкова. — Мы пачулі гул матораў, хутка з'явіліся сілуэты парашутаў. Гэта былі нашы — прыгожыя, моцныя, у новай форме, з аўтаматамі... Сапраўдныя дэсантнікі...».

Тамару залічылі ў склад спецгрупы. Гэта былі новыя заданні, больш адказныя і небяспечныя. Адно з іх — сабраць звесткі аб нямецкім гарнізоне ў Плешчаніцах, аб яго агнявых пунктах, інжынерных загарадах, зручных падыходах, зенітных батарэях. За выкананне шэрагу спецыяльных заданняў адважную разведчыцу Сушкову ўзнагародзілі медалямі «За адвагу» і «Партызану Айчыннай вайны» 2-й ступені. Апошнюю пасля вызвалення рэспублікі ўручаў асабіста міністр дзяржбяспекі БССР Лаўрэнцій Цанава.

Дакументальнае сведчанне работы ў спецгрупе.

Падчас работы піянерважатай у школе.

На пачатку лета 1944 года, напярэдадні аперацыі «Багратыён», з'яўляцца ў Мінску стала небяспечна. Гітлераўцы на месцы расстрэльвалі мірных жыхароў, якія, як падазраваліся, супрацоўнічалі з партызанамі. Яшчэ раней было разгромлена Мінскае падполле, страчаны многія кантакты і яўкі. Сёстры Сушковы прынялі рашэнне накіравацца разам са спецгрупай «Чацвёртыя» ў раён возера Палік, велізарнай партызанскай зоны. «Ішлі павольна, пазбягаючы ажыўленых дарог, нагружаныя боепрыпасамі, — кажа Тамара Васільеўна. — Параненых і хворых неслі на насілках. Трафейны карабін націраў плечы, аднак самымі цяжкімі былі батарэі да рацыі...».

Напярэдадні вызвалення Беларусі чэкісцкія групы і партызанскія брыгады Барысаўшчыны ператварылі жыццё акупантаў у сапраўднае пекла. Фашысты вырашылі заблакіраваць і поўнасцю вынішчыць партызанаў. Падчас прарыву блакады ля вёскі Макаўе Барысаўскага раёна загінула сястра Яўгенія. Разам з ёю ў брацкай магіле пахаваныя Герої Савецкага Саюза Фёдар Азміцель і Барыс Галушкін — камандзіры чэкісцкіх спецгруп «Дапамога» і «Гром», якія дзейнічалі на акупаванай тэрыторыі Міншчыны. 27 чэрвеня 1944 года спецгрупа «Чацвёртыя» злучылася з часцямі Чырвонай Арміі.

Пасля вайны Тамара Васільеўна выйшла замуж, скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Працавала настаўніцай, займалася камсамольскай і партыйнай дзейнасцю. Разам з мужам Рыгорам Яўгенавічам Цыганковым, адным з ініцыятараў узвядзення Кургана Славы, выхавала траіх дзяцей, дачакалася ўнукаў і праўнукаў. Узнагароджана ордэнам «За працоўную адзнаку». У 1980 годзе ёй прысвоена ганаровае званне «Заслужаны настаўнік БССР».

Тамара Васільеўна ўзгадвае далёкія падзеі.

Тамару Васільеўну дагэтуль захоўвае перапіску з членамі спецгрупы, дакументальныя матэрыялы часоў баявых дзеянняў, даведкі і фотаздымкі, якія маюць дачыненне да спецгрупы «Чацвёртыя». Фотакопіі «аўсвайса» разведчыцы і рэдкія фота героя-чэкіста Барыса Галушкіна захоўваюцца ў Зале Гісторыі, Доблесці і Славы ўпраўлення КДБ па г. Мінску і Мінскай вобласці. Самым жа дарагім і памятным экспанатам ва ўласным, хатнім архіве Тамары Сушковай застаецца спіс тых самых дзесяці дэсантнікаў-«чацвёраўцаў». Гэта Аляксандр Мяцёлкін («Качубей»), Аляксандр Аляксандраў, Іван Вачэўскіх, Сямён Дарэнскіх, Іван Камароў, Аляксандр Намінат, Пётр Папкоў, Дзмітрый Смірноў, Павел Сцяпанаў, Іван Тарасевіч (прозвішчы публікуюцца ўпершыню).

Святлана БАРЫСЕНКА.

Да ведама

Для перапісчыкаў — бясплатны праезд

Як паведамілі ў дзяржаўным прадпрыемстве «Мінсктранс», у адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 05.10.2006 г. «Аб правядзенні ў 2009 годзе перапісу насельніцтва Рэспублікі Беларусь», з 1 па 30 кастрычніка часоваму перапісному персаналу даецца права на бясплатны праезд на ўсіх відах гарадскога пасажырскага транспарту і на аўтамабільным пасажырскім транспарце агульнага карыстання рэгулярных прыгарадных зносінаў. Асобы, што ўваходзяць у склад часовага перапіснога персаналу, маюць права на такі бясплатны праезд у межах раёна, горада абласнога падпарадкавання, горада Мінска, у якім яны праводзяць перапіс насельніцтва, па прад'яўленні пасведчання.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

по продаже права на заключение договоров аренды земельных участков в г. Лепеле

Организатор: РУП «Витебский институт недвижимости и оценки»

Продавец: Лепельский районный исполнительный комитет

ЛОТ № 1: право на заключение договора аренды земельного участка № 1 для размещения торгового объекта по ул. М. Горького в г. Лепеле Витебской области, кадастровый № 222750100001004642 площадью 0,0076 га, срок аренды 10 лет, ограничение: охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В – 0,0017 га, расходы, связанные с изготовлением документации 649 953 рубля, начальная цена продажи 77 147 рублей, задаток 7 715 рублей.

ЛОТ № 2: право на заключение договора аренды земельного участка № 2 для размещения торгового объекта по ул. М. Горького в г. Лепеле Витебской области, кадастровый № 222750100001004643 площадью 0,0071 га, срок аренды 10 лет, ограничение: охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В – 0,0016 га, расходы, связанные с изготовлением документации 583 164 рубля, начальная цена продажи 72 070 рублей, задаток 7 207 рублей.

ЛОТ № 3: право на заключение договора аренды земельного участка № 3 для размещения торгового объекта по ул. М. Горького в г. Лепеле Витебской области, кадастровый № 222750100001004644 площадью 0,0112 га, срок аренды 10 лет, ограничение: охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000 В – 0,0045 га, расходы, связанные с изготовлением документации 600 649 рублей, начальная цена продажи 113 709 рублей, задаток 11 371 рубль.

Инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ, здания и сооружения на участках отсутствуют. Условия развития инфраструктуры территории: возможность подключения к инженерным сетям.

1. Аукцион состоится **05 ноября 2009 года в 11.00 по адресу: Витебская область, г. Лепель, ул. Ленинская, 6.**

2. Аукцион проводится в соответствии с Положениями, утвержденными Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 года № 462. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Условия – наличие не менее двух участников. Заявления и пакет документов на участие принимаются по рабочим дням с 8.00 до 17.00 по адресу: Витебск, ул. Гоголя,17; ул. Гагарина 46. Последний день приема заявлений и документов **30.10.2009 года** до 17.00. Заключительная регистрация участников **05.11.2009 года с 10.30 до 11.00** по месту проведения аукциона.

3. К участию допускаются физические и юридические лица, подавшие документы в соответствии с п.4 настоящего извещения. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет № 3012215570013 в ГФ по Витебской области ОАО «Белинвестбанк», ул. Ленина, 22/16, код 701. Получатель – РУП «Витебский институт недвижимости и оценки», УНП 390343677.

4. Участнику необходимо в срок, указанный в извещении подать заявление и подписать Соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона и предоставить следующие документы: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации; представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов предъявляется документ, удостоверяющий личность.

5. Условия: возмещение победителем аукциона затрат по организации и проведению аукциона и расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; заключение Победителем аукциона с Лепельским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществления в 2-месячный срок после принятия решения о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; получение Победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок не превышающий 2-х лет; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

6. Ориентировочные затраты на организацию и проведение аукциона составляют 908 397 рублей по каждому лоту. Фактические затраты на организацию и проведение аукциона будут объявлены дополнительно перед проведением торгов.

Контактные телефоны: 8 (0212) 37 01 64; 36 02 56; 8 (029) 591 00 02; 8 (029) 384 24 05; эл.почта: vit.in@tut.by; www.Ocenka.by, тел. в г. Лепеле 4-41-08.

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «КАСКАД-93»

(сокращенное наименование: ОАО «Каскад-93»)

сообщает, что в связи с принятием решения о реорганизации ОАО «Каскад-93» путем присоединения его к Открытому акционерному обществу «Завод по ремонту и техническому обслуживанию вычислительной техники» (сокращенное наименование: ОАО «Белсчеттехника») в соответствии со статьей 78 Закона Республики Беларусь «О хозяйственных обществах» у акционеров, голосовавших против такого решения или не участвовавших в общем собрании акционеров, на котором было принято такое решение, возникает право требования выкупа принадлежащих им акций. В соответствии с Уставом Общества уведомление акционеров об их праве требования выкупа акций осуществляется в том же порядке, в котором они были извещены о проведении внеочередного собрания акционеров.

Установить:

- цену выкупа акции ОАО «Каскад-93» по требованию акционеров в размере 16 670 (шестнадцать тысяч шестьсот семьдесят) белорусских рублей за одну акцию;
- что оплата акции при их выкупе по требованию акционеров осуществляется денежными средствами;
- срок, в течение которого акционеры могут предъявлять письменное требование Обществу о выкупе принадлежащих им акций, установить не позднее 30 (тридцати) дней с даты проведения внеочередного общего собрания акционеров;
- что общая сумма денежных средств, направляемых акционерным обществом на выкуп акций, не может превышать десяти процентов стоимости чистых активов акционерного общества на дату принятия решения, повлекшего возникновение у акционеров права требовать выкупа акционерным обществом его акций. В случае, если общее количество акций, предложенное для выкупа по требованию акционеров, превышает количество акций, которое может быть приобретено акционерным обществом с учетом ограничений, установленное настоящей частью, акции выкупаются у акционеров пропорционально заявленным требованиям.

Собрание акционеров состоялось 29 сентября 2009 года.

Телефон для справок: (8 017) 295 34 73.

Адрес: 220114 г. Минск, ул. Ф. Скорины, 14–226.

УНП 100016908.

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «КАСКАД-93»

(сокращенное наименование: ОАО «Каскад-93»)

уведомляет, что в связи с принятием решения внеочередным общим собранием акционеров Общества о реорганизации ОАО «Каскад-93» путем присоединения его к Открытому акционерному обществу «Завод по ремонту и техническому обслуживанию вычислительной техники» (сокращенное наименование: ОАО «Белсчеттехника») претензии принимаются в течение двух месяцев с даты опубликования по адресу: 220114 г. Минск, ул. Ф. Скорины, 14—226, УНП 100016908.

Собрание акционеров состоялось 29 сентября 2009 года.

Телефон для справок: (8 017) 266 39 98.

В ДОПОЛНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ОАО «БЕЛБУД» ОБЪЕКТА ДОЛЕВОГО СТРОИТЕЛЬСТВА,

опубликованной в газете «Звязда» № 53 от 21 марта 2009 г. (с дополнениями в газете «Звязда» № 68 от 11 апреля 2009 г.)

Объектами долевого строительства являются:

- 17 однокомнатных квартир площадью 41,05 кв. м – 47,23 кв. м;
- 2 двухкомнатные квартиры площадью 61,66–64,75 кв. м;
- 34 трехкомнатные квартиры площадью ≈ 92,4 кв. м.

Информацию об объекте долевого строительства и ходе работ по его строительству можно получить по адресу: г. Минск, ул. Восточная, 133, оф. 1.

Тел.: (017) 237 29 50, 237 29 51.

УНП 100794022

Утерянное приложение № 1 от 2.11.2002 г. к свидетельству о гос. регистрации ИП Котова В.Н. УНН 101503437 **считать недействительным.**

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 № 33 (322)

Мох у садзе

Імхі і лішайнікі ў кронах пладовых дрэў несумненна прыносяць шкоду, прыгнятаючы расліны. Пазбавіцца ад гэтых непажаданых жыльцоў нескладана: трэба сумясціць восеньскую пабелку з апырскваннем вапнай усёй кроны, дадаўшы ў вапну медны купарвас. А вось балотны мох-сфагнум — наш незаменны памочнік.

У ім выдатна захоўваюцца садавіна і агародніна. Пры размнажэнні пладовых дрэў і раслін чаранкамі таксама можна выкарыстоўваць мох. Пакласці на дно поліэтыленавага пакета вільготны мох, змочаны стымулятарам утварэння каранёў, уставіць у мох чаранкі і завязаць зверху. Чаранкі прыжываюцца ўсе.

Мох надзейны і, бадай, самы лепшы спосаб для перасылкі саджанцаў поштай. Дзякуючы павышанаму ўтрыманню ёдуў мох валодае бактэрыцыднымі і дэзынфікуючымі ўласцівасцямі. Ён таксама садзенічае накапленню вуглякіслага газу, які з'яўляецца добрым кансервантам.

Мох-сфагнум — ідэальны матэрыял у барацьбе не толькі з выправаннем. Калі абгарнуць імхом ствол і некалькі галінак, вам гарантаваны штогадовы ўраджай нават пасля вельмі марозных зім. А калі пры гэтым змочыце мох рэчывамі, якія адпуджваюць мышэй і зайцаў (напрыклад, карбафосам), то пазбавіце дрэва і ад грызуноў. Адпадае таксама неабходнасць у восеньскай пабелцы, таму што мох добра ахоўвае дрэва ад сонечных апёкаў і марозабоін.

Карысныя парады

Не заворвайце ў глебу вельмі многа «сырых» раслін. Не паспеўшы разлажыцца, яны могуць закіснуць. Лішкі лепш закампаставаць альбо выкарыстаць як мульчу.

* * *

Лясны папаратнік арляк — добры антысептык, можа надзейна засцерагчы садавіну ад псавання. Слоем папартніка абкладваюць дно і сценкі скрынкі для захоўвання, перакладваюць ім і самі плады, пакладзеныя пладаножкамі ўверх.

Захоўваем садавіну

Грушы і яблыкі можна захоўваць на гарышчы жылых дамоў. Толькі трэба абараніць іх ад грызуноў, не дапусціць іх завядання, засцерагчы ад марозу. Каб весці барацьбу з грызунамі, можна выкарыстаць атручаныя прыманкі. Яшчэ ў верасні іх раскладваюць, калі мышы перасяляюцца з вуліцы ў памяшканні на зімоўку. Каля скрынак з яблыкамі пакладзіце галінкі бузіны, а таксама чарнакорань — мышы не любяць гэтага паху. Каб засцерагчы ад завядання ўраджай, пажадана накрыць яго поліэтыленавай плёнкай.

Засцерагчы яблыкі і грушы ад маразоў можна, накрыўшы скрынкі з імі саломай, кардонам, непатрэбным адзеннем. Але ў моцныя маразы скрынкі падмярзаюць, таму лепш захоўваць садавіну ў бурціках.

Надакучлівы драцянік

Жукі-шчаўкуны селяцца на ўчастках з кіслымі глебамі, дзе акрамя асноўнай культуры пераважае пырнік. Лічынкі падгрызаюць карані і пашкоджваюць клубні бульбы, робячы ў іх хады. Яны — небяспечныя шкоднікі для кукурузы, цукровых буракоў, расады агародных культур, тытуню. Лічынкі залазяць у сярэдзіну кораня (клубня) буракоў, морквы, бульбы і садзейнічаюць пранікненню ў хады ўзбуджальнікаў хваробаў, якія выклікаюць загніванне.

Каб пазбавіцца ад драцяніка, трэба каб поле было чыстым, у першую чаргу ад пырніку — любімай ежы драцяніка — як на самім участку, так і па суседстве з ім. Неаднаразовае за лета рыхленне глебы ў міжрадкоўях на глыбіню 10—12 см садзейнічае гібелі яек і лічынак. Зніжэнне колькасці лічынак адбываецца пры вапнаванні кіслых глебаў. Для гэтай мэты найбольш падыходзіць даламітавая мука. Драцянік пойдзе глыбока ў глебу і не пашкодзіць клубні бульбы. Забівае драцяніка і калійная соль. Пасыпайце ёю поле перад капаннем. Участак, дзе расла бульба, з восені засявайце ў якасці сідэрата рэдзькай алейнай.

Як карміць агрэст і парэчкі

Вы пасадзілі ў садзе агрэст і парэчкі — ведайце, што яны маюць патрэбу ў кармленні. Калі глеба ў пасадачнай яме адразу была добра запраўлена, то ў першы год пасля пасадкі ўгнаенні пад расліны ўносіць не варта, а вось замульчыраваць глебу вакол куста — гэта можна. Пажадана абкласці яго перагноем, кампостам ці гноем, які не павінен мець кантактаў з раслінай.

Калі летам (у першы год пасля пасадкі) лісты на кустах будуць светлыя, а не цёмна-зялёныя, як гэта павінна быць, то расліны трэба падкарміць вадкім азотным угнаеннем. Зрабіць гэта трэба ў сярэдзіне лета: растварыць у вядры вады 12—15 г аміячнай салетры і выкарыстаць гэты раствор на дзве расліны (па паўвядра на кожную). А з другога года, калі вы хочаце, каб ураджай быў шчодрым і стабільным, глебу вакол куста трэба будзе паляпшаць, уносячы фосфарныя, калійныя і арганічныя ўгнаенні. Для парэчак такое паляпшэнне глебы звычайна праводзяць на працягу 3—5 гадоў. Паколькі агрэст расце больш павольна, чым парэчкі, то перыяд запраўкі глебы пад ім можна падоўжыць.

Трэба ўлічваць такія асаблівасці: агрэсту калійных угнаенняў трэба больш, чым парэчкам. Калійныя ўгнаенні, якія змяшчаюць хлор, у высокіх дозах лепш уносіць увосень, асабліва пад парэчкі. Трэба ведаць, што ў агрэсту карані размяшчаюцца пад кронай, а ў парэчак яны распаўсюджваюцца крыху далей. У дарослым стане кусты парэчак і агрэсту размяшчаюцца ў шырыню да 1,5—2 м — вось гэту плошчу і трэба запраўляць угнаеннем.

Запраўляюць угнаенні пры перакопцы глебы вакол куста (за межамі кроны) глыбока, а пад кронай куста мелка.

З мінеральных угнаенняў суперфасфату спатрэбіцца 400—500 г, але лепш уносіць не адзін суперфасфат, а ў сумесі з іншымі фосфарнымі ўгнаеннямі, якія менш растваруюцца. Напрыклад, 200 г суперфасфату і 300—400 г касцявой або фасфатнай мукі. Калію хлорыстага трэба будзе 150—200 г. Гэтай колькасці ўгнаенняў хопіць, каб палепшыць сярэднія па ўрадлівасці глебы. А вось на багатых глебах колькасць угнаенняў можна знізіць. Дарэчы, мінеральнае азотнае ўгнаенне можна ўносіць не толькі адзін раз вясной, але і часткамі: адну вясной, другую — у выглядзе падкормкі летам. На лёгкіх пясчаных глебах, акрамя азоту, можна дадаць і калій.

Вырошчванне і выкарыстоўванне зялёнага ўгнаення

Эфектыўнасць зялёнага ўгнаення ў значнай ступені залежыць ад узросту раслін-сідэратаў. Маладыя расліны багатыя на азот, хутка раскладаюцца ў глебе і інтэнсіўна выдзяляюць яго, таму ўжо праз тры-чатыры тыдні пасля заворвання маладых зялёных раслін на гэта месца можна высяваць або перасаджваць асноўную культуру. Пры гэтым трэба ўлічваць, што, калі заворваць у глебу вельмі многа сырой раслінай масы, яна будзе не раскладацца, а кіснуць. Акрамя таго, вялікая колькасць выдзеленага азоту можа адмоўна паўплываць на асноўную культуру, таму лішак свежай зялёнай масы лепш выкарыстаць для кампасціравання і мульчыравання.

У больш спелым узросце, калі расліны ўтварылі цвёрдае сцябло, яны раскладаюцца больш павольна. Тут трэба ўлічваць, што больш выспелыя расліны багатыя на вуглярод і абдзеленыя азотам, таму пры заворванні раслінай масы незадоўга да сяўбы асноўнай культуры ў глебе можа ўзнікнуць дэфіцыт азоту, што адмоўна паўплывае на рост асноўнай культуры, калі не ўнесці пэўнай дозы азотнага ўгнаення.

З улікам усіх гэтых фактараў рэкамендуецца заворваць зялёнае ўгнаенне ў перыяд бутанізацыі да пачатку цвіцення, калі расліны яшчэ не вельмі грубыя. Практыка паказала, што зялёныя ўгнаенні лепш заворваць неглыбока, таму што ў адваротным выпадку яны не раскладаюцца, а ператвараюцца ў торфападобную масу. Глыбіня заворвання на лёгкіх глебах 12—15 см, на цяжкіх — 6—8 см.

Каб зялёныя ўгнаенні добра раслі і давалі значную колькасць зялёнай масы, глебу для іх неабходна добра рыхліць. Насенне трэба высяваць неглыбока, асабліва дробнае.

Пры рабоце з зялёнымі ўгнаеннямі трэба ўлічваць, што расліны, якія належаць да адной сям'і, паражаюцца аднымі і тымі ж шкоднікамі і хваробамі, таму нельга размяшчаць запар зялёнае ўгнаенне і асноўную культуру, якая належыць да адной і той жа сям'і. Напрыклад, нельга высяваць як асноўную культуру капусту і ўсе культуры, якія адносяцца да сям'і капусных, пасля высявання на зялёнае ўгнаенне гарчыцы, рапсу, алейнай рэдзькі.

У кастрычніку снег — толькі на смех

Кастрычнік — месяц пераменлівага надвор'я. Сонечныя сухія дні змяняюцца пахмурнымі, дажджлівымі, нават можа пайсці снег, але доўга ён не залежваецца, адразу растае.

У **садзе** ў пачатку месяца завяршаецца збор позніх груш і яблыкаў. Калі садавод набыў саджанцы маліны, агрэсту, парэчак — адразу высадзіць на пастаяннае месца, а яблыні, грушы, слівы прыкапаць да вясны. Старыя галінкі парэчак, агрэсту, а часам і парасткі вішні, яблыні, рабіны высыхаюць ад пашкоджання парэчкавай падушніцай. Калі шкоднікаў не вельмі многа, парасткі дастаткова прамыць мыльна-газавай эмульсіяй (на 10 л вады 40 г мыльнай стружкі і 10 мл газы (керасіна).

Прыкладна раз у тры гады на старых дрэвах праводзяць чыстку кары з дапамогай тупых скрабкоў або металічных шчотак. Пры гэтым знішчаюцца коканы пладажэркі, яйкі кляшчоў, ліставёртак, няпарнага шаўкапраду, змяншаецца колькасць узбуджальнікаў грыбных захворванняў. Робяць гэта асцярожна, каб не пашкодзіць жывую кару.

У кастрычніку пачынаюць перакопку глебы, перш за ўсё на прыствольных кругах пад дрэвамі і ягаднікамі. Пласт глебы не разбіваюць і не рыхляць граблямі. Шкоднікі садовых культур, якія зімуюць у верхнім слоі зямлі (лічынкі пільшчыкаў, даўганосікаў, агрэставай агнёўкі) проста вымерзнуць.

Пад перакопку раз у тры-чатыры гады ўносяць 0,5-1 шклянку суперфасфату, столькі ж сернакіслага калію, або не больш чым 1,5 шклянкі хлорыстага калію. Арганічныя ўгнаенні ўносяць кожны год. Пад кожны куст чорных парэчак уносяць па 2-3 шклянкі сухога попелу, гэта павысіць супраціўляльнасць раслін да захворванняў мучністай расой і антракнозам.

Перад пачаткам перакопкі знімаюць з галін хворыя засохлыя плады, якія могуць стаць ачагом розных грыбковых захворванняў. У кампоставую кучу іх не складваюць, а закопваюць у асобную яму ці спальваюць. Каб знішчыць споры паршы, лісты і прыствольныя кругі дэзынфікуюць растворам мачавіны або аміячнай салетры (500—700 г мачавіны на 10 л вады).

Прыствольныя кругі перакопваюць і мульчыруюць гноем, які дастаткова перапрэў. Гэта не толькі ўцяпліць карані, але і забяспечыць дрэву правільнае сілкаванне: неабходныя рэчывы будуць пранікаць да каранёў пад уздзеяннем снегавых і талых водаў. Вясной гэты слой затрымае вільгаць і зменшыць выпарэнне.

У **агародзе** ў першай дэкадзе кастрычніка завяршаецца пасадка часнаку. Грады пад яго адводзяць пасля агуркоў, ранніх капусты і бульбы, зяленіўных культур. У гэты ж час убіраюць позняя гатункі белакачаннай, чырвонакачаннай і брусельскай капусты. Пасля ўборкі ўраджаю ўсе раслінныя рэшткі спальваюць, а калі яны невялікія, складваюць у кампост. У сухое сонечнае надвор'е трэба сабрать апоркі для агародніны, апрацаваць іх растворам меднага купарвасу (1 ч. л./10 л вады), прасушыць і скласці пад павець.

У канцы месяца трэба пачаць падзімнюю сяўбу агародніны, што забяспечыць раннім ураджаем. Градкі трэба падрыхтаваць і высеяць насенне да першых замаразкаў. Для засыпкі насення загадзя падрыхтаваць прасушаны торф або зямлю.

Калі ў цяпліцы былі заўважаны такія хваробы, як бурая плямістасць таматаў, каранёвая гніль агуркоў, верхні слой глебы здымаюць таўшчынёй не менш як 2 см, дэзынфікуюць градкі і падсыпаюць свежай зямлі.

Сушыце на зіму пятрушку, пастэрнак, сельдэрэй. Адбірайце і закладвайце на захоўванне матачнікі караняплодаў і капусты.

Тэлесеткі

СЕЗОННЫЯ АБНОЎКІ ПЕРШАГА І «ЛАДА»

У кастрычніку тэлеканалы Белтэлерадыёкампаніі адкрываюць новы вяшчальны сезон 2009—2010. Чым абяцаюць парадаваць гледачоў айчынныя тэлевізійнікі? Паводле слоў старшыні БТРК Аляксандра Зімоўскага, на Першым канале ў гэтым сезоне з'явяцца новыя праекты, ужо існыя праграмы абновяць дызайн студый і графічнае афармленне, а «ЛАД» працягне забаўляльна-спартыўны кірунак, які ўдала зарэкамендаваў сябе летась.

ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Праграма «Добрай раніцы, Беларусь!» адкрыецца для інтэрактыўнасці — прамых стасункаў у рэальным часе, і ў гэтым будзе галоўная адметнасць і абнаўленне папулярнай ранішняй праграмы.

Знікне з эфіру інфармацыйна-аналітычная праграма «Панарама тыдня». Замест яе Першы канал прапануе гледачам «У цэнтры ўвагі» з вядучай Вольгай Долгай. А былая вядучая «Панарамы» Вікторыя Сянкевіч прапануе свой новы аўтарскі праект — цыкл праграм, гераінямі якіх стануць жонкі вядомых людзей: палітыкаў, бізнэсменаў і г.д. Жанчыны раскажуць, чаму ахвяравалі сваёй кар'ерай дзеля мужавай, а таксама падзеляцца сваімі меркаваннямі на вострыя тэмы.

Надзённыя пытанні будуць разглядацца ў праектах Агенцтва тэленавінаў «Спецыяльны рэпартаж» і «Актуальнае інтэрв'ю». На тэлеканале «ЛАД» працягне старт, удала ўзяты напрыканцы мінулага сезона, праграма «Рэпарцёр беларускай часінкі» з Алегам Цітковым, якая распавядзе пра новых цікавых герояў — нашых сучаснікаў. Зрэшты, даведацца можна будзе пра навіны не толькі з жыцця суграмадзян — праект «Гараджане», рэалізаваны сумесна з Еўрапейскім вяшчальным саюзам, пакажа цыкл фільмаў пра эмігрантаў у розных краінах, ад людзей з цяжкім лёсам да тых, хто здолеў узняцца па прыступках поспеху.

Гістарычную тэматыку, распачатую папулярным праектам «Жарсць і ўлада», працягне цыкл праграм «Альбарутэнія» — у ім гістарычныя падзеі разглядаюцца і ў агульнасусветным значэнні, і ў сэнсе ўплыву на лёс Беларусі.

КІНО ЎСЯЛЯКАЕ І РОЗНАЕ

У новым сезоне Першы канал пакажа цэлую калекцыю беларускіх дакументальных серыялаў: «Зброя», «Фартыфікацыя», «Гарачыя пункты» і г.д. А вось цыкл гістарычных дакументальных фільмаў на «ЛАДзе» прысвечаны замежжу — дакладней, вядомым асобам, якія пакінулі істотны след у сусветнай гісторыі — брытанскай каралеве Елізавеце II і яе сям'і, «жалезнай лэдзі» Маргарэт Тэтчэр ды іншым.

Што да мастацкага кіно, то «ЛАД» прадэманструе лінейкі любімых савецкіх фільмаў і гумарыстычных сіткомаў, а Першы рыхтуе гучныя кінапрэм'еры і падарункі аматарам серыялаў: новыя сезоны «Доктара Хаўса», «Частак цела», «Герояў».

ЛЬЕЦЦА МУЗЫКА

Атрымае працяг сумесная акцыя ЕВС і Першага канала, якая распачалася паказам найвялікшага ў свеце фестывалю класічнай музыкі «The Last Night of the Proms». Надалей у эфіры Першага меламаны ўбачаць канцэрты Венскага філарманічнага аркестра, а таксама прамую трансляцыю з Віфлеема і Іерусаліма, дзе прагучыць Калядная араторыя Баха.

Прыхільнікам больш лёгкіх музычных жанраў адрасавана навінка — штотыднёвая праграма «Жывы гук». Яе госці — папулярныя артысты — будуць «жыўцом» выконваць па 5 песень і даваць шчырыя адказы на каверзныя пытанні вядучага. Таксама ў абноўленым фармаце выйдзе музычна-забаўляльная праграма «Свая музыка», прысвечаная беларускаму шоу-бізнэсу.

Безумоўна, з нецярпеннем чакаюць многія гледачы і старту другога сезона «Зорных танцаў», дзе галоўныя героі сёлета — 10 жанчын (папулярныя спявачкі, спартсменкі і тэлевядучыя), якія з дапамогай прафесійных танцораў будуць асвойваць няпростыя па.

БЕЗ «ЕЎРАБАЧАННЯ»?

У спрэчцы, які ж тэлеканал будзе займацца падрыхтоўкай да наступнага міжнароднага конкурсу песні «Еўрабачанне», дагэтуль кропка не пастаўлена — хутчэй, вялікі пытальнік. З аднаго боку, нацыянальны адбор і падрыхтоўку ўзяў у свае рукі канал АНТ; але з іншага — ён пакуль не член прафсаюза, у сэнсе, Еўрапейскага вяшчальнага саюза, і пытанне гэта вырашыцца толькі ў снежні, а заяўку на арганізацыю і паказ конкурсу трэба падаваць ужо ў лістападзе... Пакуль што вырашана, што заяўку падасць Белтэлерадыёкампанія, а далей, у залежнасці ад прынятага рашэння, вызначыцца, якая «кнопка» ў Беларусі будзе паказваць і адказваць за конкурс.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

РЭКАНСТРУКТАР ДУХОЎНАЙ СПАДЧЫНЫ

Айцец Аляксандр ЯЦКЕВІЧ служыць у царкве св. Панцеляймона, якая пабудавана на тэрыторыі вайсковай часці спецназа ў Мінску. Але часам прыхаджане не пазнаюць свайго святара: на ім — вайсковая форма XIX стагоддзя, узбраенне. Удзел у ваенна-гістарычнай рэканструкцыі праз пераемнасць традыцыі дапамагае ў пэўнай місіі — апекаваць вайскоўцаў.

— Айцец Аляксандр, чым займаецца клуб, у якім вы ўдзельнічаеце?

— Ваенна-гістарычныя клубы актыўна пачалі з'яўляцца ў сярэдзіне 90-х гадоў, хоць сама ідэя ўзнікла яшчэ раней. Той, у якім я бяру ўдзел, зарэгістраваны як грамадскае аб'яднанне «Ваенна-гістарычны клуб «Бярэзіна—1812». Мы займаемся гісторыяй Беларускага гусарскага палка, які ўдзельнічаў у вайне з Напалеонам. Таму і асноўная тэма рэканструкцыі — гэта вайна 1812 года. Старшыня нашага аб'яднання, Аляксандр Ганчароў, узначальвае спартыўны клуб у Барысаве, дзе і знаходзіцца наш цэнтр. Ён жа трэніруе нас у верхавой яздзе. Сярод удзельнікаў — жыхары Барысава і Мінска. Нас пакуль усяго сем. Але мы адкрыты і хочам пашыраць свой рух.

— Як жа далучыцца да вашага аб'яднання?

— Найперш чалавеку трэба ўніфармавацца, гэта значыць пашыць асабістую форму. Гэта патрабуе немалых затрат. Галоўнае, каб яна цалкам адпавядала адзенню таго падраздзялення, якое выдае клуб. Мы дапаможам, але для гэтага нам карысна не спыняцца і ўсім далей вывучаць гісторыю ваеннага касцюма, якая закранае шмат тэарэтычных пытанняў. Таму ўсебаковая адукаванасць чалавека, які прыходзіць да нас, вельмі паўплывае на гэта.

— А калі чалавек зусім малады, можа, і ў войску яшчэ не служыў?

— Не трэба глядзець на фізічныя дадзеныя чалавека, калі ён хоча спрычыніцца да рэканструкцыі. Нават калі малады чалавек не служыў у арміі — гэта не перашкода. У яго з'явіцца магчымасць і ў страі пастаяць, і даведацца аб воінскай дысцыпліне. Так, большасць удзельнікаў клуба — афіцэры запасу. Але мы таксама наноў вучыліся прыёмам кавалерыстаў. Зладжанасць патрабуе пастаянных трэніровак. А што датычыцца верхавой язды, то гэтаму можна навучыцца. З самага пачатку не атрымлівалася, а цяпер вось ёсць надзейны сябар-конь.

— Не памылюся, калі скажу, што рэканструкцыя — гэта не толькі візуальнае дзеянне?

— Сённяшні чалавек прызвычаіўся да відовішча. Ваенна-гістарычная рэканструкцыя — гэта, можна сказаць, шоу. Але гэта ўсё ж не тэатр, людзі тут сур'ёзна займаюцца гісторыяй. Сцэнарый бою, які рэканструюецца, абавязкова прывязаны да гістарычных сведчанняў. І мы не сядзім склаўшы рукі, а гэтыя сведчанні шукаем. На жаль, палкавая гісторыя сёння падзабытая. У кожным з дванаццаці гусарскіх расійскіх палкоў, а беларускі значыўся пад нумарам «сем», пісалася гісторыя падраздзялення. У кожнага быў свой марш і гімн. На пачатку XX стагоддзя асобнымі кнігамі пачалі выдаваць палкавую гісторыю Расіі. Летась мы адшукалі ў Маскве першы том гісторыі Беларускага гусарскага палка. Высветлілася, што дата яго фарміравання дагэтуль была памылковая. У 1803 годзе ён быў не створаны, а адноўлены, ён існаваў яшчэ пэўны час пры Кацярыне II. Цяпер намагаемся знайсці другі том. Працуем і з архіўнымі дакументамі. Мы плануем стварыць інтэрнэт-сайт, прысвечаны гісторыі палка. Думаю, з цягам часу гэта стане цікава не толькі нам, але і больш шырокаму колу грамадзян.

— Узгадайце апошнюю буйную акцыю, якую здзейсніў клуб.

— Сёлета мы здзейснілі конны паход па маршруце «Бярэзіна — Барадзіно». З сабою мы везлі і паходны храм — палатку, якую спецыяльна пашылі стылізаванай пад тыя часы. Я быў там у якасці палкавога святара, атрымаў на гэта бласлаўленне мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта.

Мы ішлі ўздоўж старой смаленскай дарогі, прыкладна па тых месцах, дзе яна раней праходзіла. Некаторыя яе ўчасткі цяпер цяжка дакладна адшукаць. Пэўную частку маршруту нам давялося з-за гэтага скараціць. Месцамі самых цікавых стаянак на тэрыторыі Расіі сталі Смаленск, Красны, Валуціна гара, дзе ішлі жорсткія баі ў той вайне. З 20 жніўня па 2 верасня мы прайшлі 450 км і апынуліся на Барадзінскім полі. Там бралі ўдзел у самым вялікім на тэрыторыі СНД фестывалі ваенна-гістарычнай рэканструкцыі. Спадзяюся, ідэя паходу не памрэ. Ужо сёння ёсць прапановы падтрымкі з боку БРСМ, расійскія рэканструктары хочуць паўдзельнічаць.

— А ці супрацоўнічаюць беларускія рэканстукцыйныя клубы з замежнымі аднадумцамі?

— На тэрыторыі Заходняй Еўропы ёсць клубы, якія з задавальненнем удзельнічаюць у сумесных мерапрыемствах. І заўсёды, калі з нашага боку з'яўляецца магчымасць іх прыняць, яны прыязджаюць. Для гэтага, натуральна, неабходны ўмовы, камфортныя ў еўрапейскім разуменні. Калі іх атрымліваецца задаволіць, праходзяць сумесныя рэканструкцыі. Беларускія клубы часта выязджаюць за мяжу: у Польшчу, Аўстрыю, Францыю, Германію.

Мы плануем у хуткім часе звярнуцца ў французскае пасольства з тым, каб супрацоўнічаць. Набліжаецца двухсотгоддзе перамогі над Напалеонам, уся Еўропа будзе гэтую дату святкаваць. Было б няправільным, каб у Беларусі ўхіліліся ад гэтага. Тым больш, што асноўныя крывавыя бойкі праходзілі на нашай тэрыторыі. Гэта пасля было Барадзіно. А да таго — Мір, Нясвіж, в. Салтанаўка, Віцебск... Калі ж вораг збягаў — бітва на Бярэзіне.

— Як адбываецца супрацоўніцтва Беларускага гусарскага палка і спецназа?

— Калі ў нашай царкве адзначалі прастольнае свята, 9 жніўня, мае калегі па клубе зладзілі мініяцюрную рэканструкцыю на тэрыторыі вайсковай часці. Умацавалі невялікі палатачны лагер, прысутныя маглі пакатацца на конях. І пасля ўзнікла задума ўніфармаваць некаторых вайскоўцаў спецназа касцюмамі нашага палка. Гэта выглядала б прыгожа, эфектна. Вайсковая часць значна дапамагла нам пры падрыхтоўцы да ўзгаданага паходу. Падтрымка адчуваецца.

— Святар-рэканструктар — гэта даволі незвычайна...

— Ёсць святары, якія падтрымліваюць такі кірунак дзейнасці, як рэканструкцыя. Але ў паходы выязджаць не рызыкуюць. Я пакуль адзін. Хацелася б, каб у кожным палку, як было заведзена раней, служыў свой святар. У мяне ёсць цікавасць і выключна практычная: пакалекі храм, у якім я служу, знаходзіцца на тэрыторыі вайсковай часці, было б карысна пераняць той вопыт духоўнага выхавання воінаў, які быў раней. У XIX стагоддзі веравызнанне было галоўным прынцыпам службы ў войску. Калі чалавек цалкам быў атэістам і не належаў да ніводнай канфесіі, у армію яго не бралі.

Зараз узнікае пытанне, як правільна арганізоўваць духоўнае выхаванне ў вайсковых часцях. Чаму б не прапанаваць тое, што было раней?

Аляксей АЛЯКСАНДРАЎ.
Фота з асабістага архіваа Аляксандра ЯЦКЕВІЧА.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.11	18.46	11.35
Віцебск —	7.02	18.35	11.33
Магілёў —	7.01	18.36	11.35
Гомель —	6.57	18.34	11.37
Брэст —	7.26	19.03	11.37
Гродна —	7.26	19.01	11.35

Месяц

Поўня 4 кастрычніка.
Месяц у сузор'і Рыбаў.

Імяніны

Пр. *Арыядны, Ірыны, Соф'і, Барыса, Івана, Міхаіла, Уладзіміра.*
К. *Тэрэзы, Ігара, Марка.*

Фота Марыны БЕРУНКОВАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра



Дзве даты

1 кастрычніка

1946 год — завершаны Нюрнбергскі працэс над лідарамі фашызму, 12 з якіх былі асуджаны да пакарання смерцю. Нюрнбергскі працэс стаў адказам на небывалыя ў чалавечай гісторыі зверствы фашыстаў, ён стаў важнай вехай у развіцці міжнароднага права. Упершыню да крымінальнай адказнасці былі прыцягнуты афіцыйныя асобы, адказныя за планаванне, падрыхтоўку і развязванне агрэсіўнай вайны.

1908 год — у Дэтройце Генры Форд прадэманстраваў першы аўтамабіль, сабраны паточным метадам («Мадэль Т») — гэта была рэвалюцыя ў машынабудаванні.

Цытата дня:

«Мы па сутнасці вучымся ў тых кніг, пра якія не ў стане выказаць меркаванне. Аўтару ж кнігі, пра якую мы штосьці можам сказаць, варта было б вучыцца ў сваіх чытачоў».
Іаган Вольфганг Гётэ (1749-1832), нямецкі пісьменнік.

Ёсць нагода

Капітан, капітан, усміхніцеся...

Нават калі гэта песенька не пра вас, чаму б не прыслухацца да парады? Тым больш, што сёння — Сусветны дзень усмешкі, які ўжо дзясяты год запар адзначаецца ў першы дзень кастрычніка.

Сваім нараджэннем гэта свята абавязана мастаку Харві Бэлу. У творчасці яго не было нічога звышасаблівага — але менавіта гэты чалавек у 1963 годзе прапанаваў сваім чарговым заказчыкам, буйной страхавой кампаніі, запамінальную візітоўку — жоўты ўсмешлівы тварык. За работу мастак запрасіў паўсотні долараў. Аказалася, пратраціў. Поспех «візітоўкі» пераўзышоў усе чаканні, клиенты кампаніі былі ў захапленні ад навінкі, і зусім хутка мілы тварык засвоіў новыя «тэрыторыі» — футболкі, кепкі, паштоўкі, запалкавыя скрынкі. Нават паштовае ведамства ЗША выпусціла марку з гэтым сімвалам.

«Ніколі яшчэ ў гісторыі мастацтва не было ніводнай работы, якая б распаўсюдзілася так шырока і прынесла столькі шчасця, радасці і задавальнення. Не было нічога, зробленага так проста, але сталага зразумелым для ўсіх», — з гонарам падкрэсліваў мастак у шматлікіх інтэрв'ю. Менавіта ён і прапанаваў адзначаць прысвечаны добраму настрою дзень усмешкі, які праходзіць пад заклікам «Зрабі добрую справу — перадай усмешку ад чалавека да чалавека». Дарэчы, пазней ён заснаваў кампанію «World Smile Corporation», якая і цяпер выкарыстоўвае смайлік як гандлёвую марку, а ўсе прыбыткі ідуць выключна на дабрачынныя мэты.

Так што ўсміхайцеся, спадарства, усміхайцеся! Нездарма ж і класік Оскар Уайльд сцвярджаў: *«Жыццё — занадта сур'ёзная штука, каб успрымаць яго занадта сур'ёзна»*.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА

ПЯЦЬ ХВІЛІН НА РОЗДУМ

Х. Германсон



Белыя: Крe6, Фh2, Лc5, Сb6, Cb7, Кc6, Кe5 (7).
Чорныя: Крe3, Ла2, Лc4, Cd8, п. d2 (5).
Мат за 2 хады.

І. ШЭЛЬ



Белыя: Крc1, Фа2, Лb2, Лd1, Сc3, п. g2 (6).
Чорныя: Крh2, Лc7, Лd8, Са7, Сc8, Кd7, Кh8, пп. b5, c5 (9).
Мат за 3 хады
У першай задачы праходзіць спалучэнне дзвюх тэм Загаруйка і Рухліса, а ў другой створаны цікавыя правільныя маты.
Чакаем вашых адказаў.

К.А. ЗВАРЫКІНАЙ — 90

Споўнілася 90 гадоў Кіры Аляксееўне Зварыкінай (29.09.1919 г.н., Нікалаеў) — міжнароднаму гросмайстру, заслужанаму майстру спорту СССР, міжнароднаму арбітру.

У Беларусі, дзе яна жыла раней, поспеху Кіра Аляксееўна дабівалася ў шматлікіх спаборніцтвах: яна неаднаразовая чэмпіёнка Беларусі, пераможца шахматных Алімпіяд 1957 і 1963 гг., удзельніца многіх міжнародных турніраў і чэмпіянатаў СССР. У 1960 годзе яна згуляла матч на першынство свету.

У Кіры Аляксееўны ёсць ордэн «Знак Пашаны» і медалі, у ліку якіх «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне» і медаль каралевы Нідэрландаў Юліяны. У 1984 годзе мінскім выдавецтвам «Полымя» выпушчана яе кніга «В рядах шахматной гвардии».

Пажадаем Кіры Аляксееўне моцнага здароўя і ўсяго лепшага ў жыцці.

Прыводзім адну яе славутую партыю, згуляную ў 1964 годзе ў Тбілісі.

К. Зварыкіна — А. Бішард

1. e4 e6 2. d4 d5 3. Кc3 Кf6 4. Cg5 Ce7 5. e5 Кfd7 6. C:e7 Ф:e7 7. Кf3 a6 8. Cd3 c5 9. dc Кc6 10. 0-0 Ф:c5 11. Лe1 Фb4 12. a3 Фf4 13. Ke4 Kd:e5 14. Kd6+Kpd7 15. K:e5+K:e5 16. Л:e5 Кр:d6 17. Лe3 Крe7 18. c4 Лd8 19. Фh5 Фd4 20. Лf3 f5 21. Лe1 Крd6 22. cd ed 23. Ф:h7 Ф:b2 24. Фg6+Крc7 25. Фg3+Крc6 26. Лb1 Фf6 27. Cc2 d4 28. Ce4+fe 29. Л:f6+ gf 30. Фg6 Крd5 31. Ф:f6 Ce6 32. Ф:g5+Крc6 33. Лc1+ Крd7 34. Фg7+ Крe8 35. Лc7 Cd7 36. Ф:d4 Лac8 37. Ф:e4+ Крf7 38. Фf4+ і чорныя здаліся.

Падлетку паспяхова выдалілі пухліну плечавой косці

Як расказаў кіраўнік Гарадскога клінічнага цэнтра траўматалогіі і артапедыі Міхаіл Герасіменка, падлетак паступіў у дзіцячае траўматолага-артапедычнае аддзяленне 6-й гарадской клінічнай бальніцы з пераломам пляча. Калі зрабілі рэнтгенаўскі здымак, высветлілася, што прычынай пералому стала дабраякасная пухліна плечавой косці 20-сантыметровай даўжыні.

Падчас аперацыі хірургі выдалілі новаўтварэнне і на гэта месца паставілі касцявы трансплантат. Падлетак адчувае сябе добра. Яго ўжо рыхтуюць да выпіскі. Як адзначыў М. Герасіменка, на працягу пяці гадоў трансплантат урасце і ператворыцца ў касцявую тканку. Пасля чаго нават на рэнтгенаўскім здымку немагчыма будзе адрозніць, дзе родная косць, а дзе «чужая». Рука будзе рухацца, як і раней.

«Гэта аперацыя найвышэйшага ўзроўню складанасці, у нашай клініцы такая праведзена ўпершыню. Адзін-два разы ў год мы выконваем падобныя аператыўныя ўмяшанні, але пухліну такога памеру ніколі не выдалялі», — дадаў суразмоўца.

Вольга ГРЫГОР'ЕВА, «Мінск—Навіны».

ДЗЯВОЧЫ ВЕЧАР

У XIX—XX стст. дзявочы вечар быў адным з галоўных звёнаў вясельнага абраду. У апошні перад вяселлем дзень у хаце нявесты адбываўся абрад пад назвай дзявочы вечар (дзявішнік, дзявічкі, дзявоцкі вечар, зборны дзень, зборава субота, вянкі). У хаце збіраліся сваякі нявесты: маці, бацька, дзядзькі, цёткі, браты, сёстры і іншыя. Сяброўкі спявалі песні, нявесце распускалі касу і вялі ў лазню. Пры гэтым нявеста павінна была плакаць і кланяцца ўсім у ногі, пачынаючы ад самых старэйшых. Нявеста плакала па сваёй «прыгажосці», «касе», «волі», бесклапотным жыцці ў бацькоў. Лічылася, што чым больш слёз пралье дзяўчына ў бацькоўскай хаце, тым меней яна будзе плакаць у сямейным жыцці.

● У лазню пад спеў сябровак нявесту вялі свахі. Лазня мела на мэце рытуальнае ачышчэнне нявесты ад усіх ранейшых бедаў і нястач. Пасля вяртання з лазні ў хаце ладзілі вячэру. За сталом нявеста разам з сяброўкамі спявала песню, каб бацька і маці блаславілі дачку на жыццё-быццё ў «далёкім краі». Бацька бласлаўляў дачку, яна ж павінна была падарыць яму што-небудзь з прыданага. Тая ж песня гучала для бліжэйшых сваякоў. Нявеста і іх адорвала невялікімі падарункамі. Пасля працяглых спеваў нявесту садзілі на лаву і ў апошні раз у бацькоўскім доме ёй запляталі касу пад спеў-галашэнне сябровак.

● Адным са складнікаў этапаў дзявочага вечара было прыгатаванне вянка нявесты, вясельнага дрэўца і знакаў адрознення шафераў — «кветачак». У дзявочы вечар дзяўчаты садзіліся вакол стала і плялі вянок з раней прыгатаваных свежых ці сушаных траў, каляровых стужак, пацерак і іншых упрыгажэнняў. Але перш старшая шаферка тройчы прасіла блаславення ў бацькоў нявесты: «Блаславіце вянкі віці». На працягу ўсёй работы дзяўчаты спявалі песні.

● Яшчэ ў пасляваенны час сваёй неардынарнасцю вылучаўся вянок нявесты, які рабілі ў Верхнядзвінскім раёне. У зялёнае суквецце лекавых траў упляталі чырвоную стужку-абярэг, каля скроневых доляў замацоўвалі выраблёныя з воску вінаградныя гронкі.

● Калі вянок быў зроблены, нявеста падыходзіла да стала, кланялася дзяўчатам у пояс, дарыла ім падарункі. У Маладзечанскім раёне існавала павер'е: калі іголку, якую выкарыстоўвалі пры вырабе вясельнага вянка, кінуць у раку, то тая дзяўчына хутка возьме шлюб.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнемся!

Часопіс моды правёў конкурс сярод мужоў на тэму: «Як ваша жонка павінна апрануцца, калі збіраецца з вамі на прыём або ў тэатр?»

Першае месца заняў знаўца моды за адказ: «І думаць няма чаго, у вас усё напісана!»

Апошняе месца заняў мярзотнік, які адказаў: «ХУТКА!»

☺

— Тата, а перад маім нараджэннем ты каго больш хацеў — хлопчыка або дзяўчынку?

— Наогул, сынок, я проста хацеў прыемна правесці час...

☺

Прадавец «Еўрасеткі» прадаў д'яблу душу. І чахольчык.

☺

— Жонка, трэба было б тэрмінова прыняць антыкрызісныя меры!

— Згодна! Давай, налівай!

☺

Збег сабака, ашыйнік каштуе 300 баксаў. Сволач.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай — 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 32.345. Індэкс 63850. Зак. № 5369. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12